Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

15 САКАВІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 50 (26163)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Канстытуцыі.

Гэта свята мае асаблівае значэнне для нашай суверэннай дзяржавы, для кожнага грамадзяніна.

Прыняцце Асноўнага Закона паклала пачатак пазітыўным працэсам станаўлення і ўмацавання інстытутаў дзяржаўнай улады і грамадства, стала неабходнай умовай для дынамічнага развіцця эканамічнага, сацыяльнага і культурнага патэнцыялу Беларусі.

Канстытуцыяй гарантаваны грамадзянам фундаментальныя правы і свабоды, закладзена трывалая аснова прагрэсіўнай дэмакратычнай нарматворчасці, вызначана, што менавіта народ з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай улады.

Сёння мы цвёрда можам сказаць: Канстытуцыя паказала сваю жыццёвую сілу. Рэспубліка Беларусь упэўнена рухаецца наперад, развіваючы эканоміку і сацыяльную сферу, умацоўваючы свае міжнародныя пазіцыі. У краіне павышаюцца аб'ёмы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, значна паляпшаецца становішча ў адукацыі, ахове здароўя, жыллёвым будаўніцтве, адраджаюцца гарады і вёскі.

Нам трэба яшчэ многае зрабіць для кардынальнага павышэння якасці жыцця людзей і далейшага ўздыму эканомікі. Поспех у вырашэнні гэтых важнейшых задач залежыць ад кожнага з нас, ад нашай працы, дастойнага служэння Айчыне.

Наша сіла — у адзінстве народа і ўлады.

Жадаю ўсім аптымізму, дабра, дабрабыту, здароўя і шчасця.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Па выніках праверак КДК Беларусі ў студзені-лютым у бюджэт паступіла Br42,3 млрд

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 14 сакавіка прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выніках работы КДК за два месяцы гэтага года. Камітэт за гэты перыяд правёў 1,6 тыс. праверак (на 26,7 працэнта менш, чым у студзені-лютым 2007 года). Нягледзячы на скарачэнне колькасці праверачных мерапрыемстваў, у бюджэт паступіла Br42,3 млрд — у два разы больш грашовых сродкаў, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

У ходзе сустрэчы разгледжаны пытанні, звязаныя з выкананнем даручэння Прэзідэнта па кантролі за рэалізацыяй нафтапрадуктаў у краіне. У час праверак на 445 АЗС (65,5 працэнта ад агульнай колькасці) выяўлены адзінкавыя факты неадпаведнасці нормам якасці паліва, якое прадаецца.

Разам з тым Камітэт дзяржкантролю выявіў сур'ёзныя злоўжыванні з боку суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца аптовымі пастаўкамі паліва. Напрыклад, два з такіх суб'ектаў гаспадарання нанеслі ўрон дзяржаве на суму амаль Br40 млрд. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым даручыў узмацніць кантроль за рэалізацыяй нафтапрадуктаў.

Прэзідэнту даложана аб спыненні незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці і вяртанні ў бюджэт падаткаў, утоеных злачынным шляхам. У гэтым годзе фінансавай міліцыяй Камітэта дзяржкантролю спынена незаконная дзейнасць арганізаваных злачынных арганізацый, якія размяшчаліся ў Брэсце, Гомелі, Мінску, Магілёве.

На сустрэчы разглядаліся таксама пытанні імпартазамяшчэння.

Абмеркаваны стан і перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з Кітаем. У 2007 годзе тэмп росту беларуска-кітайскага тавараабароту склаў 140 працэнтаў да 2006 года. У Кітаі пачата зборачная вытворчасць трактароў і заключаны кантракт на пастаўку 320 машынакамплектаў МТЗ-1025 і МТЗ-1221. Прадаўжаюцца перагаворы па вызначэнні ўмоў сумеснай вытворчасці камбайнаў ВА «Гомсельмаш» у Кітаі. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы камітэт пастаянна кантралюе выкананне буйных беларуска-кітайскіх інвестыцыйных праектаў.

У час сустрэчы ўзгоднена пытанне праверкі РУП «Беларусьгандаль» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта па пытаннях імпарту цыгарэт.

КДК мае намер заняцца праверкай выкарыстання бюджэтных і спонсарскіх сродкаў рознымі спартыўнымі аб'яднаннямі і клубамі.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў узмацніць кантроль і спагнанне са службовых асобаў за рэалізацыю прагнозных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, а таксама даў шэраг іншых даручэнняў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

УРАД БЕЛАРУСІ НЕ РАЗГЛЯДАЕ ПЫТАННЕ ПАВЫШЭННЯ ТАРЫФАЎ НА ПАСЛУГІ ЖКГ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Аб гэтым паведаміў журналістам першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка.

«Гэта тэма пакуль што не абмяркоўваецца», — сказаў ён і растлумачыў, што першапачаткова неабходна вырашыць пытанне з цаной на расійскі газ з другога квартала гэтага года.

БЕЛТА.

Сенатары заклікаюць беларускую моладзь распрацоўваць інавацыйныя ідэі на карысць дзяржавы

Сенатары заклікаюць моладзь Беларусі плённа выкарыстоўваць час, паглынаць веды і распрацоўваць інавацыйныя ідэі, каб потым выкарыстоўваць іх на карысць дзяржавы. Такі наказ маладым людзям, якія атрымалі пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, даў старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях верхняй палаты беларускага парламента Анатоль Новікаў. Урачыстая цырымонія ўручэння пашпартоў у рамках акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прымеркаванай да Дня Канстытуцыі краіны, адбылася 14 сакавіка ў Савеце Рэспублікі.

НА ЗДЫМКУ: Вікторыя СТАСЯЛОВІЧ, Кацярына ВАРАНЕНКАВА і Яўген СУРТА атрымалі пашпарты.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

З ПАНЯДЗЕЛКА ЧАКАЕЦЦА КАРОТКАЧАСОВАЕ ПАХАЛАДАННЕ

У выхадныя тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам малярухомага велізарнага Атлантычнага цыклона, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Цыклон прынясе да нас ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу ў суботу і мокрага снегу ў нядзелю. Тэмпература паветра ўначы ў суботу ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, у нядзелю — ад 4 марозу да 2 цяпла. Удзень у выхадныя — 1—7 градусаў цяпла.

У пачатку наступнага тыдня да нас пачне паступаць больш халоднае паветра з боку Скандынавіі, таму 17—18 сакавіка будзе назірацца мокры снег. Тэмпература паветра ўначы ў панядзелак-аўторак ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ў сераду панізіцца да 1—9 марозу; удзень у панядзелак чакаецца ад 0 да 7 цяпла, а 19 сакавіка стане ўжо ад 2 марозу да 3 цяпла. Сіноптыкі разлічваюць, што ўжо з чацвярга да нас вернецца вясна, якая прынясе істотнае пацяпленне.

Сяргей КУРКАЧ.

У ДТЗ ЗАГІНУЛІ РАДАВЫЯ...

У Фаніпалі каля пяці гадзін дня аўтамабіль «БМВ» на хуткасці ўрэзаўся ў дрэва і перакуліўся.

Як высветлілася, за рулём аўто знаходзіўся 19-гадовы мясцовы жыхар. Вадзіцель і яго пасажыр — 22-гадовы мінчанін, абодва, дарэчы, радавыя ўнутранай службы, вадзіцелі аднаго з раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях, загінулі. Акрамя таго, пацярпелі і дзве вучаніцы 10-га класа адной з гімназій, якія таксама знаходзіліся ў салоне «БМВ». Апошнія змешчаны ў бальніцу.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

НЕ РАЗМІНУЎСЯ З... КАЛОДЗЕЖАМ

У катлаван, а таксама калодзеж давялося спускацца ў чацвер выратавальнікам, каб выцягнуць адтуль мужчын, якія трапілі ў гэтыя «пасткі» — адзін зваліўся выпадкова, другі — з п'яных вачэй.

Паводле звестак прэс-сакратара Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслана Габрылёва, каля гадзіны дня ў Светлагорску ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення РАНС патэлефанавалі медыкі, якім паступіла паведамленне аб здарэнні на будаўнічай пляцоўцы: маўляў, на тэрыторыі аб'екта ў адкрытым катлаване знаходзіцца без прытомнасці чалавек.

Як высветлілася крыху пазней, небарака невядома чаго забрыў на агароджаную тэрыторыю, дзе будаваўся прыватны магазін, і з двухметровай вышыні ўпаў на дно катлавана. Ды так няўдала, што атрымаў адкрыты пералом левага сцёгна і знаходзіўся ў шокавым стане. Пацярпелага паднялі наверх на імабілізацыйных насілках і перадалі медыкам.

А праз тры гадзіны ўжо ў Ветцы выратавальнікам давялося тэрмінова выязджаць на выклік з вуліцы Чапаева, дзе на дне закінутага калодзежа «кукаваў» яшчэ адзін няшчасны: гэты мужчына быў моцна п'яны і самастойна выбрацца не мог. П'яным, як вядома, мора па калена — «шчасліўчык» не атрымаў ніякіх бачных пашкоджанняў пасля падзення.

Ігар ГРЫШЫН.

БУДЗЕ ПОМНІК БЛАНДЗІНЦЫ

Першы ў свеце помнік бландзінцы будзе ўстаноўлены ў Калінінградскай вобласці. З гэтай ініцыятывай выступіла рэгіянальнае Таварыства бландзінак, ідэю падтрымала адміністрацыя пасёлка Янтарны, дзе і плануецца ўстанавіць помнік, паведамляюць мясцовыя інфармагенцтвы.

Як лічаць у грамадскай арганізацыі, наспеў час разбурыць старыя стэрэатыпы і даказаць, што бландзінка — сімвал сучаснай жанчыны. Прыгожай і паспяховай.

Гэту думку спрабуюць увасобіць калінінградскія мастакі, якія ўжо падрыхтавалі некалькі эскізаў помніка, у тым ліку з выявай бландзінкі ў вобразе Папялушкі, Царэўны-лебедзя.

БЕЛТА.

СВЯТА КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

Сёння беларусы адзначаюць Дзень Канстытуцыі

Кропкай адліку стала 15 сакавіка 1994 года, калі парламент нашай дзяржавы прыняў першую Канстытуцыю незалежнай Беларусі. Гэта падзея стала вызначальнай для ўсёй беларускай гісторыі — краіна атрымала Канстытуцыю сучаснага тыпу, у якой былі замацаваны ўсе найважнейшыя правы асобы ў адпаведнасці з міжнародна-прававымі стандартамі. Агульнапрызнаныя ў цывілізаваным свеце дэмакратычныя прынцыпы больш не былі далёкімі для Беларусі, яны сталі тым фундаментам, на якім пачала адбудоўвацца дэмакратычная, прававая, сацыяльная дзяржава.

Сама ж гісторыя беларускага канстытуцыяналізму бярэ пачатак яшчэ ад Статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гадоў. Яны ўтрымлівалі шэраг нормаў, што вызначалі функцыянаванне пэўных канстытуцыйна-прававых інстытутаў. Зафіксаваныя там прававыя прынцыпы былі рэвалюцыйнымі для свайго часу. Тады ўпершыню на тэрыторыі Усходняй Еўропы канадаўча замацоўваліся такія звыклыя для нас сёння роўнасць усіх людзей перад законам незалежна ад іх саслоўнай прыналежнасці і маёмаснага стану, абавязак дзяржаўных службовых асобаў дзейнічаць выключна ў межах закона, права кожнага чалавека на валоданне і свабоднае распараджэнне маёмасцю, на ахову жыцця і гонару, на судовую абарону, недатыкальнасць асобы і шмат чаго іншага. Канстытуцыйнае права Беларусі XVI стагоддзя па многіх пазіцыях апярэдзіла свой час і было ўзорам для ўсёй тагачаснай Еўропы.

Нельга недаацэньваць і Канстытуцыі Савецкай Беларусі 1919, 1927, 1937, 1978 гадоў. Яны ўсталявалі, хоць і ў абмежаваным выглядзе, беларускую дзяржаўнасць, вызначылі дзейсную сістэму кіруючых органаў, замацавалі на канстытуцыйным узроўні шырокае кола сацыяльных правоў асобы, юрыдычна захавалі этнакультурную самабытнасць беларусаў, наогул падрыхтавалі прававую глебу для самавызначэння беларускага народа ў незалежнай дзяржаве.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ВЯДЗЕЦЦА РАБОТА ПА БЛАКІРАВАННІ САЙТАЎ ТЭРАРЫСТЫЧНАГА ЗМЕСТУ

Беларускія праваахоўныя органы вядуць работу па абмежаванні доступу да інтэрнэт-сайтаў тэрарыстычнага зместу, заявіў намеснік начальніка антытэрарыстычнага цэнтра КДБ Беларусі Вячаслаў Ліненка на прэс-канферэнцыі. «У Інтэрнэце ёсць многа лішняй інфармацыі, якая не павінна быць шырока даступнай»,— адзначыў Вячаслаў Ліненка. Пры гэтым ён не ўдакладніў, колькі сайтаў ужо заблакіравана.

БЕЛТА.

СВЯТАРЫ НА ДАРОГАХ

А калі дакладней, дык на скрыжаваннях некаторых вуліц горада Гомеля і аўтамагістралях, дзе часцей, чым у іншых месцах, адбываюцца дарожна-транспартныя здарэнні са смяротным зыходам. Тым самым яны па просьбе дзяржаўтаінспекцыі вырашылі паўдзельнічаць у барацьбе за бяспеку руху, прагнаць «нячыстую сілу». Такім чынам, настаяцель гомельскага храма Святога архістратыга Міхаіла протаіерэй Андрэй Бялянка асвяціў ужо тры скрыжаванні вуліц у горадзе. Але гэта толькі пачатак.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Будаўніцтва новага авіярамонтнага завода і аб'ектаў «Мінск-Сіці» пачнецца ў верасні 2008 года

Адпаведнае рашэнне было прынята 14 сакавіка па выніках даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку аб вынасе за межы Мінска авіярамонтнага завода і будаўніцтве новых аб'ектаў авіяцыі.

На мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі групы кампаній «ІТЭРА», якая выступае партнёрам беларускага боку ў рэалізацыі адпаведных інвестыцыйных праектаў.

Раней, на нарадзе 30 кастрычніка 2007 года, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу паскорыць стварэнне дзелавога цэнтра «Мінск-Сіці». Тады Прэзідэнт даў даручэнне да 1 студзеня 2010 года завяршыць усе работы па пераносе Мінскага авіярамонтнага завода, з тым каб ужо ў 2010 годзе разгарнуць шырокамаштабную забудову адпаведнай сталічнай тэрыторыі. На плошчы 330 га плануецца ўзвесці ўнікальны гарадскі раён, дзе будуць пабудаваны больш за 1,5 млн кв. м камфартабельнага жылля і аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, размесяцца офісы соцень кампаній. Гэта таксама буйны сацыяльны праект, які дасць магчымасць стварыць, паводле папярэдніх разлікаў, больш за 55 тыс. новых рабочых месцаў.

Асноўным падрадчыкам будаўніцтва выступіць расійская група кампаній «ІТЭРА», плануецца прыцягнуць і некалькіх субінвестараў. Аб'ём інвестыцый у будаўніцтва дзелавога цэнтра «Мінск-Сіці» ацэньваецца ў $7 млрд. На стварэнне гэтага ўнікальнага комплексу адведзена не больш за 10 гадоў, аднак асобныя аб'екты будуць здавацца ў эксплуатацыю раней.

У час даклада 14 сакавіка былі прааналізаваны папярэднія вынікі праведзенай работы і прыняты рашэнні аб далейшых дзеяннях на бліжэйшую перспектыву. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе работы — ад праекціровачных да будаўнічых — «павінны весціся аператыўна і без разварушвання».

Вынас за межы беларускай сталіцы авіярамонтнага завода з'яўляецца ключавой умовай рэалізацыі праекта «Мінск-Сіці».

«Тэрміны выканання гэтага праекта ўстаноўлены. Трэба пачынаць канкрэтныя дзеянні», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Прэзідэнт асабліва адзначыў: размова ідзе не аб простым пераносе аб'ектаў з аднаго месца на іншае, а аб стварэнні новага сучаснага прадпрыемства.

«Нам не патрэбны авіярамонтны завод у тым выглядзе, у якім ён знаходзіцца цяпер. Гэта мінулае стагоддзе. Калі нешта і пакідаць, то толькі невялікі працэнт. Неабходна выходзіць на больш дасканалы ўзровень — і рамантаваць, і тэхнічна абслугоўваць, а ў будучым, магчыма, і вырабляць дэталі для перспектыўных самалётаў, як расійскіх, так і замежных», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы асабліва ўказаў на важнасць захавання кваліфікаванага інжынерна-тэхнічнага персаналу існуючага завода, падрыхтоўкі людзей да работы ў новых умовах, стварэння неабходнай жылой інфраструктуры.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

белагропромбанк
традиции будущего

ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2007»

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ ПОВЕСТКИ ДНЯ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ БАНКА.

В повестку дня годового общего собрания акционеров банка, опубликованную в газете «Звязда» 22 февраля 2008 года № 35 (26148), включен дополнительный вопрос:

7. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Общественному объединению «Белорусская теннисная ассоциация» и Управлению образования администрации Московского района г. Минска.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 218 56 12.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА

Тел.: короткий номер 136
(звонок бесплатный на территории РБ),
(017) 218 57 77, 8 029 1 985 777 (Velcom), 8 025 9 185 777 (БеСТ), 8 029 8 885 777 (МТС).

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.

ДРУКАВАНЫЯ І ІНТЭРНЭТ-СМІ: ДЫЯЛОГ АБО КАНФЛІКТ?

Сучасныя тэхналогіі імкліва развіваюцца, і Інтэрнэт, як неад'емная частка рэчаіснасці, трывала ўвайшоў у будзённае жыццё. Пытанне аб развіцці інтэрнэт-СМІ і перспектывах друкаваных сродкаў масавай інфармацыі застаецца адкрытым. Адны сцвярджаюць, што ў недалёкай будучыні папяровыя газеты і часопісы знікнуць як такія, саступіўшы месца электронным версіям. Іншыя прытрымліваюцца думкі, што, часова здаўшы пазіцыі, друкаваныя СМІ ўсё ж будуць мець сваю нішу. Як некалі здарылася з кіно, якое ў час буму CD і DVD дыскаў глядзелі на дамашніх камп'ютарах, а цяпер колькасць тых, хто аддае перавагу вялікім кіназалам, пастаянна расце. Як здарылася з кнігамі, якія не сталі чытаць менш, хоць у сусветнай павуціне мастацкай літаратуры багата.

Ці існуе канфлікт друкаваных і інтэрнэт-СМІ ў Беларусі? Якія перспектывы развіцця электронных сродкаў масавай інфармацыі ў рэспубліцы? Якая будучыня спадарожнікавага і лічбавага тэлебачання? На гэтыя і іншыя пытанні ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА адказаў міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ.

— Уладзімір Васільевіч, вядома, што ў Беларусі міжведамасная рэспубліканская рабочая група па вывучэнні вопыту краін СНД і Еўропы ў пытанні прававога рэгулявання дзейнасці інтэрнэт-СМІ прадставіла свае прапановы па праекту дакумента аб Інтэрнэце.

— Такая група ў складзе прадстаўнікоў 15 ведамстваў, у тым ліку міністэрстваў інфармацыі, сувязі і інфарматызацыі, юстыцыі, замежных спраў, унутраных спраў, Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Белдзяржуніверсітэта і іншых, скрупулёзна вывучыла сусветныя напрацоўкі па рэгуляванні дзейнасці інтэрнэт-выданняў з мэтай стварэння ў рэспубліцы нарматыўнай базы ў гэтай галіне. Бо да гэтага часу ў Беларусі дзейнасць Інтэрнэта ніяк не рэгулюецца. Вынікам работы з'явіўся праект указа, які сёння прадстаўлены ва ўсе зацікаўленыя ведамствы. Магчыма, гэта будзе іншы нарматыўны акт, гэта пытанне яшчэ абмяркоўваецца. Што сабой уяўляе рэгуляванне? Было б наіўна спрабаваць накінуць аброць на сусветную павуціну. Размова не ідзе аб увядзенні кантролю, цэнзуры. Дакумент замацоўвае заяўны прынцып рэгістрацыі інтэрнэт-выдання, будзе гэта сайт газеты, часопіса ці іншы інфармацыйны рэсурс, які выконвае ролю сродку масавай інфармацыі. Гэта не датычыцца інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў або сайтаў, якія распаўсюджваюць інфармацыю аб таварах. Тым самым рэгуляванне заключаецца ў рэгістрацыі сеткавага рэсурсу як самастойнага СМІ, якое мае такія ж правы, як друкаваныя СМІ і тэлебачанне. У выніку будзе вырашана пытанне аб адказнасці, праблема захавання аўтарскіх правоў у інтэрнэт-выданнях. Сёння за размяшчэнне інфармацыі без спасылкі на крыніцу, папросту кажучы крадзеж, нельга прыцягнуць да адказнасці, паколькі ў заканадаўстве няма паняцця «інтэрнэт-СМІ». Заяўны прынцып рэгістрацыі — наш першы крок. З развіццём у свеце прававых палажэнняў будзе карэкціравацца заканадаўчая база ў гэтай галіне.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

— У свеце існуе практыка стварэння парталаў, інакш кажучы, адзіных крыніц, куды інфармацыю пастаўляюць усе СМІ краіны. Ці абмяркоўваецца ідэя арганізацыі дзяржаўнага партала ў Беларусі?

— Тэма стварэння аб'яднаннай крыніцы інфармацыі, куды б пастаўлялі свае матэрыялы практычна ўсе сродкі масавай інфармацыі Беларусі, абмяркоўвалася ўжо не адзін раз. Мне здаецца, што гэта ідэя, калі разглядаць яе з пункту гледжання пастаўкі інфармацыі асобным спажыўцам, мае права на існаванне. Аднак з пункту гледжання развіцця сродкаў масавай інфармацыі, думаю, гэта не пойдзе ім на карысць. Існуе апасенне, што са з'яўленнем адзінага партала асобна ўзятае выданне страціць аўдыторыю чытачоў. Аднак ёсць і адваротны бок медаля. Спасылка на інтэрнэт-рэсурс у матэрыяле, які зацікавіць наведвальніка, накіруе яго да першакрыніцы, чым створыць яму дадатковую рэкламу. Існаванне магутнага разнапланавага рэсурсу сфарміруе пэўныя патрабаванні да якасці публікуемых матэрыялаў, а значыць, будзе стымуляваць развіццё СМІ. Прапанова аб стварэнні партала выказвалася аўтарытэтнымі прадстаўнікамі інфармацыйнага поля, таму неабходна прыслухацца, вывучыць пытанне, узважыць усе за і супраць. Інтэрнэт мае вялікую перспектыву, і мы не будзем стаяць убаку ад сусветных працэсаў. Трэба шукаць шляхі павышэння эфектыўнасці выкарыстання Інтэрнэта ў інтарэсах дзяржавы.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.03.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 146,00
1 еўра	3 342,93
1 латвійскі лат	4 796,60
1 літоўскі літ	968,21
1 чэшская крона	133,09
1 польскі злоты	945,40
1 расійскі рубель	90,74
1 украінская грыўня	428,13

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,6490
10 UAH	46,4553
1000 BYR	11,0104
EUR	36,8995

Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.03.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Менавіта так называецца традыцыйны веснавы абрад у першы дзень Вялікага праваслаўнага посту, які бытаваў у вёсках Ніжні і Верхні Церабяжоў Столінскага раёна. У гэты дзень групы жанчын наведвалі хаты, у якіх падраслі дзяўчаты «на выданне». Сустракалі іх посным сталом і кубкам.

Прыгубляючы (кубак ішоў па крузе толькі адзін раз), маладзіцы і яе бацькам жадалі хутчэй прычакаць сватоў. А яшчэ прыгубленне з кубка сімвалізавала паласканне (ачышчэнне) перад доўгім і выпрабавальным посным тэрмінам.

Удзельніцы мастацкай самадзейнасці Ніжняга Церабяжова спрабуюць «ажывіць» яшчэ не забытую традыцыю «Паласказуба» і сабраліся ў адным з дамоў вёскі *(на фотаздымку)*. Ці падтрымаюць іншыя аднавяскоўцы гэтае вяртанне да самабытных вытокаў?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СВЯТА КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сучасная Канстытуцыя працягвае дэмакратычныя традыцыі беларускага канстытуцыяналізму. Артыкул другі Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь утрымлівае базавую норму, якую можна назваць своеасаблівым дэвізам нашай краіны: «Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы». Гэтае праграмнае палажэнне развіваецца ў раздзеле другім Канстытуцыі «Асоба, грамадства, дзяржава». Прыярытэты вызначаны менавіта так: спачатку — чалавек, потым — грамадства і толькі пасля — дзяржава. З гэтага вынікае падпарадкавальная сутнасць дзяржавы: дзяржава — для чалавека, а не наадварот. Паводле распрацаванасці статусу асобы наш Асноўны Закон — адзін з найбольш дасканалых у свеце.

Яшчэ адна важная рыса беларускай Канстытуцыі — яе непасрэднае дзеянне: усе без выключэння судовыя інстанцыі, дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны выкарыстоўваць нормы Канстытуцыі пры рэгуляванні грамадскіх адносінаў. Ніхто не можа адмовіць грамадзяніну ў абароне яго канстытуцыйных правоў, спаслаўшыся на адсутнасць працэсуальнага механізму іх рэалізацыі. Аднак для дзейснай абароны правоў асобы недастаткова іх юрыдычнага замацавання нават у найвышэйшым законе. Каб у поўнай меры карыстацца сваімі канстытуцыйнымі правамі і свабодамі, неабходна іх добра ведаць. Невыпадкова наш славуты продак Леў Сапега — дзяржаўны дзеяч і найвыдатнейшы юрыст — у прадмове да Статута 1588 г. пісаў: «...кожны жыхар заслугоўвае ганьбавання, каторы свабодай выхваляецца, а правоў умець і разумець не хоча...». Толькі дасканалае веданне сваіх канстытуцыйных правоў надае кожнаму чалавеку годнасць паўнавартаснага грамадзяніна краіны, а не статус звычайнага жыхара пэўнай тэрыторыі. Праз асэнсаванне Канстытуцыі здзяйсняецца самаідэнтыфікацыя чалавека як актыўнага носьбіта сваіх правоў, як суб'екта грамадзянскай супольнасці. Менавіта таму Дзень Канстытуцыі павінен стаць святам кожнага грамадзяніна краіны.

Беларуская Канстытуцыя распрацавана на перспектыву: у ёй закладзены вялікі патэнцыял для развіцця і паглыблення правоў асобы, дэмакратычных прынцыпаў функцыянавання дзяржаўных органаў.

Орган канстытуцыйнага правасуддзя краіны — Канстытуцыйны Суд — равеснік Канстытуцыі. Сёлета ён таксама адзначае сваю чатырнаццатую гадавіну. За невялікі ў гістарычнай перспектыве тэрмін прайшло станаўленне інстытута канстытуцыйнага кантролю нашай краіны, былі выпрацаваны строгія працэдурныя формы ажыццяўлення канстытуцыйнай юстыцыі.

Дзень Канстытуцыі орган канстытуцыйнага правасуддзя Беларусі адзначае ў адноўленым складзе: на вернасць Асноўнаму Закону літаральна нядаўна прысягнулі новыя старшыня і пяцёра суддзяў. Судзейскі корпус і спецыялісты органа канстытуцыйнага правасуддзя заўсёды адпавядалі найвышэйшаму прафесійнаму ўзроўню, і ёсць усе падставы меркаваць, што і надалей Канстытуцыйны Суд будзе стаяць на варце канстытуцыйнага ладу, вяршэнства Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

З нагоды Дня Канстытуцыі судзейскі склад, увесь працоўны калектыў Канстытуцыйнага Суда віншуе чытачоў «Звязды», усіх грамадзян нашай краіны са святам і жадае шчасця і дабрабыту. Няхай у кожнага з нас не будзе жыццёвых падстаў звяртацца ў дзяржаўныя органы па абарону сваіх канстытуцыйных правоў.

Сяргей ЧЫГРЫНАЎ,
суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Будаўніцтва новага авіярамонтнага завода і аб'ектаў «Мінск-Сіці» пачнецца ў верасні 2008 года

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як было адзначана ў час дакладу, на гэтым этапе ўжо створана кіруючая кампанія, якая будзе займацца ўсімі асноўнымі пытаннямі па «Мінск-Сіці».

Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Міхаіл Паўлаў далажыў аб тым, што ўсе арганізацыйныя пытанні вырашаюцца ў тэрмін. У красавіку завершыцца дэталёвае планаванне «Мінск-Сіці» і пачнецца непасрэднае праектаванне яго аб'ектаў.

Міхаіл Паўлаў таксама праінфармаў аб тым, што работа па асобных аб'ектах у месцы ўзвядзення «Мінск-Сіці», перш за ўсё, на мяжы і ў цэнтры адводзімай тэрыторыі, пачнецца ўжо ў гэтым годзе.

«Калі тэмпы фінансавання будуць нармальныя — а ў нас салідныя ўдзельнікі праекта — мы нават зможам паскорыць рэалізацыю нашых планаў», — лічыць мэр сталіцы.

Дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Вадзім Мельнік запэўніў Прэзідэнта ў тым, што інтарэсы работнікаў старога авіярамонтнага завода будуць захаваны. Дарэчы, ужо амаль 800 спецыялістаў выказалі жаданне працаўладкавацца на новым прадпрыемстве. Пераважная большасць з іх — моладзь ва ўзросце 35—37 гадоў. Ён таксама папрасіў падтрымаць планы па развіцці пасёлка Сокал (Мінскі раён), дзе будуць жыць работнікі новага авіярамонтнага завода.

Старшыня Савета дырэктараў «ІТЭРА» Ігар Макараў пазітыўна ацаніў узровень супрацоўніцтва з беларускім бокам, адзначыўшы ў тым ліку высокія прафесійныя якасці беларускіх партнёраў. «Нас усё задавальняе. Усе работы ідуць дакладна ў тэрмін», — падкрэсліў ён.

«ІТЭРА», са свайго боку, у красавіку гатова прадставіць канчатковы спіс фінансавых інстытутаў, якія жадаюць прыняць удзел у праекце. Як было падкрэслена, сярод тых, хто выказвае цікавасць, — не толькі расійскія, але і буйныя еўрапейскія банкі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе работы павінны весціся без затрымкі. Вынас авіязавода, на думку кіраўніка дзяржавы, на цяперашнім этапе не перашкаджае праекціровачным работам.

Прэзідэнт у час абмеркавання асабліва падкрэсліў: у Беларусі, якая мае выгаднае геаграфічнае становішча, ёсць усе неабходныя ўмовы для развіцця новага перспектыўнага напрамку — бізнэс-авіяцыі, што ў тым ліку ўключае стварэнне пунктаў захоўвання авіяцыйнай тэхнікі.

«Такія напрамкі ў свеце вядомы, і Мінск, як горад, што знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, — вельмі выгаднае месца для развіцця бізнэс-авіяцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Ігара Макарава і іншых расійскіх экспертаў, у Беларусі для гэтага ёсць вельмі добрыя рэсурсы і стартавыя магчымасці.

У планах па развіцці Нацыянальнага аэрапорта Мінск — будаўніцтва з часам другой узлётна-пасадачнай паласы і буйнога лагістычнага цэнтра. Прэзідэнт засяродзіў асаблівую ўвагу на неабходнасці навядзення ідэальнага парадку і добраўпарадкавання тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта Мінск.

Кіраўнік дзяржавы таксама аддаў распараджэнні па развіцці сацыяльнай інфраструктуры бліжэйшых населеных пунктаў: для спецыялістаў, якія жадаюць працаваць на новым авіярамонтным заводзе, павінны быць створаны неабходныя бытавыя ўмовы, а таксама забяспечана дастойная аплата працы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе пытанні, звязаныя з рэалізацыяй планаў па будаўніцтве новых аб'ектаў авіяцыі і шматфункцыянальнага цэнтра «Мінск-Сіці», будуць знаходзіцца пад яго кантролем.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Гаспадаркі Беларусі пачалі веснавыя палявыя работы

Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рыгор Раманюк.

Першымі сяўбу ранніх яравых пачалі сельгасарганізацыі Брэсцкай, Гомельскай і асобных раёнаў Мінскай вобласці. Сеюць пакуль што толькі авёс, таму што гэта холадаўстойлівая ранняя культура. Улічваючы прагнозы сіноптыкаў аб халадах, сяўба яравых не мае масавага характару.

ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «СЕЙСМОТЕХНИКА» ЗА 2007 ГОД

№ строки	Наименование показателей	Единица измерения	С начала года
1.	Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	миллионов рублей	18 433
2.	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	миллионов рублей	14 563
2.1.	из них — на оплату труда	миллионов рублей	3 524
3.	Прибыль (убыток) за отчетный период, всего	миллионов рублей	1 095
	в том числе:		
3.1.	прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	миллионов рублей	1 939
3.2.	прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	миллионов рублей	-139
3.3.	прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	миллионов рублей	-705
4.	Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	миллионов рублей	600
5.	Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	23
6.	Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	481
7.	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	миллионов рублей	707
8.	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	21
9.	Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде	рублей	6,53
10.	Количество акционеров, всего	лиц	168
	в том числе:		
10.1.	юридических лиц	лиц	1
10.2.	физических лиц	лиц	167
11.	Среднесписочная численность работающих	человек	415
12.	Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. рублей	6,3
13.	Стоимость чистых активов	миллионов рублей	20 195

Скарачэнне працягласці водпускаў у педагогаў: эканомія ці памылка?

Інтэрв'ю з лістом у руках

Днямі ў рэдакцыю прыйшоў ліст наступнага зместу:

«Звяртаюцца да вас педагогі дзіцячых дашкольных устаноў горада Гомеля. Працуючы ў дзіцячых садках, мы заўсёды імкнуліся, каб дзеці, якіх нам даверылі бацькі, перш за ўсё раслі здаровымі, разумнымі і добра выхаванымі. Вялізная работа заўсёды праводзілася і па падрыхтоўцы дзяцей да школы. Акрамя таго, мы загружаныя яшчэ і «папяровай», нікому не патрэбнай работай, прычым настолькі, што часта нават забываем, хто мы — выхавальнікі ці сакратары?! І за ўсё гэта атрымліваем ганебную (так лічым не толькі мы, але бацькі нашых выхаванцаў), заработную плату: памочнік выхавальніка — максімум 220 тысяч рублёў на рукі, а выхавальнікі — ад 290 да 350 тысяч рублёў...

Дзеці — гэта вялікая адказнасць. Таму мы ніколі не дапускалі думкі, што акрамя нізкіх заробкаў нас аддзячаць яшчэ і скарачэннем працоўнага водпуску. Раней адміністрацыя дзяліла нашы водпускі на дзве часткі, і не цікавілася асабліва нашым жаданнем. Некаторыя выхавальнікі вымушаны былі браць за водпуск грашовую кампенсацыю зусім не па той прычыне, што на рабоце яны «адпачываюць», як мяркуюць некаторыя, а проста таму, што вельмі патрэбныя грошы. Нашы заробкі зусім не адпавядаюць цэнам на рынках і ў магазінах.

Асобная тэма — рамонты, што праводзяцца ў дзіцячых садках. Не варта забывацца, што канікулаў у дашкольных установах няма. Таму на плечы выхавальнікаў і памочнікаў выхавальнікаў кладуцца адначасова і дзеці, і рамонтныя работы. Бацькі збіраюць грошы, наймаюць будаўнікоў... Абурэнняў — мноства, адным словам, не работа, а матанне нерваў. Мы самі капаем, займаемся пасадкамі, праполкай, паліваем, фарбуем, падмятаем, ачышчаем тэрыторыю ад снегу і г.д.

Загадчыкі папракаюць нас у тым, што мы не вядзём платныя гурткі. Але, прабачце, як пры 36-гадзінным працоўным тыдні можна яшчэ і весці гурток? Мы фізічна не можам гэта зрабіць, паколькі даводзіцца працаваць па дзве змены, што недапушчальна ў рабоце з дзецьмі. Але мы вымушаны так працаваць, каб выпрацаваць гадзіны на стаўку, гэта значыць, што з чатырох тыдняў месяца два тыдні штодня мы працуем па 10,5 гадзіны. А калі выказваем свайму кіраўніцтву незадаволенасць, чуем кароткі адказ: «Калі не падабаецца, то звальняйцеся», ці ўвогуле пагражаюць скасаваннем кантракта.

Вось нас і цікавіць, а хто ж прыйдзе на наша месца? Моладзь за такія грошы катэгарычна не хоча працаваць. Маладыя людзі шукаюць больш спакойныя і добра аплатныя месцы, таму ў дзіцячых садках і цякучасць кадраў. У які дзіцячы садок і да каго мы павядзём сваіх унукаў? Гэта, паверце, немалаважна. Крыўдна, што ў СМІ нідзе не прагучала інфармацыя аб змяненнях, якія закранулі педагогаў-дашкольных устаноў. Чаму было прынята такое рашэнне аб скарачэнні водпускаў? І якія ў нас надалей перспектывы? Магчыма, і нам, людзям перадпенсійнага ўзросту, трэба, як і моладзі, шукаць іншую работу? Між іншым, большасць з нас адпрацавалі з дзецьмі па 25 гадоў, аддалі ім сваю душу, свае веды і сваё здароўе. Раней казалі: «Усё лепшае — дзецям». Ці гэта фраза страціла ўжо сваю актуальнасць?»

Прызнаемся, што пытанні, узнятыя ў гэтым лісце, зусім не паўставалі перад намі рытарычнымі. Аб трывожнай сітуацыі, што склалася з кадрамі ў сталічных дашкольных установах, гаварылася таксама і на адной з апошніх калегій Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. Так, на пачатак лютага там не хапала 348 выхавальнікаў і больш за 500 памочнікаў выхавальнікаў. А ці можна сур'ёзна разважаць аб якасці дашкольнай адукацыі пры такой колькасці вакансій? Сітуацыю са скарачэннем працягласці водпускаў у педагогаў-дашкольных устаноў мы папрасілі пракаментаваць **намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рамана ДАПІРУ**:

— З праблемай скарачэння водпускаў мы сутыкнуліся ў сувязі з уступленнем у сілу новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса. Калі раней пералік прафесій і пасадаў работнікаў сістэмы адукацыі, для якіх прадугледжваўся асноўны падоўжаны водпуск, зацвярджаўся Міністэрствам адукацыі, то цяпер гэта права дадзена Савету Міністраў па ўзгадненні з Прэзідэнтам. Адразу заўважу, што кола незадаволеных зацверджаным урадам пералікам, не абмяжоўваецца толькі педагагічнымі работнікамі дашкольных устаноў. Мне вельмі сумна канстатаваць, што праект вельмі важнага дакумента, які закранае інтарэсы тысяч людзей, не палічылі неабходным узгадніць з прафсаюзнай арганізацыяй, якая прадстаўляе інтарэсы больш чым 400 тысяч работнікаў адукацыйнай галіны. Адзін з першых варыянтаў гэтага дакумента трапіў да нас... з Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Нам адразу кінулася ў вочы адсутнасць у праекце пераліку такіх катэгорый, як работнікі ўстаноў, што забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў, а таксама педагогаў пазашкольнай сістэмы выхавання. Акрамя таго, ўсе метадысты ставіліся ў адну лінейку, незалежна ад тыпу ўстановы, у якой яны працуюць, і рэжыму іх працы. Таму мы папрасілі старшыню Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леаніда Козіка звярнуцца ў Савет Міністраў з нашымі заўвагамі і прапановамі па дадзеным праекце. На жаль, названыя катэгорыі работнікаў галіны засталіся з мінімальнай працягласцю водпуску. Але ў канчатковым варыянце скарачэнне водпускаў з 42 да 30 дзён закранула і педагогаў-дашкольных устаноў . Хачу вас запэўніць, што аб гэтым мы даведаліся ўжо, так бы мовіць, постфактум.

15 студзеня Цэнтральны камітэт Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі накіраваў ва ўрад свой зварот з просьбай вярнуцца да разгляду пытання захавання працягласці водпускаў работнікам адукацыі. Мы папярэджвалі, што нізкая эканамічная эфектыўнасць ад скарачэння працягласці водпускаў работнікам адукацыі будзе несупастаўная з сацыяльнай напружанасцю ў арганізацыях нашай галіны, і не памыліліся. Калі доўгачаканы пералік, нарэшце, быў агучаны, у арганізацыях адукацыі гэты дакумент быў сустрэты, мякка кажучы, з непаразуменнем. Працоўныя водпускі скарачаліся не на 2—3 дні, а ў некаторых выпадках нават больш чым напалову. Прафсаюзныя пярвічныя арганізацыі проста не маглі ніяк на гэта не рэагаваць, таму і распачалася падрыхтоўка калектыўных лістоў, якія пайшлі ва ўсе адрасаты: і ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, і ў Міністэрства фінансаў, і ў Міністэрства адукацыі, і ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі і галіновы прафсаюз. Калі пад калектыўным зваротам падпісваюцца практычна ўсе работнікі, гэта ўжо нельга назваць «бунтам на кухні». На мой погляд, гэта больш чым красамоўна сведчыць аб тым, што прынятае рашэнне не было да канца добра прадуманым, а таму яно і незразумелае для многіх педагогаў. Адным словам, неабходнасць карэкціроўкі дадзенага дакумента больш чым відавочная.

— А на чым грунтуецца ваша ўпэўненасць, што працягласць водпускаў можа быць перагледжана ў бок іх павелічэння?

— Давайце проста разам паразважаем над гэтай сітуацыяй. Мы спрабавалі зразумець логіку стваральнікаў пераліку, і, мяркую, што нам гэта ўдалося. У тых установах адукацыі, дзе ёсць летнія канікулы, ранейшая працягласць водпускаў была захаваная. Скарачэнне закранула дашкольныя ўстановы, установы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, а таксама пазашкольныя ўстановы. Але давайце разбірацца. У дашкольных установах бацькі імкнуцца забіраць сваіх дзяцей на летнія месяцы, таму дашкольныя ўстановы працуюць не на поўную нагрузку. І калі раней выхавальнікі на гэты час проста ішлі ў свой чарговы водпуск, то будучым летам можа паўстаць пытанне аб прымусовых водпусках на летні перыяд. Але хачу папярэдзіць, што прафсаюз адназначна будзе трактаваць гэту сітуацыю як прастой не па віне работніка.

Калі гаварыць аб сістэме павышэння кваліфікацыі, то хто, скажыце, з педагогаў летам заклапочаны павышэннем сваёй кваліфікацыі, калі ўсе знаходзяцца або ў водпусках, або занятыя ў прыёмных камісіях. Тая ж сітуацыя і з пазашкольнай сістэмай выхавання. Калі бацькі хочуць заняць вольны час сваіх дзяцей, то для гэтага існуе сістэма школьных і аздараўленчых лагераў.

Трывога вашых чытачоў абсалютная зразумелая. Сацыяльны статус работнікаў дашкольнай адукацыі і раней быў зусім невысокі. Прычыны гэтага хаваюцца ў вельмі нізкай заработнай плаце (ад 290 да 350 тысяч рублёў), вялікай педагагічнай нагрузцы і адсутнасці іншых матэрыяльных стымулаў. Плюс нельга скідваць з рахункаў і прысутнасць шэрагу прафесійных стрэсавых фактараў (адказнасць за жыццё і здароўе дзяцей), а таксама работа ў перапоўненых групах. З неравышэннем напаўняльнасці груп у нас працуюць 44 працэнты дашкольных устаноў. Між іншым, педагогі не павінны знаходзіцца побач з дзецьмі ў стомленым і трывожным стане, паколькі гэта самым непасрэдным чынам адбіваецца на іх выхаванцах. 42-дзённы водпуск, які быў у педагогаў дашкольных устаноў раней, проста жыццёва неабходны ім для адпачынку, зняцця псіхічнай нагрузкі і вызвалення ад стрэсу. Ступень эмацыянальнага выгарання ў выхавальнікаў — надзвычай высокая.

Да дашкольнай адукацыі ў нас у апошнія гады прад'яўляюцца вельмі высокія патрабаванні. Дзіцячыя дашкольныя ўстановы пераўтвараюцца ў Цэнтры развіцця дзіцяці. Але мы назіраем парадаксальную сітуацыю. Педагогі, дзякуючы майстэрству якіх звычайныя дашкольныя ўстановы былі пераўтвораны ў Цэнтры развіцця, пазбавіліся права на датэрміновы выхад на пенсію па выслузе гадоў. Педагогі-дашкольнікі, якія працуюць у вучэбных комплексах «дзіцячы садок—школа», маюць права на 56 дзён водпуску, а іх калегі, што працуюць у дзіцячых садках, толькі 30. Хоць і кола абавязкаў у іх, і нагрузкі — абсалютна ідэнтычныя.

Хачу заўважыць, што работнікаў дашкольных устаноў у нашай сістэме больш як 50 тысяч чалавек. І калі раней фактычна адзіным сацыяльным стымулам для іх быў падоўжаны водпуск, то цяпер рычагоў, якія б дазволілі неяк уплываць на кадравую сітуацыю, увогуле не засталося. Спецыялісты прагназуюць, што педагогаў-дашкольных устаноў мы страцім прыкладна праз год, а педагогаў, што працуюць у сістэме пазашкольнага выхавання, яшчэ раней. Ужо ў мінулым годзе Беларускі педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка атрымаў заявак на размеркаванне дашкольнікаў больш, чым падрыхтаваў выпускнікоў па адпаведных спецыяльнасцях за кошт бюджэтных сродкаў. Тая ж сітуацыя і цяпер. У Мінску, на мой погляд, увогуле адсутнічае матывацыя працаўладкавання ў сістэму дашкольнай адукацыі, калі можна ўладкавацца нянькай ці гувернёрам і займацца выхаваннем дваіх-траіх дзяцей, а не двух з лішнім дзесяткаў. Па гібкім графіку, за добрыя грошы...

А педагогам, што працуюць ва ўстановах пазашкольнага выхавання і навучання, і увогуле пакінулі 24 дні працоўнага водпуску. У працы гэтай катэгорыі работнікаў ёсць свая спецыфіка — наведванне гурткоў і секцый не з'яўляецца для дзяцей абавязковым, як, напрыклад, наведванне школы. Гэта ў школе настаўнікаў не выбіраюць. А вось педагогаў, пад кіраўніцтвам якіх яны займаюцца сваёй любімай справай, дзеці выбіраюць самастойна. Таму калі педагогу не ўдалося зацікавіць дзяей, то ён проста застанецца без педагагічнай нагрузкі. У сістэме пазашкольнага выхавання затрымліваюцца толькі педагогі ад Бога, сапраўдныя энтузіясты, улюбёныя ў сваю справу людзі. Прычым працуюць літаральна за «капейкі».

— Раман Восіпавіч, але ж ёсць яшчэ і «байцы нябачнага фронту» — метадысты, выкладчыкі інстытутаў павышэння кваліфікацыі...

— Сапраўды, іх работа — не такая бачная, але пры гэтым не менш важная. Метадыст — гэта фактычна настаўнік настаўнікаў. Метадычныя службы ўсіх узроўняў з'яўляюцца цэнтральнымі звёнамі ў стварэнні сістэмы аказання адраснай практычнай дапамогі кіраўнікам, метадыстам, педагогам, якія ўкараняюць новы змест, выкарыстоўваюць новыя педагагічныя тэхналогіі. Высокая кваліфікацыя, працяглы стаж работы ў галіне, аўтарытэт сярод педагогаў, творчы патэнцыял — вось далёка не поўны пералік сучасных патрабаванняў да «настаўніка настаўнікаў». Аднак сацыяльны статус метадыстаў усіх узроўняў, які зусім не адпавядае рэальнай важнасці іх працы для галіны, прыводзіць да значнай цякучасці кадраў і адтоку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Нізкая заработная плата гэтай катэгорыі работнікаў (400—480 тысяч рублёў) і забарона на выкладчыцкую дзейнасць у асноўны рабочы час плюс цяпер яшчэ і скарачэнне працоўнага водпуску прывялі да абвастрэння сітуацыі.

Хвалюе нас і сітуацыя з магчымым адтокам прафесарска-выкладчыцкіх кадраў з устаноў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Іх службовыя абавязкі — аналагічныя абавязкам прафесарска-выкладчыцкага складу работнікаў вышэйшых навучальных устаноў. Тым не менш апошнія маюць працоўны водпуск 56 дзён, а для першых пакінулі мінімальны водпуск — 24 дні.

Не магу звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць — з новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса знікла такое паняцце, як творчы водпуск. У шэрагу краін Захаду, напрыклад, выкладчык можа ўзяць творчы водпуск, каб распрацаваць новы вучэбны курс. У нас жа гэтым трэба займацца мімаходзь, паміж справамі...

— Цікава, а якая працягласць працоўных водпускаў у педагагічных работнікаў у іншых краінах СНД?

— У Расійскай Федэрацыі, Украіне, Казахстане захавана звыклая для нас працягласць водпускаў: 56 дзён і 42 дні — у дашкольных работнікаў. Найменшая працягласць у Кыргызстане 35—42 дні, у залежнасці ад стажу. А, напрыклад, у Малдове, педагогі адпачываюць і ўвогуле 62 дні. Але нідзе работнікі адукацыйнай галіны не ставяцца ў адзін шэраг з работнікамі, якія маюць мінімальную працягласць адпачынку.

Міжнародная практыка гэтага пытання яшчэ больш разнастайная. У суседняй Польшчы педагогі адпачываюць 67 дзён улетку і 17 — у час калядных і пасхальных канікулаў, у Германіі — 42 дні ўлетку і 3 тыдні — у час канікулаў, у Швецыі — 42 дні і дадатковыя дні, устаноўленыя прафсаюзам.

Гутарку вяла
Надзея НІКАЛАЕВА.

ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 января 2008 г.

АКТИВ	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	116 982	127 559
Нематериальные активы	120	1	4
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	6 023	6 061
в том числе: незавершенное строительство	141	2 949	4 355
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	123 006	133 624
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	112 297	114 226
в том числе: сырье, материалы и другие активы	211	31 900	6 562
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	969	522
расходы на реализацию	214	53	519
готовая продукция и товары для реализации	215	56 394	65 391
товары отгруженные	216	21 032	36 263
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	1 949	4 953
прочие запасы и затраты	219		16
Налоги по приобретенным активам	220	5 936	1 988
Дебиторская задолженность	230	13 123	10 683
в том числе: покупателей и заказчиков	231	8 654	5 108
поставщиков и подрядчиков	232	3 442	5 266
разных дебиторов	233		56
прочая дебиторская задолженность	234	1 027	253
Расчеты с учредителями	240		
в том числе: по вкладам в уставной фонд	241		
прочие	242		
Денежные средства	250	946	5 284
в том числе: денежные средства на депозитных счетах	251		2 400
Финансовые вложения	260	580	8 022
Прочие оборотные активы	270	27	17
ИТОГО по разделу II	290	132 909	140 220
БАЛАНС	300	255 915	273 844

ПАССИВ	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	4 029	7 585
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	460	460
в том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	30	30
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	430	430
Добавочный фонд	430	58 984	69 986
Прибыль (убыток) отчетного периода	440		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	9 549	3 146
Целевое финансирование	460	2 775	387
Доходы будущих периодов	470	634	637
ИТОГО по разделу III	490	76 431	82 201
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	64 261	86 576
Краткосрочные кредиты и займы	520	54 348	63 983
Кредиторская задолженность	530	60 748	40 009
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	531	48 033	26 807
перед покупателями и заказчиками	532	8 902	9 834
по оплате труда	533	540	868
по расчетам с персоналом	534	1	1
по налогам и сборам	535	1 389	910
по социальному страхованию и обеспечению	536	136	295
разных кредиторов	537	1 747	1 294
прочая кредиторская задолженность	538		
Задолженность перед учредителями	540	125	1 075
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	541	4	1
прочая	542	121	1 074
Резервы предстоящих расходов	550	2	
Прочие виды обязательств	560		
ИТОГО по разделу IV	590	179 484	191 643
БАЛАНС	600	255 915	273 844

Справочно из строки 530		На начало года	На конец отчетного периода
		3	4
Долгосрочная кредиторская задолженность	601	1 392	1 086
Краткосрочная кредиторская задолженность	602	59 356	38 923

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001		
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002		
Материалы, принятые в переработку	003		
Товары, принятые на комиссию	004		
Оборудование принятое для монтажа	005		
Бланки строгой отчетности	006	5	4
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007		
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008		
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009		
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010		
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011		
Нематериальные активы, полученные в пользование	012		
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	23	16
Потеря стоимости основных средств	014	55	56

Учетный номер плательщика: 200037600
Вид деятельности: ПРОИЗВОДСТВО САХАРА
Орган управления: КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»
Единицы измерения: МЛН.РУБ.
Адрес: БРЕСТСКАЯ ОБЛ. г. ЖАБИНКА, УЛ. КАЛИНИНА,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.

Наименование показателей	Коды строк	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	179 376	234 298
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	19 360	20 212
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	160 016	214 086
СПРАВОЧНО Из строки 010 — сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	152 722	190 174
Управленческие расходы	040		
Расходы на реализацию	050	5 149	4 725
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	2 145	19 187
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	37 780	58 464
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071		
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	37 780	58 464
в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081		
от выбытия основных средств и нематериальных активов	082	213	14
прочие операционные доходы	083	37 567	58 450
Операционные расходы	090	37 872	57 332
в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091		
от выбытия основных средств и нематериальных активов	092	397	274
прочие операционные расходы	093	37 475	57 058
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	100		
Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций	110		
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+/-100+/-110)	120	-92	1 132
III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	932	1 611
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		
Внереализационные доход

Краіна здароўя

Выпуск № 14 (70)

ЯК КАНТРАЛЯВАЦЬ АТЭРАСКЛЕРОЗ

Калі ласка, раскажыце на старонках газеты больш падрабязна пра атэрасклероз. Справа ў тым, што ад медыкаў чуеш пра атэрасклероз з любой нагоды. Калі скардзішся ўрачу, што ногі пастаянна стынуць, той тлумачыць, што прычына ў атэрасклерозе. Няпамятлівасць таксама тлумачыць атэрасклерозам. Шум у галаве — зноў атэрасклероз. Што гэта за хвароба такая, і як з ёй можна змагацца?

С.А. АНДРЭЙЧЫК, *г. Бабруйск.*

Атэрасклероз — гэта хранічнае захворванне, пры якім на ўнутраных сценках артэрый адкладваюцца халестэрынавыя бляшкі. Своеасаблівым будаўнічым матэрыялам для ўтварэння бляшкі з'яўляецца халестэрын — тлустападобнае рэчыва, якое цыркулюе ў крыві, і жыццёва неабходнае для ўтварэння клетак. Але пры яго залішняй колькасці халестэрын пачынае паводзіць сябе агрэсіўна: атакуе клеткі і высцілае ўнутраную паверхню сасудаў, правакуючы рост атэрасклератычных бляшак. Часцей за ўсё ад атэрасклератычнага працэсу церпяць каранарныя артэрыі і буйныя артэрыі галавы, грудной і брушной поласці, а таксама ніжніх канечнасцяў.

Агульнавядома, што атэрасклероз з'яўляецца прычынай найбольш сур'ёзных сардэчна-сасудзістых захворванняў, у прыватнасці, ішэмічнай хваробы сэрца, якая выклікаецца склерозам адной ці некалькіх каранарных артэрый. Калі з-за атэрасклератычных бляшак, якія звужаюць прасвет у артэрыях, крываток не можа забяспечыць патрэбаў сардэчных тканак, у чалавека эпізадычна ўзнікаюць болевыя прыступы, гэты стан на медыцынскай тэрміналогіі называюць стэнакардыяй. А калі ў звужанай атэрасклератычнымі бляшкамі каранарнай артэрыі ці пры ўтварэнні тромбу адбываецца поўная блакада крыватоку (тромб можа ўтварыцца пры разбурэнні атэрасклератычнай бляшкі), у чалавека развіваецца інфаркт міякарда, ці ўвогуле можа наступіць раптоўная смерць. У аснове самага распаўсюджанага варыянту інсульту, ішэмічнага інсульту, які яшчэ называюць інфарктам мозга, таксама ляжыць атэрасклероз мазгавых артэрый ці соннай артэрыі на шыі, якая сілкуе крывёй галаўны мозг. На долю асноўных сардэчна-сасудзістых захворванняў, што выклікаюцца атэрасклерозам, прыпадае прыкладна палова смяротных выпадкаў сярод дарослага насельніцтва Еўропы.

Клінічныя сімптомы захворвання праяўляюцца галоўным чынам на стадыі, калі атэрасклератычныя бляшкі звужаюць прасвет артэрый ужо напалову ці нават больш. У мужчын сімптомы рэдка праяўляюцца да 35-гадовага ўзросту, а ў жанчын — да 45 гадоў. А вось ва ўзроставай групе пасля 50—60 гадоў атэрасклероз распаўсюджаны ўжо даволі шырока.

Галоўнымі «саюзнікамі» халестэрыну ў развіцці атэрасклерозу з'яўляюцца павышаны артэрыяльны ціск, залішняя вага цела, малярухомы лад жыцця, хранічныя стрэсы, а таксама курэнне.

Прывядзём некалькі простых і даступных спосабаў, як можна зменшыць утрыманне тлушчаў у харчовым рацыёне:

— сметанковае масла ў бутэрбродзе можна замяніць раслінна-сметанковым маслам ці спецыяльнымі гатункамі маргарыну з нізкім утрыманнем тлушчаў, і намазваць масла на бутэрброд тонкім слоем;

— малочныя прадукты лепш набываць або абястлушчаныя (малако, кефір), або з заніжаным утрыманнем тлушчаў;

— з мяса трэба зразаць увесь бачны тлушч і не выкарыстоўваць яго пазней пры варцы супоў ці сусаў;

— сыр лепш выбіраць той, у якім утрымліваецца менш тлушчаў (заўсёды ўказваецца на маркіроўцы);

— пры спажыванні смажанай рыбы, кураняці, індычкі трэба без шкадавання адмаўляцца ад скуры;

— неабходна спажываць паболей агародніны, садавіны, прычым з мінімальнай кулінарнай апрацоўкай;

Некалькі рэцэптаў і парад для лячэння і прафілактыкі атэрасклерозу:

— адну галоўку часнаку, адзін лімон надзерці на тарцы (лімон разам са скурай), заліць цёплай гатаванай вадой, настойваць на працягу двух сутак у шчыльна закрытым посудзе, працадзіць. Прымаць па 1 сталовай лыжцы ў дзень.

— 40 грамаў здробненага часнаку заліць 100 грамамі гарэлкі, настойваць 10—15 дзён, дабавіць па смаку настойку з мяты. Прымаць па 10 кропляў 2—3 разы ў дзень за 30 хвілін да яды працяглы час;

— у рэдзьцы выдзеўбці сярэдзіну, запоўніць яе мёдам і настойваць 3—4 гадзіны. Прымаць па 2—3 сталовыя лыжкі раніцай і ўвечары;

— надзерці на тарцы цыбулю, адціснуць 1 шклянку соку, змяшаць са шклянкай мёду. Прымаць па 1 сталовай лыжцы 3 разы ў дзень за гадзіну да яды ці праз 2—3 гадзіны пасля.

Карысна штодня прымаць 60—100 грамаў мёду, бо гэты прадукт сур'ёзна стрымлівае працэс склеразавання сасудаў.

Вельмі карысныя ягады і лісце садовых суніцаў, лясной ажыны, плады агрэсту, рабіны, маліны. З агародніны асабліва карысная капуста.

Вывядзенню халестэрыну з арганізма спрыяюць таксама і яблыкі, чарнасліў, плады аронii чарнаплоднай, буракі, баклажаны, таматы.

У якасці прафілактыкі можна прымаць па 75 грамаў кукурузнага алею ў суткі або з'ядаць 100 грамаў грэцкіх арэхаў.

Народная медыцына рэкамендуе таксама адвар і настой з бярозавых пупышак (5 г пупышак заварваюць у адной шклянцы вады, гатуюць 15 хвілін, настойваюць гадзіну, працэджваюць і прымаюць па палове шклянкі праз 1 гадзіну пасля яды).

А вось для таго, каб ажыццяўляць медыкаментознае лячэнне, трэба спачатку атрымаць дадзеныя біяхімічнага аналізу крыві, які дазваляе ўстанавіць утрыманне ў крыві халестэрыну і розных фракцый ліпідаў. У Расіі, напрыклад, 60 працэнтаў людзей маюць канцэнтрацыю халестэрыну вышэй за норму, а ў 20 працэнтаў рэгіструюцца празмерна высокія паказнікі.

Найбольш заўважнае зніжэнне халестэрыну і тлушчаў у крыві атрымліваюць пры прымяненні лекаў з групы стацінаў. Гэтыя прэпараты змяншаюць вытворчасць халестэрыну ў арганізме чалавека. Эфектыўнасць стацінаў даказана многімі даследаваннямі. Але, на жаль, у стацінаў, як і ва ўсіх лекавых прэпаратаў ёсць пабочныя эфекты і процiпаказанні. Таму медыкаментознае лячэнне можа прызначыць толькі ўрач, прычым такое лячэнне павінна суправаджацца выкананнем рэкамендацый па здаровым харчаванні і здаровым ладзе жыцця.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Сямейны псіхолаг

Святлана Анішчанкава

Дзяўчынка 6 гадоў прыхарошваецца каля люстэрка: фарбуе губы, капіруе маміны жэсты, распускае косы... Яна спрабуе быць прывабнай. Хлопчык 7 гадоў агрызаецца, агрэсіўна ўспрымаючы жарты ў свой адрас. Ён настойвае на сваёй мужчынскай годнасці. Дарослыя смехам рэагуюць на спробы маленькіх людзей падкрэсліць сваю прыналежнасць да іх свету. Альбо раздражняюцца з-за сапсаванай касметыкі і імкнуцца накіраваць не па гадах развітае дзіця ў «патрэбнае рэчышча». «Табе яшчэ рана прыхарошвацца», «Адкуль столькі гонару ў маленькага хлопчыка?!» — абураюцца здзіўленыя бацькі, якія беспаспяхова спрабуюць расставіць усё на свае месцы: дзецям — дзяцінства, дарослым — сур'ёзнае жыццё.

На самай справе нас палохае думка аб уваходжанні дзіцяці ў свет узаемаадносінаў мужчыны і жанчыны. Мы забываемся або не хочам памятаць, якімі былі ва ўзросце 6—9 гадоў. Але фарміраванне чалавека не адбываецца адразу. Памылкова думаць, што гэта супадае з фізічным сталеннем. Апошняе — толькі заключны этап вялікай працы, якую робіць прырода, каб паступова падрыхтаваць чалавека да няпростага дарослага жыцця.

Жаданне дзяцей арыентавацца на асаблівасці свайго полу неўсвядомленае. Хлопчык неасэнсавана паўтарае паводзіны свайго бацькі. Такое пазнаванне нярэдка чаплеяе сваёй праўдзівасцю. Не вельмі прыемна бачыць, што дзіця можа быць грубым і эгаістычным. У апошнюю чаргу бацькі схільныя вінаваціць сябе, яны не хочуць прызнацца ў тым, што маюць дачыненне да фарміравання сацыяльных паводзінаў сваіх дзяцей. Неўсвядомленае імкненне дзяўчынкі быць прыгожай таксама палохае. Дарослыя баяцца, што ранняе развіццё прывядзе да заўчаснага палавога жыцця. Сітуацыя канфлікту, які выклікае развіццё натуральных эмацыянальна-псіхалагічных працэсаў, пагаршаецца з-за адсутнасці падтрымкі з боку бацькоў. Дарослыя, на жаль, не разумеюць важнасці моманту, падчас якога закладваецца база для паўнацэннага развіцця дзіцяці.

Праяўленні дзецьмі сваёй палавой прыналежнасці — гэта натуральна і нармальна. Калі гэтаму перашкодзіць, то падлеткавы ўзрост прынясе буру негатыўных эмоцый, звязаных перадусім з незадаволенасцю сабой і тымі, хто побач. Мы атрымаем няўменне дзіцяці ўзаемадзейнічаць з навакольным светам. Першыя спробы актуалізаваць сябе ў грамадстве былі высмеяны і ў выніку сфарміраваўся комплекс непавагі да сябе і іншых.

Як гэта ні дзіўна гучыць, але задача бацькі — ставіцца да сваёй 8-гадовай дачкі як да жанчыны: дарыць ёй кветкі, гаварыць кампліменты, захапляцца. Менавіта тата — самы дарагі, блізкі і любы ў свеце чалавек — павінен падтрымаць у сваёй маленькай дачцэ жаночыя асаблівасці сацыяльных паводзінаў, падаць прыклад зносінаў з супрацьлеглым полам. Прывычная з дзяцінства да пяшчоты, увагі і павагі жанчына хутчэй абыдзе «пасткі лёсу» і інтуітыўна, сэрцам, адгукнецца на прывычныя ёй з дзяцінства адносіны. Гэтаксама і малады мужчына, які з малых гадоў увабраў годныя адносіны з боку бацькоў, пойдзе па жыцці смелага. Самапавага, якая сфарміравалася пад уплывам любячых родзічаў, дапаможа яму ў «барацьбе за выжыванне», дасць апору ў цяжкія часы і дапаможа фарміраванню цэласнай асобы. І наадварот: маленькая душа, прыніжаная насмешкамі, груба і заўчасна далучаная да пошлага ўспрыняцця дарослых, будзе вечна помсціць сабе і сваім блізкім за несправядлівасць і абыякавасць. Разумная прырода дае нашым дзецям магчымасць папрактыкавацца на сваіх бацьках, якія павінны быць падтрымкай, мець давер і павагу — неабходныя ўмовы для «доследаў сырой душы».

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

На жаль, сёння мала хто надае значэнне развіццю дзіцячай псіхікі на этапе 6—9 гадоў. У лепшым выпадку, аддаючы ўсе сілы на паспяховае школьнае навучанне, дакладней на адзнакі, мы не бачым галоўнага — цудоўнага нараджэння любові ў маленькім сэрцы, таго, што прадвызначыць будучае дзіцяці. Чалавеку вельмі важна адчуваць сябе шчаслівым. Шчаслівы чалавек — здаровы, прыгожы, паспяховы. Але дарослага навучыць гэтаму адчуванню складана. Неабходна фарміравацца ў атмасферы шчасця: бачыць радасць у вачах бацькоў, адчуваць сваю важнасць у іх жыцці, разумець, што ты — частачка свету, без якой свету няма. Не так важна, што ў сына альбо дачкі не ўсё атрымліваецца ў школе. Для бацькоў дзіця ўсё роўна самае дарагое. Толькі нельга забыцца пра гэта сказаць!

Успомнім сябе ў дзяцінстве: як дзяўчынкам хацелася надзець маміну сукенку, туфлі, хлопчыкам — насіць вусы як у бацькі. Трэба надаць увагу задаткам полу дзіцяці. Няхай не палохае жаданне дачкі быць прывабнай, трэба дапамагчы ёй у імкненні да ўдасканалення. Дазвольце ўзяць сваю касметыку, пагуляйце ў «салон прыгажосці». Задавальненне ад прызнання, прыняцця сябе дзіцем будзе ўзнагародай. Тады ў падлеткавы перыяд не давядзецца апраўдвацца за дачку ў школе з-за «непрыстойнага выгляду», бо яна, з мудрай дапамогай маці, навучыцца сябраваць са сваёй знешнасцю.

Падыграйце сыну ў імкненні стаць мужчынам. Пагаварыце па душах, раскажыце пра сваё дзяцінства і сумненні. Дайце зразумець, што мужчынам становяцца паступова, і што для гэтага трэба ўмець не толькі пастаяць за сябе, але і паважаць іншых. Вучыце сыноў зносінам з супрацьлеглым полам з дзяцінства — потым будзе позна. У падлеткавым узросце менавіта хлопчыкі церпяць ад няўмення кантактаваць з дзяўчынкамі, і расчараванне ад няўдалых зносінаў можа паўплываць на ўсё іх жыццё. Нездарма першае дзетсадаўскае каханне памятаюць амаль усе. І нездарма яно ў нашай свядомасці афарбавана ў сонечныя колеры. Гэта першая, бераўзвая спроба прыроды выпрабаваць чалавечае сэрца — атрымаецца з яго што-небудзь ці не?

Як рэдка мы задумваемся над несур'ёзнымі дзіцячымі праблемамі, не разумеючы, што менавіта цяпер, пакуль дзіця малое, адбываецца самая важная работа прыроды — закладваецца фундамент дома, у якім яму трэба будзе або жыць, або мучыцца. Шмат не трэба — проста ўспомніць сябе ў дзяцінстве...

ЗДАРОЎЕ на талерцы

У міжсезонне звычайна зніжаецца працаздольнасць, мы хутка стамляемся, становімся раздражнёнымі, нярэдка ўпадаем у дэпрэсію, а наш аслаблены арганізм часта не здольны аказаць належнае супраціўленне ўсялякім вірусам і інфекцыям. Прычына — няхватка вітамінаў. Таму ў зімова-вясновы перыяд вельмі важна як мага часцей ужываць цытрусавыя, якія з'яўляюцца ў гэты час асноўнымі «пастаўшчыкамі» натуральных вітамінаў. Цытрусавыя (апельсіны, грэйпфруты, лімоны, мандарыны і г.д.) змяшчаюць шмат карысных мінеральных рэчываў, арганічныя кіслоты (лімонную, фалiевую і інш.), вітаміны (А, Е, С, групы В, D, Р), клятчатку, антыаксіданты.

АПЕЛЬСІН рэкамендуюць для прафілактыкі і лячэння гіпа- і авітамінозаў. Яго сок узбуджае апетыт і паляпшае абмен рэчываў, а таксама з'яў-ляецца добрым процiцынготным сродкам. Пекціны, якія змяшчаюцца ў апельсінах, садзейнічаюць працэсу стрававання, узмацняюць маторную функцыю тоўстага кішэчніка і змяншаюць у ім гніласныя працэсы. Асабліва карысныя апельсіны для людзей, якія схільныя да дэпрэсіўных станаў.



АЎСЯНКА З АПЕЛЬСІНАМ

Апельсіны — 2 шт., аўсяныя шматкі — 1,3 шк., малако — 2 шк., разынкі (без костачак) — 1/3 шк., мёд — 1 ст. л.

Апельсіны памыць. Адзін апарыць кіпенем і надзерці цэдру гэтага апельсіна на дробнай тарцы, выціснуць з яго сок. Абабраць другі апельсін, падзяліць яго на долькі і адкласці. Дзёртую цэдру, апельсінавы сок, аўсяныя шматкі і малако змяшаць і, пастаянна памешваючы, давесці да кіпення на невялікім агні. Варыць 1 хвіліну. Дадаць разынкі і мёд. Падаваць на стол, упрыгожыўшы кожную порцыю долькамі апельсіна.

КАКТЭЙЛЬ АПЕЛЬСІНАВЫ З ШАКАЛАДАМ

Апельсінавы сіроп — 30 мл, малако — 1/2 шк., шакалад — 2 г.

Малако і сок ахаладзіць да 5—8°С. Затым змяшаць іх, наліць у бакал, пакласці лёд і пасыпаць дзёртым шакаладам.

ГРЭЙПФРУТ не кожнаму спадабаецца з-за кіславатага смаку. Аднак на сваіх лекавых уласцівасцях ён нават пераўзыходзіць апельсін. Грэйпфрут неабходны перш за ўсё людзям, якія пакутуюць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Ён незаменны пры дыеце, прызначанай для ўмацавання сэрца. Грэйпфрут знiжае ўзровень халестэрыну ў крыві, дапамагае пры захворваннях вен, сутаргах і гемароі, умацоўвае імунную сістэму, ачышчае кішэчнік і стабілізуе кішэчную флору, актывізуе абмен рэчываў і садзейнічае зніжэнню вагі.

ЗАПЯКАНКА «СОНЕЙКА»

2 спелыя грэйпфруты, 2 ст. л. цукру, 4 ч. л. сметанковага масла.

Грэйпфруты разрэзаць папалам і кончыкам нажа дастаць костачкі, пасыпаць цукрам, а ў сярэдзіну кожнай палавінкі пакласці кавалачак масла. Падрыхтаваныя плады выкласці ў глыбокую патэльню (зрэзам уверх), паставіць на 5 хвілін у гарачую духоўку і адразу ж падаваць на стол.

ЛІМОН стымулюе выпрацоўку страўнікавага соку, актывізуе абмен рэчываў, умацоўвае крывяносныя сасуды і спыняе кроватачывасць дзёснаў, прымяняецца для прафілактыкі варыкознага расшырэння венаў. Лімонны сок узбуджае апетыт і лепш за любы іншы напой праганяе смагу.

САЛАТА З МОРКВЫ, КУРАГІ І ЛІМОНА

4 морквіны, 100 г курагі, 1/2 лімона, 100 г смятаны, зяленіва пятрушкі, соль, цукар.

Моркву надзерці на буйной тарцы, курагу нарэзаць, перамяшаць з морквай, дадаць нарэзаны лімон. Заправіць смятанай, цукрам і соллю. Упрыгожыць скрылькамі лімона і зяленівам пятрушкі.

ЛІМОННЫ МОРС

1 лімон, 4 шк. вады, 5 ст. л. цукру.

З лімона знімаюць цэдру і дробна яе наразаюць, заліваюць гарачай вадой і кіпяцяць 5 хвілін. Пакідаюць на 3—4 гадзіны. Адвар працэджваюць, дадаюць цукар і даводзяць да кіпення. Уліваюць адціснуты сок і ахалоджваюць.

МАНДАРЫН — яшчэ адна вітамінная кладоўка. Ужыванне мандарынаў садзейнічае павышэнню ўстойлівасці арганізма да розных захворванняў, паляпшэнню абменных працэсаў. Пацверджана процiастматычнае дзеянне мандарынаў. Мандарынавы сок рэкамендуецца ўжываць у клімактэрычны перыяд, асабліва пры моцных крывацёках. Адвар з лупіны мандарынаў зніжае ўзровень цукру ў крыві.

САЛАТА З МАНДАРЫНАМІ

Мандарыны — 5—6 шт., яблыкі — 2 шт., салодкі перац — 2 шт., кансерваваныя шампіньёны — 100 г, сыр — 200 г, ёгурт — 200—250 г, лімонны сок — 2 ст. л., гарчыца — 1 ч. л., мёд — 1 ч. л.

Яблыкі абабраць і нарэзаць кубікамі, а перац — паўкольцамі. Грыбы разрэзаць на чацвярцінкі, а ачышчаныя мандарыны разабраць на долькі. Сыр нарэзаць кубікамі. Усё змяшаць і заправіць соусам з ёгурту, гарчыцы, лімоннага соку і растопленага мёду. Гатовую салату ўпрыгожыць долькамі мандарынаў.

УВАГА! Абмежаваное ўжыванне цытрусавых рэкамендавана пры язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пры гастрыце з павышанай кіслотнасцю страўнікавага соку, энтэрытах, калітах, пры халецыстыце, гепатыце і вострым нефрыце.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Надыходзіць час слёз для алергікаў

Сезонныя хваробы

З надыходам цяпла, калі пачынаюць цвісці расліны-алергены, людзі, схільныя да алергічных рэакцый, чхаюць і кашляюць, не могуць абыходзіцца без насоўкі і ўвогуле адчуваюць сябе дрэнна.

— Так праяўляе сябе сезоннае алергічнае захворванне палiноз, — расказвае **дацэнт кафедры алергалогіі і прафпаталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Людміла МАСЛАВА.** — Хвароба ўзнікае часцей за ўсё ў другой палове красавіка, калі з'яўляецца пылок бярозы, вольхі, ляшчыны, дуба, клёна, ясеня і некаторых кустоў.

Усяго каля 100 раслін могуць выклікаць алергію. Веснавая алергія заканчваецца ў канцы мая, але не ўсе алергікі могуць расслабіцца. Напрыклад, тым, у каго алергія на пылок бярозы, круглы год не рэкамендуецца есці чырвоныя яблыкі, сырую моркву, ківі, персікі, абрыкосы. А тым, у каго алергія на пылок ляшчыны, нельга есці фундук.

Клінічныя праявы палiнозу вельмі разнастайныя — пачынаючы ад лёгкага насмарку і заканчваючы цяжкімі пашкожаннямі скуры і прыступамі бранхіяльнай астмы. Аднак часцей за ўсё гэта алергічны насмарк, рыніт у спалучэнні з алергічным паражэннем кан'юнктывы вачэй — кан'юнктывіт.

Часам да 20 працэнтаў людзей церпяць ад алергіі, нават не ведаючы аб гэтым. Многія прымаюць алергію за ВРЗ або гастрыт. Прыкметы вясенняй алергіі падобныя на звычайную прастуду. Таму некаторыя хворыя нават не падазраюць, чаму кожную вясну яны працягла і ўпарта лечацца ад ВРЗ або рыніту.

Як жа адрозніць алергію ад прастуды? Ёсць пэўныя прыметы, якія дапамогуць убачыць розніцу. Гэта, хутчэй за ўсё, алергія, калі:

- няма павышэння тэмпературы;
- слізістыя выдзяленні з носа празрыстыя і вадкія;
- чханне паўтараецца часта і шматразова;
- прысутнічае сверб у носе, вушах, горле (асабліва ў верхняй частцы ротавай поласці);
- сімптомы цягнуцца больш, чым пры прастудзе, якая звычайна праходзіць за 7 дзён;
- насмарк і пячэнне вачэй узмацняецца ў сухое і ветранае надвор'е, у дажджлівае — слабеюць;
- дома вы адчуваеце сябе лепш, чым на вуліцы;
- раніцай сімптомы праяўляюцца мацней, чым вечарам.

Калі вы не ведаеце, што ў вас — алергія або прастуда, то звярніцеся да спецыяліста, які зможа паставіць дыягназ і прызначыць адпаведнае лячэнне.

Вясенняя алергія толькі на першы погляд выглядае бяспечна. Калі яе не лячыць, яна можа даваць скачкі тэмпературы, выклікаць гастрыт, міякардыт і іншыя запаленчыя захворванні, аслабляць імунную сістэму.

У перыяд пылення і цвіцення раслін неабходна прыняць шэраг прафілактычных мераў. Трэба насіць цёмныя акуляры для папярэджання раздражнення вачэй, змясціць вільготную марлю на вокны і форткі, выкарыстоўваць ачышчальнікі паветра дома. Неабходна таксама медыкаментознае сімптаматычнае лячэнне і найперш прыём антыгістамінных і супрацьзапаленчых прэпаратаў.

Ці можна засцерагчыся ад алергіі? Вясеннюю алергію нельга вылечыць поўнасцю, можна толькі аблегчыць яе цячэнне. Правільнае прымяненне супрацьалергічных прэпаратаў звычайна садзейнічае аблягчэнню або частковаму зніжэнню сімптомаў рыніту, кан'юнктывіту і іншых праяў пылковай алергіі.

Антыгістамінныя сродкі знімаюць сверб, чханне, выдзяленне празрыстай ліпкай слізі з носа — рынарэю, пачырваненне і раздражненне. У клінічнай алергалагічнай практыцы шырока выкарыстоўваюць такія антыгістамінныя прэпараты, як супрасцін, дымедрол, тавегіл, кларыцін і інш. Аднак пры іх прымяненні могуць узнікаць пабочныя дзеянні: санлівасць, парушэнне ўвагі і каардынацыі, слабасць, галаўны боль, затрымка мачы і інш. Часта сіла пабочнага ўплыву перавышае тэрапеўтычны эфект.

Таму вось некаторыя парады, якія дапамогуць пры алергіі:

- калі пачырванелі і забалелі вочы, прамыйце іх халоднай вадой, зрабіце халодныя прымочкі на твар або пратрыце твар лёдам;
- старайцеся менш бываць на сонцы; не загарайце, гуляйце ў сырое надвор'е, калі пылок прыбіваецца да зямлі;
- вясной не карыстайцеся тушшу для вачэй, ценямі і іншай касметыкай;
- змяніце рэжым дня (пік утварэння пылку — паміж 5 і 10 гадзінамі раніцы); па магчымасці планіруйце выхад з дому на іншы час сутак;
- звярайцеся з прагнозамі надвор'я;
- моцны дождж вымывае пылок з паветра, таму прагулкі пасля дажджу найбольш пажаданыя;
- засцерагайцеся сухіх ветраных дзён, калі пылок можа быць асабліва інтэнсіўным;
- карыстайцеся маскай падчас работы ў дварэ — маска можа забяспечыць эфектыўны бар'ер паміж пылком і мембранамі слізістай абалонкі;
- душ і змена адзення — добры сродак ад пылку, які, магчыма, сабраўся ў валасах і тканках, пакуль вы былі на вуліцы.
- Мыйце галаву на ноч. Купайце хатніх жывёлін, якія часта бываюць на вуліцы. Не сушыце адзенне на свежым паветры.

І яшчэ вельмі важна ведаць, да чаго канкрэтна маецца алергія. І ў сувязі з гэтым трэба ўлічваць што не толькі вясенняя алергія мае месца. Ва ўмовах Беларусі адзначаюцца тры пікі цвіцення раслін і тры перыяды ў цячэнні палiнозу.

Аб першым перыядзе (так званым драўняным — калі цвітуць дрэвы) мы расказалі вышэй.

Другі перыяд пачнецца ў пачатку чэрвеня і прадоўжыцца да сярэдзіны ліпеня. У гэты час цвітуць злакавыя культуры і пустазелле (жыта, цімафееўка, мятлік, ежа). Зноў-такі ў гэты час можа праявіцца харчовая алергія. Да абвастрэння палiнозу можа прыводзіць ужыванне такіх прадуктаў, як крупяныя кашы, макаронныя і хлебабулачныя вырабы, прадукты, у якія ўваходзіць мука.

Трэці перыяд пачынаецца з другой паловы ліпеня і працягваецца да верасня. У гэты час цвіце складанакветкавае пустазелле, асноўнай алергеннай травой з'яўляецца палын. Цэлы шэраг прадуктаў можа падтрымліваць праявы палiнозу. У прыватнасці, гэта алей, халва, маянэз, гарчыца, прадукты, прыгатаваныя з выкарыстаннем палыну, — вермуты, бальзамы. Сюды ж адносяцца сельдэрэй, кроп, пятрушка, перац, мускатны арэх, карыца, каляндра, могуць быць і морква, і бурак, і шпінат.

Вольга ШАЎКО.

Калі хочаш быць здаровым — плавай!

Гэту параду вельмі часта чуюць адпачываючыя санаторыя «Пралеска», які належыць ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Такое прадпісваюць не толькі вопытныя медыкі, але і раяць усе, хто наведваў мясцовы аквапарк. Карыснае тут цудоўна спалучаецца з прыемным, бо акрамя эфекту гаючага масажу вадзяныя струмені задзейнічаны ў мастацкай розналяровай феерыі. Усімі колерамі вясёлкі пераліваюцца дах і сценкі аквапарка, асвятляецца плынь.

— Вельмі важна, каб адпачынак і аздараўленне на вадзе былі правільна збалансаваныя, — лічыць медыцынская сястра Алена Сталярцова.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

ПВ | месца | літар | (індэкс выдання)

Кошт: падпіскі _____ руб.; перааднасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 31 сакавіка** ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А.**

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ СВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **4 красавіка 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 12 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 1 сакавіка 2008 года. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 1.03.08 па 10.04.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 964 ад 26.02.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 1-е паўг. 2008 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс) _____

_____

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

17 сакавіка — начальнік аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Наталля Уладзіміраўна МАЛАШКА.

18 сакавіка — галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Алена Уладзіміраўна ГЛУШАНІНА.

У графіку магчымыя змяненні.

Дыягностыка раку грудзей — па сліне

Амерыканскія навукоўцы распрацавалі тэст, які дазваляе дыягнаставаць рак і дабраякасныя пухліны грудзей па аналізе сліны. Па меркаванні даследчыкаў, найлепшым месцам правядзення тэсту стане кабінет стаматолага, паведамляюць інфармагенцтвы.

Новы метад быў паспяхова выпрабаваны на 30 пацыентах. Ён заснаваны на ўтрыманні ў сліне 49 бялкоў-маркераў і з'яўляецца хуткім спосабам дыягностыкі. Даследчыкі спрабуюць выявіць у сліне маркеры і іншых анкалагічных захворванняў, што дазволіць пашырыць магчымасці ўжывання тэсту.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 4 (26)

Дзеці ў Вербную нядзелю змогуць пакатацца па вуліцах Мінска на асле

Пальмавы тыдзень пачынаецца ў каталіцкіх хрысціян 16 сакавіка, у Вербную нядзелю. Свята, якое адкрывае Страсны тыдзень, прысвечанае ўспаміну ўваходу Ісуса Хрыста ў Іерусалім. Плануецца, што ў гэтым годзе пры ўмове добрага надвор'я ў святочным шэсці паўдзельнічае асёл, расказаў БЕЛТА Архіепіскап Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

«Са Свяшчэннага Пісання мы ведаем, што Ісус уязджаў у Іерусалім на асле. Каб паказаць гэта візуальна і максімальна падкрэсліць сэнс урачыстасці Вербнай нядзелі, мы таксама вырашылі задзейнічаць у цырымоніі асла. Такога не аказалася ў межах Мінска, таму жывёліну было вырашана прывезці з Дудутак. Запланавана такое шоў у большай ступені для дзяцей — пры жаданні любое дзіця, якое бярэ ўдзел у святкаванні, зможа пакатацца на асліку», — патлумачыў архіепіскап.

Дыялог-партрэт

Гармонія Беларускай філармоніі

Тры гады таму, пасля капітальнага рамонту, зноў адчыніліся дзверы Беларускай дзяржаўнай філармоніі (БДФ).

Цяжка паверыць, што прайшло ўжо столькі часу: гэты шыкоўна-ўрачысты будынак нібыта зусім новы, здаецца, у паветры яшчэ ўлоўныя пахі фарбаў...

Гавару пра гэта генеральнаму дырэктару Белдзяржфілармоніі Аляксандру ГАРБАРУ — і ён задаволена ўсміхаецца:

— Калі штодзённа клапоцішся пра захаванне таго, што зроблена, дык і вынік адпаведны.

Пасля завяршэння капітальнага рамонту было нямала недаробак, якія хутка ліквідавалі — і пайшлі далей шляхам удасканалення дызайну. Акрамя таго, у філармоніі забаронена курэнне. Гэта рашэнне было прынята на агульным сходзе, прагаласавалі аднагалосна.

Наша задача — падтрымліваць будынак і ўсё яго «начынне» ў ідэальным стане. Гэта не вельмі проста, хоць многім і здаецца: ну што філармонія — канцэртная зала... Не толькі!

У складзе філармоніі працуюць 19 калектываў: нацыянальнай і сусветнай класікі, фальклорныя, эстрадныя. У тым ліку Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі, акадэмічная харавая капэла імя Шырмы, народны аркестр імя Жыновіча, ансамбль салістаў «Класік-Авангард», вакальны гурт «Камерата», ансамблі «Сябры», «Свята», «Купалінка», тэатр песні Ірыны Дарафеевай... На сёння ў БДФ працуе 40 салістаў-вакалістаў, 80 лаўрэатаў прэстыжных міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

■ ■ ■

— Само слова «філармонія» грэчаскага паходжання, у перакладзе гэта «любоў да гармоніі»...

— Філармонія — захавальніца ўсіх шэдэўраў нацыянальнай класічнай музыкі і сусветнага мастацтва. Апошнім часам мы праводзім вельмі актыўную работу па захаванні і развіцці гэтых традыцый. Робім запісы на радыё, ствараем новыя праграмы, ўвасабляем перш за ўсё творы беларускіх кампазітараў. Толькі за 2007 год пад дахам філармоніі з'явілася 380 прэм'ерных праграм, «агучваем» большую частку беларускай музыкі.

У нас усталёўваюцца добрыя стасункі з Маскоўскай, Гданьскай, Літоўскай філармоніямі, з многімі абласнымі філармоніямі Расіі. Дык вось, у Гданьскай філармоніі — усяго 8—10 праектаў у месяц. А ў нас — звыш 20! Але пры гэтым не ўпускаем якасць! Бо, калі будзем гнацца толькі за колькаснымі паказчыкамі, філармонію можна ператварыць у канвеер.

— Усе адзначаюць высокае выканаўчае майстэрства беларускіх музыкантаў. Выбачайце за, можа, занадта «прыземлнае» пытанне: а зарплата гэтакая ж высокая, як і ўзровень майстэрства?

— Вы закранулі досыць праблемнае пытанне, якое стараемся вырашаць. Зарплата, на жаль, невысокая — хоць музыкі столькі гадоў аддаюць нават навучанню ігры на інструменце: музычная школа, каледж, кансерваторыя — 17—18 гадоў. І ўдасканальваюць майстэрства ўсё жыццё... Сярэдняя зарплата па філармоніі сёння 680 тыс. рублёў. Але ж нас нельга параўноўваць з тымі дзяржаўнымі канцэртнымі калектывамі, на балансе якіх няма буйных будынкаў, якія трэба ўтрымліваць. У штаце больш за сто спецыялістаў інжынерна-тэхнічных службаў (дарэчы, па выніках 2007 г. іх сярэднямесячная зарплата склала 401 тыс. рублёў). Акрамя будынка самой філармоніі, на нашым балансе яшчэ і інтэрнат, у якім пражывае каля 400 артыстаў з 43 канцэртных арганізацый, тэатраў, устаноў сістэмы Міністэрства культуры. Цяпер у інтэрнаце ідзе капітальны рамонт, усе асноўныя ўнутраныя работы плануем завяршыць да канца года.

...Мы ўзнялі яшчэ адну праблему: у аркестравых калектывах, калі музыкант дасягае вяршыні, яму прысвойваецца статус «вядучы майстар сцэны», а ў харавых калектывах гэтага няма. Тут, на мой погляд, чыста «тэхнічная» недапрацоўка. Мы будзем выходзіць з адпаведнымі прапановамі, каб сітуацыя была выпраўлена.

«У маёй маці быў голас незвычайнай прыгажосці...»

■ ■ ■

— У філармоніі дзве залы...

— У вялікай зале 688 месцаў, 188 — у малой. Мы лічым кожны рубель, і ўсё ж калі аналізаваць памеры ўзнагароджання (ганарары) выканаўцаў... Калі сёння прыязджаюць замежныя выканаўцы — мы не маем магчымасці запланаваць ім тыя ганарары, якія яны хацелі б мець.

— Тым не менш беларускія амаратары музычнага мастацтва ў афішах усё часцей бачаць прозвішчы, якія ўжо сталі імёнамі сусветнага мастацтва.

— Многія выканаўцы з задавальненнем адгукаюцца на прапановы выступіць у Беларусі. У нашай філармоніі добрая рэпутацыя. Напрыклад, Юрый Башмет — імя сусветнага музычнага мастацтва. Мы не можам прапанаваць яму высокі ганарар, які ён можа зарабіць у багатых краінах у час афіцыйных гастроляў. Але да нас ён прыязджае з задавальненнем — разумеючы нашу фінансавую абмежаванасць. Гэта павага да Беларусі, да беларускіх амаратараў мастацтва.

З задавальненнем прыязджаюць замежныя дырыжоры працаваць з нашым сімфанічным аркестрам — гэта прэстыжна. У Беларусі высакакласная выканаўчая школа. Бездакорна працуе адладжаная сістэма падрыхтоўкі музыкантаў. На працягу многіх гадоў філармонія плённа супрацоўнічае з лепшымі менеджарамі Еўропы. У мінулым годзе нашы калектывы выступалі ў 16 краінах свету, а на нашай сцэне — выканаўцы з 14 краін. Такім чынам, толькі за адзін год — творчыя стасункі з аматарамі мастацтва 30 краін. Пагадзіцеся, унушальная лічба.

■ ■ ■

— Гады тры таму вы, Аляксандр Валянцінавіч, расказвалі пра сваю мару: устанавіць каля Белдзяржфілармоніі экран, каб можна было весці «прамую трансляцыю» лепшых канцэртаў, паказваць лепшыя музычныя нумары... Цудоўная ідэя!

— Яна, як гаворыцца, ужо «ў рабоце». Мы вырашылі галоўнае пытанне — фінансавае. Нашу прапанову падтрымліваюць ва ўсіх інстанцыях. Аднак узнікае адно пытанне: побач, злева і справа, жылыя дамы. З улікам архітэктуры будынкаў неабходна выбраць такі праект, каб святлодыёдны экран не быў занадта вялікім, упісваўся ў прастору плошчы Якуба Коласа, у навакольнае асяроддзе, не перашкаджаў жыхарам.

— «Філарманічны» экран — гэта яшчэ адна своеасаблівая канцэртная пляцоўка?

— Безумоўна. Каля філармоніі звычайна збіраецца шмат моладзі, юнакі і дзяўчаты будуць (нават міжволі!) судакранацца з тым, што адбываецца на экране. Выхаванне густу!

— Цікавасць да філармоніі традыцыйна вялікая?

— Прыняты толькі адзін прыклад. У студзені і лютым запаўняльнасць залы склала каля 90 працэнтаў. Гэта вельмі высокая планка, а прайшло 47 канцэртаў.

— Дык столькі святочных дзён было!..

— Невыпадкова ж кажуць: гэта «мёртвы сезон» для канцэртнай дзейнасці. Але мы такія стварылі праграмы, што ў філармонію з задавальненнем ішлі аматары музычнага мастацтва. Праграмы разнапланавыя: джаз, эстрада, класіка...

У хуткім часе каля філармоніі з'явіцца экран — яшчэ адна своеасаблівая канцэртная пляцоўка.

Запаўняльнасць залы залежыць ад якасці праграм, якія прапануюцца на сцэнічнай пляцоўцы. А сёння, у інфармацыйную эпоху, дадаецца яшчэ адзін складнік поспеху: рэкламна-арганізацыйная дзейнасць, добры менеджмент.

Па рэкамендацыі Міністэрства культуры мы атрымалі дазвол на ўвядзенне ў штатны расклад менеджара. У філармоніі склаліся тры творчыя групы, у склад якіх уваходзяць: рэжысёр-пастаноўшчык, вядучы рэдактар, адміністратар — пад кіраўніцтвам менеджара. Прычым паміж групамі наладжваецца пэўнае спаборніцтва на пошук лепшых праектаў, павышаецца адказнасць за арганізацыю канцэртаў, распаўсюджванне білетаў...

■ ■ ■

— Калісьці ў філармоніі была яшчэ адна канцэртная пляцоўка — у саборы Святога Роха на Залатой Горцы...

У сярэднім там праходзіла каля ста канцэртаў у год. У 2006-м памяшканне было перададзена на баланс каталіцкага касцёла... Мяркую, нам удасца знайсці кампраміс у гэтым пытанні. У многіх краінах у храмах праходзяць канцэрты. Гэта, можна сказаць, ужо сусветная традыцыя. Дарэчы, у час перадачы сабора Святога Роха вернікам мы агаворвалі пытанне наконт магчымасці далейшага супрацоўніцтва. Там добры арган, набыты і ўсталяваны дзяржавай, — мы яго не дэманціравалі. Цяпер вырашаецца пытанне па самім будынку храма: патрабуецца капітальны ці хоць бы бягучы рамонт. І тады ўжо можна будзе весці канкрэтныя перамовы.

■ ■ ■

— У філармоніі створаны музей нашага слыннага песняра Уладзіміра Мулявіна. Музей можа наведаць кожны ахвотны?

— Так. Перад канцэртам гледачы ідуць на сустрэчу з музыкай Мулявіна, знаёмяцца з яго асабістымі рэчамі, жыццём і творчасцю. А можна і загадзя зрабіць калектыўную заяўку на наведванне музея і правядзенне экскурсіі. Нядаўна былі групы з Любанскага, Калінкавіцкага, Хойніцкага, Брагінскага, іншых раёнаў Беларусі.

— Памятаю, калі вучылася ў школе, у нас распаўсюджваліся абанементы ў філармонію: раз на месяц адбываліся канцэрты па самых розных праграмах. Мы, вучні, з задавальненнем хадзілі...

— Калі праходзіў капітальны рамонт будынка, сістэма абанементаў была часова прыпынена. Цяпер яна адноўлена, у нас пяць абанементных праграм для школьнікаў.

— Удакладняю: для сталічных вучняў?

— Не толькі. У Мінскай вобласці амаль у кожным райцэнтры, буйным пасёлку ёсць камерныя залы. Гэта, па сутнасці, нашы філарманічныя пляцоўкі. Усе калектывы ўключаны ў рэспубліканскія гастрольныя планы. У нашым «банку даных» звесткі па рэспубліцы: дзе якія палацы культуры, раённыя і сельскія дамы культуры; якая іх умяшчальнасць. Вядзецца ўлік, дзе быў той ці іншы калектыў.

З сакавіка распачалася акцыя «Мы — беларусы», якая будзе праходзіць на працягу года. Арганізатар праекта — Міністэрства культуры, а філармонія — своеасаблівы штаб. Напрыклад, сімфанічны аркестр змогуць пачуць у Магілёве, Мазыры, Гомелі, Віцебску...

■ ■ ■

— Адкуль вы родам, Аляксандр Валянцінавіч?

— Вёска Акулінка Мазырскага раёна.

— Якая прыгожая назва!

— Ёсць некалькі версій паходжання назвы. Магчыма, «рыбацкая»: у Прыпяці рыбу лавілі ды пыталіся: акунь ці лінь? Ёсць і рамантычная версія: нібыта жыла там калісьці прыгажуня-Акуліна...

А маё прозвішча — Гарбар — утварылася ад назвы рамяства: гэты майстар выраблянь шкуры. Непадалёк ад Акулінкі вёска Юравічы — акурат там на Прыпяці з'явілася першая стаянка людзей. Рыбу лавілі, палявалі, шкуры жывёл выраблялі...

Успамінаю сваё дзяцінства. Мне прывезлі баян — і я па вечарах сяджу над Прыпяццю, слухаю гук кожнай клавішы. Не ведаючы музычнай граматы... Я самавучка, але любую мелодыю на слых магу сыграць на баяне, на гармоніку.

— Як атрымалася, што жыццё вы звязалі з музыкай?

— Перад арміяй (тэрміновую службу я праходзіў на флоце, тры гады) працаваў загадчыкам мясцовага клуба. Мне вельмі спадабалася. У нас быў самадзейны калектыў, я на баяне акампанаваў. З выступленнямі ездзілі па ўсёй Мазыршчыне. Такі поспех быў! Адзін дзядок сказаў: «Табе ж у артысты трэба!» Скончыў інстытут культуры па спецыяльнасці метадыст-арганізатар у сферы культуры.

— Мабыць, вы з музычнай сям'і?

— У маёй маці быў голас незвычайнай прыгажосці. Калісьці ў Мазыры на конкурсе яна перамагла, потым у Гомелі на абласным конкурсе. На Мінск яе паслалі, але не было ні транспарту, ні сродкаў... З задавальненнем маці спявала ў хоры. А тады ж трэба было днём гектар бурачкоў прапалоць, бегчы на збожжаток, а потым — у клуб... Калі дадзена ад прыроды — голас, слых, пачуццё рытму, — дык і нараджаецца незабыўнае.

Нас у сям'і чатыры браты. Бывала, збяромся разам з маці над Прыпяццю, развядзём вогнішча і як заспяваем!..

Самая любімая матуліна песня была (спявае):

Из-под камушка-а-а,
Из под белого-о-о, ой!..
Течет реченька-а...
Речка быстрая...

Маці ўжо няма, а як пачую гэту песню — нібыта побач яна...

— На рабочым стале ў рамцы стаіць не фотаздымак, а... мабыць, гэта ваша крэда як кіраўніка? «Не згодзен — запярэч. Пярэчыш — прапануй. Прапануеш — зрабі!».

— Ёсць катэгорыя людзей, якія прыходзяць: «Я хачу праект!» — і гучаць доўгія няпэўна-абстрактныя «летуценні». Глядзіш на гадзіннік — 30 хвілін прайшло, але так ні аб чым не дамовіліся. Люблю канкрэтнасць, прадметную размову, не цярплю дэмагогій.

— Мабыць, шмат часу эканоміце дзякуючы гэтай «шыльдачцы» на стале?

— Так! *(Смяецца.)* Творчыя людзі любяць пагаварыць аб усім. Час праходзіць — і я, дырэктар, думаю: «А чаго ён прыйшоў?» Перабіць, здаецца, і няёмка — тады звяртаеш увагу на маё «залатое правіла».

— Аляксандр Валянцінавіч, на вашым стале шмат ручак...

— Люблю ручкі, люблю пісаць чарнілам. У мяне добры почырк, яшчэ ў школе гаварылі: «Каліграфічны!», калісьці пісаў плакатным пяром... І цяпер, калі добры настрой, бяру баян. Штосьці сыграю, а потым адкрываю песеннік — прыгожа перапішу песню, стаўлю дату. Праходзіць час, я перачытваю напісанае: ага, значыць, у той дзень быў выдатны настрой...

— Сям'я ваша вялікая? Жонка, дзеці падпяваюць?

— Мая жонка скончыла політэхнічны інстытут, яна чалавек тэхнічнага складу. Сын Дзімка ў гэтым годзе заканчвае школу, збіраецца паступаць у каледж, дачка Вольга працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы. Самы дарагі для мяне чалавечак — 5-гадовая прыгажуня ўнучка Паліна. Яе назвалі ў гонар маёй маці. Дзяўчынка вельмі таленавітая, хоча займацца адначасова і англійскай мовай, і гімнастыкай, і спевамі. Спадзяюся, у яе ўсё атрымаецца.

— Аляксандр Валянцінавіч, не магу не спытаць: хто ваш любімы музыкант?

— Вельмі люблю глядзець і слухаць Аляксандра Анісімава. Гэта сапраўды дырыжор ад Бога. Акрамя таго, што ты з захапленнем слухаеш музыку, ты трапляеш пад неверагоднае абаянне сапраўднага майстра. Яго багатая міміка, кожны рух, кожны жэст, яго надзвычайная апантанасць заварожваюць. А ўсё разам і нараджае гармонію. Музычнае чарадзейства!..

Таццяна ПАДАЛЯК.

Культасвета

СОЛЬНЫ ПАЛЁТ

10 гадоў таму ўсе напявалі іхнюю «Джулію», «Нелюбімую» ці «Салдата кахання». Цяпер іншыя людзі слухаюць іншыя песні, аднак гучаць яны ўсё з тым жа ўсходнім каларытам і ў выкананні ўсё таго ж папулярнага гурта «A`Studio».

Нават не верыцца, што калектыў нядаўна адзначыў сваё 20-годдзе — узрост музыкаў заўважаеш толькі ў параўнанні з новай салісткай Кэці Тапурыя, з прыходам якой у гурта пачалася новая старонка творчага лёсу. Як «A`Studio» гучыць і выглядае цяпер — публіка пачула і ўбачыла 12 сакавіка на галоўнай канцэртнай пляцоўцы Беларусі, у Палацы Рэспублікі. Падтрымку выступлення (а значыць, і верагодную тэлеверсію) забяспечваў канал MTV. Дзякуючы яму ж гурт летась быў названы лепшым у Расіі.

Дарэчы, мінулым разам — у верасні 2007 года — гурт наведваўся ў Мінск гэтаксама з «падачы» MTV, на цырымонію ўзнагароджання папулярных беларускіх музыкантаў. І тады, паводле слоў лідара калектыву (ён жа нязменны кампазітар і прадзюсар) Байгалі Серкебаева, музыканты засталіся вельмі задаволеныя тым, як іх прынялі беларускія слухачы. «Гэта ўвогуле цудоўна і прыемна, калі выступаеш менавіта ў вялікай зале, а не ў клубе», — адзначыў артыст.

КАРНАВАЛЬНЫ НАСТРОЙ

Яго падарыць сталічнай публіцы шоў-балет «Феерыя», прадставіўшы пастаноўку «Бразільскі карнавал». Відовішчнае танцавальнае шоў з яркімі дэкарацыямі, шыкоўнымі касцюмамі і па-сапраўднаму гарачым настроем адбылося ў Палацы культуры прафсаюзаў.

З моманту ўзнікнення ў 2004 годзе на рахунку «Феерыі» ўжо даволі многа паспяховых выступленняў на самых прэстыжных фестывалях у Беларусі і за межамі краіны — «Славянскім базары ў Віцебску», «Дажынках», чэмпіянаце Беларусі па ўсходніх танцах, на міжнародным фестывалі краін СНД і Балтыі і г.д. Акрамя таго, падтанцоўку, складзеную з «феерычных» артыстаў, можна рэгулярна назіраць у канцэртных нумарах папулярных беларускіх артыстаў — Аляксея Хлястова, Ларысы Грыбалёвай, Улады, Ірыны Ігнацюк, Юліяны, гурта «Тяни-Толкай».

Для праграмы «Беларускі карнавал» калектыў падрыхтаваў своеасаблівы сінтэз культур — нацыянальнай беларускай і лацінаамерыканскай. Страсныя танцы выконваліся не самі па сабе, а ў суправаджэнні «жывога» інструментальнага выканання беларускіх музыкантаў. Дарэчы, гледачы ўжо мелі магчымасць ацаніць шоў-пастаноўку — яна была прадстаўлена пры поўным аншлагу ў Дзяржынску, Смалявічах, Браславе, Беразаўцы, прычым у некаторых месцах калектыў атрымаў паўторныя заяўкі. Таму пасля выступлення ў Мінску шоў-балет «Феерыя» плануе тур па гарадах Беларусі — у папярэднім графіку іх ужо каля 10.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Нататкі мастака

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

МІКОЛА І ПЕСНІ

Любіць ён запісваць і натаваць, фатаграфаваць і замалёўваць. Нікхто з маіх знаёмых не назбіраў столькі розных рознасцяў, колькі змог зафіксаваць Мікола. Адны толькі песні з роднай вёсачкі складаюць больш за пяцьсот адзінак. Герой? Безумоўна. Толькі ляжыць Міколаў збор сваіх і чужых твораў паўмёртвым скарбам. Як той скарб расчараваць і з паўмёртвага зрабіць жывым? Хто ведае? А Мікола працягвае замалёўваць, здымаць, натаваць і запісваць, бо верыць, што прыйдзе наступнік і разграбе-разбярэ ягоныя архівы і адкрые свету... У такі цуд я не веру, бо песні трэба не толькі запісваць, іх трэба спяваць, ды так спяваць, каб цябе слухалі; і тады не трэба пяцьсот, а хопіць і тры песні.

ХАЛАМАЎ І ДУША

Сяргей Халамаў маляваў карціну «Дэмагог» і пісаў таемны трактат пра душу. Ён настойваў на тым, што ў душы няма рота. Я не спрачаўся з Халамавым. Я ведаў — душа спявае.

ЖЭНІК І ФАЛЬШАК

Жэнік купляе і прадае антыкварыят. Якую рэч яму ні пакажы, пра што ні загавары, абавязкова пачуеш: «Фальшак!» Фальшак — ёмістае слова, якое азначае танную падробку. Жэнік так часта і так гучна прамаўляе гэтае шурпаватае слова, што складаецца непрыемнае адчуванне — наш свет суцэльны фальшак, і няма ў ім нічога існага ды сапраўднага. Зразумела, у свеце мастацтва шмат ілюзорнага і віртуальнага, шмат гульняў і ўмоўнасцяў, але сутнасць мастацтва застаецца ў праўдзівасці, у мастакоўскай шчырасці і разумнасці. Мастак тым і адрозніваецца ад гандляра антыкварыятам, што для яго далёка не ўсё навокал з'яўляецца фальшаком.

СВЕТА І РАБАЎНІКІ

Маскоўскія ды мінскія ўладальнікі прыгарадных катэджаў любяць пагаварыць пра напады рабаўнікоў. Апошнім часам банды добра абучаных і прафесійна падрыхтаваных злодзеяў здзяйсняюць напады досыць часта. Бяда. А падзяліцца сваёю бядою з іншымі — справа карысная. Света расказала мне, як на яе падмаскоўны дом налягцелі рабаўнікі. Яны звязалі і збілі ўсіх: Свету, яе дачку і зяця, нават пяцігадовага ўнука не пашкадавалі, абышліся з ім, як з дарослымі. Бандыты забралі з катэджа ўсё, што маглі панесці, пагрузілі нарабаванае на зяцеву машыну і з'ехалі. «Добра, што нікога не забілі!» — самасуцяшалася Света. Сапраўды, маглі б і пазабіваць. А яшчэ ў аповедзе пра напад мяне здзівіла адна дэталь; усе рабаўнікі, звяртаючыся да саўдзельнікаў, называлі іх Вася. Яны ўсе былі Васі. Такі цяпер у рабаўнікоў стыль — васючызм.

ГАЎРЫІЛ І ЦЕМРА

Некалі я вучыўся ў мастака Гаўрыіла зарабляць маляваннем на хлеб. Вывучыўся. Цяпер я паглядзеў на ягоную новую карціну і пабачыў, што ў Гаўрыіла ўсярэдзіне цёмна. Я на карціну глядзеў, а бачыў мастака і бачыў, што ў ягонай свядомасці суцэльная цемрадзь. Як так? Чаму я раней не бачыў той цемры? Раней я вучыўся, я разглядаў паверхню і не заглядаў за яе.

ДАРВІН І ЭВАЛЮЦЫЯ

Мяне не столькі цікавіла сама тэорыя эвалюцыі сэра Дарвіна, колькі момант адкрыцця гэтай тэорыі. Усе ведаюць: як Ньютану падаў на галаву яблык, як Архімед, выскокваючы з ванны, крычаў «эўрыка», як моцна піў Мендзялееў... А Дарвін? Як ён убачыў выпаўзанне рыбіны на бераг і пераўтварэнне трытона ў яшчарку? Загадка. Дарвін штотыдзень наведваўся ў царкву. Мо якраз у царкве ён і сутыкнуўся з азарэннем ды зрабіў адкрыццё? Напрыклад: сэр Дарвін пачуў гісторыю, як Бог скінуў з нябёсаў ганарыстага анёла... Непакорлівы анёл грымнуўся аб глебу, крылы ў яго і паадвальваліся. І аброс анёл поўсцю, і вырас у анёла хвост, і з'явіліся на анёльскай галаве рогі, і стаў анёл чортам. Калі так, тады робіцца зразумелым, чаму царкоўныя людзі так не любяць сэра Дарвіна, бо па ягонай тэорыі чорт стаіць на больш высокай прыступцы эвалюцыйнага развіцця, чым анёл. У анёла крылы, а ў чорта і рогі гладкія, і поўсць калматая, і магутныя капыты.

СЫС І КАНЬЯК

Яму заўсёды было мала выпіўкі. Колькі б яе ні было, а яму не хапала. Яму трэба было мераць выпіўку вёдрамі. І ён мог набыць скрыню каньяку і пераліць яго з бутэлек у вядро, і любавацца гэтым вядром, і піць каньяк з вядра ён мог. Таму і выпіўкі з ім мелі заўсёды нечаканы працяг. Тым разам мы выпівалі ў бары Дома літаратараў. Мы прапілі ўсе мае і ягоныя грошы. Мы пазычылі гарэлкі ў бармэнаў. Бар зачыніўся. Мы апынуліся на вуліцы. «Паедзем да Мятліцкага!» — сказаў Сыс. «Дванаццаць ночы!» — удакладніў я. «Ну і што? У Мятліцкага заўсёды ёсць каньяк!» — «Ноч!» — «Паэты могуць прыйсці да паэта і ў гадзіну ночы, а ў Мятліцкага заўсёды ёсць каньяк. Ён запаслівы...» Мы паехалі праз увесь горад. Мы пабудзілі Мятліцкага. Каньяк у яго сапраўды знайшоўся. Мы пілі каньяк да раніцы. Мятліцкі часам мне нагадваў, як я з Сысам цэлую ноч піў ягоны каньяк. Сумленне мяне зусім не грызла за тую п'яную ноч. Нават калі Анатоль Сыс памёр, і я застаўся адзін, які вінен Мятліцкаму за той каньяк, мяне сумленне не турбавала. Бестурботна я зайшоў у краму, лёгка купіў бутэльку каньяку і занёс Мятліцкаму. Ён распрабаваў быў аднекавацца, але я сказаў: «Паэт паэту можа падараваць бутэльку каньяку? Можа! І не трэба ля-ля...»

АСТАШОНАК І БІБЛІЯТЭКА

Пісьменнік Алесь Асташонак ганарыўся сваёй бібліятэкай. Аднойчы ён мне паказаў уласны і досыць вялікі кнігазбор. Той сапраўды мяне здзівіў, бо ў ім не было ніводнай кнігі, цікавай мне.

ГЁТЭ І ТАЯМНІЦА

«Матэрыял бачыць кожны перад сабою, змест знаходзіць толькі той, хто хоць бы крыху з ім звязаны, а форма застаецца таямніцай для большасці», — фармуляваў Гётэ. Не паверыць вялікаму майстру слова немагчыма; адно крышку засмучае: у гэткім варыянце мастак ніколі не стане на бок большасці.

Адам ГЛОБУС.

Забытае? Новае? Вечнае!

ГОД ЖАЛОБЫ — ГОД АБМЕЖАВАННЯЎ

Алена Сяргееўна з Докшыцкага раёна піша: «Фотаздымкі з абраду пахавання таты, які скончыў жыццё самагубствам, захоўваюцца ў мяне 10 гадоў. Што з імі рабіць цяпер? У нас усе 10 гадоў у хаце няма парадку, зусім звялася гаспадарка. Мая «палавіна» стала сябраваць з гарэлкай. Да таго ж, распачалі будоўлю ў першы год пасля смерці бацькі...» З гэтымі разважаннямі мы вырашылі аб'яднаць пытанне **Таісы Фёдараўны з Салігорскага раёна: «Калі памерлі родныя, якія жылі ў другой хаце, то ці можна цяпер карыстацца іх гаспадарчымі рэчамі (посудам, мэбляй)?»**

Калі мы пачынаем разважаць над адказам на чарговае пытанне нашых чытачоў, то перш за ўсё думаем пра тое, што наўрад ці знойдзецца на Беларусі сям'я, якая не ладзіла б вяселля, не хрысціла дзяцей, не хавала родных або блізкіх людзей. Здавалася б, накоплены велізарны вопыт, які павінен падказваць, раіць, накіроўваць паводзіны людзей у патрэбнае рэчышча. Аднак раз за разам не перастаём здзіўляцца таму, што абавязкова знойдуцца людзі, якія перайначаць, перавернуць векавы вопыт і зробяць нешта па-свойму. А затым просяць рады: дапамажыце зрабіць так, каб і ў нас усё было, як у людзей.

Пачынаючы з гэтай публікацыі, мы будзем спрабаваць падказваць аўтарам лістоў некаторыя методыкі псіхааналізу свайго становішча і прапаноўваць толькі некаторыя крокі «самалячэння». Адной з найбольш распаўсюджаных методык з'яўляецца методыка, асноўная асаблівасць якой сфармулявана ў вядомай прымаўцы: «Радзі мяне, мама, назад!» Сутнасць жа методыкі зводзіцца да наступнага. Цэлы шэраг нашых хваробаў, асабліва хранічных, даволі часта выткам сваім мае дзень нараджэння чалавека. І ніякія медыкаментозныя сродкі не здольны аказаць аздараўленчае ўздзеянне. Тады на дапамогу прыходзяць вопытныя псіхолагі і псіхіятры. Яны ўводзяць пацыента ў гіпнатычны стан і «вяртаюць» не толькі ў дзень яго нараджэння, але і «праводзяць» дзетародным шляхам, г.зн. пераносяць у той час, калі ў эмбрыянальным, зародкавым стане хвароба яшчэ не чапала чалавека.

Менавіта гэта методыка ляжыць у аснове дзейнасці вопытных спецыялістаў у галіне народнай медыцыны. Калі мы ўважліва прыслухаемся да тэкстаў замоў, то выразна ўявім сабе карціну вяртання (перанясення) хворага чалавека ці хатняй жывёліны ў час і месца першатварэння свету, калі на нашай зямлі не было гора, бяды, няшчасцяў, хвароб, зайздрасці: «Устану я рана-раненька, памыюся белым-бяленька, паганю я сваю скаціну, чорна-белую шарсціну, на шырокую даліну, на расу не збітую, на траву не з'етую...»

Тую ж самую методыку выкарыстоўвалі і вопытныя беларускія казачнікі, якія, каб дабіцца неабходнага ўздзеяння і поўнага даверу з боку сваіх слухачоў, «вырывалі» іх з шэрай будзённасці і «пераносілі» ў цудоўна-чарадзейнае «трыдзевятае царства, трыдзесятае гасударства». А заканчвалі свой незвычайны аповед адваротным эмацыянальна-псіхалагічным ходам.

Вось гэту методыку можна паспрабаваць выкарыстоўваць самастойна ў хатніх умовах. **Калі вы зможаце дакладна ўспомніць час і месца «завязкі» праблемы, то тым самым ужо ў значнай ступені дапаможаце самім сабе.**

Нам падалося, што Алена Сяргееўна знаходзіцца на правільным шляху вырашэння свайго праблемнага становішча. Яна не столькі зразумела, колькі пакуль што здагадваецца, што вытокі сваіх сямейных непаразуменняў трэба шукаць у духоўным полі абраду пахавання свайго бацькі. Аднак не валодае дакладнай інфармацыяй аб некаторых рэгламентацыях, якія тычацца паводзінаў людзей і абмежаванняў, звязаных **са стаўленнем да нябожчыка-самагубцы.**

Па-першае, з часоў шырокага распаўсюджання сярод усходнеславянскіх народаў хрысціянства самагубства лічылася вялікім грахом, таму што сканаўшы такім чынам, чалавек парушаў маральна-этычны нарматыў «Бог даў, Бог узяў». Такіх людзей пасля смерці звычайна дыстанцыравалі ад тых, хто памёр «сваёй смерцю». Іх хавалі ці то ў далёкім куце могілак, ці то ўвогуле за тэрыторыяй агульнаабшчыннага кладаўя. Самагубцаў звычайна не адпявалі, на іх магілах не ставілі крыжы, а ўбівалі асінавы кол, таму што лічылі, што такія пасля смерці ператвараюцца ў вампіраў, якія будуць «прыходзіць» ноччу да жывых і наносіць ім шкоду, у тым ліку і іх здароўю.

(Заканчэнне на 7-й стар.)

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насцярэжна чарнобылю
Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
Газета для выканаўцаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
СВАЯ СПРАВА бізнес, эканоміка, фінансы
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! тавары паслугі цэны
Жыранделя Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8800 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 52800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8300 рублёў на месяц 24900 рублёў на квартал 49800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14000 рублёў на месяц 42000 рублёў на квартал 84000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12800 рублёў на месяц 38400 рублёў на квартал 76800 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7460 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 44760 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	6990 рублёў на месяц 20970 рублёў на квартал 41940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	9938 рублёў на месяц 29814 рублёў на квартал 59628 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9431 рубель на месяц 28293 рублі на квартал 56586 рублёў на паўгоддзе

ДРУКАВАНЫЯ І ІНТЭРНЭТ-СМІ: ДЫЯЛОГ АБО КАНФЛІКТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На якой стадыі знаходзіцца вырашэнне пытання аб папулярызацыі міжнароднага спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь-ТБ» у сетках кабельных аператараў у Маскве?

— Па прапанове Міністэрства інфармацыі нядаўна адбыўся візіт у Беларусь дэлегацыі Федэральнай службы па нагляду ў сферы масавых камунікацый, сувязі і аховы культурнай спадчыны Расійскай Федэрацыі на чале з кіраўніком Рассувязьахованакультуры Барысам Баярскавым. Расіяне прыехалі з добрай навіной: прывезлі ліцэнзію на рэгістрацыю «Беларусь-ТБ» на расійскай медыяпрасторы як сродку масавай інфармацыі. Гэты першы крок даўся нялёгка, таму што заканадаўства ў Расійскай Федэрацыі патрабуе выканання зусім іншых умоў: рэгістрацыі юрыдычнай асобы, затым атрыманне ліцэнзіі. Улічваючы міждзяржаўныя дамоўленасці, для Беларусі было зроблена выключэнне, і цяпер «Беларусь-ТБ» афіцыйна існуе на тэрыторыі Расіі як сродак масавай інфармацыі. Гэта значыць прынцыпова іншыя адносіны з боку дзяржорганаў, якія кантралююць распаўсюджванне СМІ. І ў Расіі, і ў Беларусі схема распаўсюджвання СМІ аднолькавая. Кабельныя аператары заключаюць дагаворы з уладальнікамі каналаў, праграм. У адных рэгіёнах за распаўсюджванне канала плата не патрэбная, недзе яна прымальная. За распаўсюджванне «Беларусь-ТБ» у Маскве расійскі бок выстаўляе суму больш як $40 млн, адшукаць яе праблематычна. Шматлікія перагаворы наконт гэтага вядуцца, але пакуль безвынікова.

У сувязі з гэтым па рэкамендацыі маскоўскага ўрада пачалася распрацоўка пад патранатам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы новага міжурадавага пагаднення паміж Беларуссю і Расіяй аб сродках масавай інфармацыі, якое ўстановіць роўныя правілы распаўсюджвання СМІ на тэрыторыі дзвюх дзяржаў. У існуючым міжурадавым дагаворы паміж Масквой і Мінскам, прынятым у 1998 годзе, упамінання аб электронных СМІ няма. На жаль. Гэта была наша недапрацоўка, хоць тады сітуацыя выглядала інакш: Інтэрнэт яшчэ недастаткова развіўся, і спадарожнікавага тэлебачання ў Беларусі не было. Першы варыянт дакумента, які рыхтуецца, думаю, будзе гатовы ў гэтым годзе.

— Міністэрства інфармацыі Беларусі мела намер падрыхтаваць прапановы па змяненню некаторых палажэнняў Дзяржаўнай праграмы ўкаранення лічбавага тэлевізійнага і радыёвяшчання ў Рэспубліцы Беларусь да 2015 года, у прыватнасці, па выкарыстанню часткі сродкаў, што накіроўваюцца на рэалізацыю праграмы, на патанненне вытворчасці прыставак.

— У існуючай праграме няма дакладнай схемы, як зацікавіць спажыўца ў набыцці прыбораў для прыёму лічбавага сігналу. Жыхары вялікіх гарадоў не імкнуцца купляць такое абсталяванне, таму што могуць глядзець некалькі дзесяткаў каналаў, звярнуўшыся да паслуг кабельных аператараў. На першым этапе рэалізацыі праграмы — да 2010 года, у лічбавым фармаце плануецца транслявать толькі восем беларускіх тэлепраграм. На перыферыі ўкараненне лічбавага вяшчання праблемна, паколькі, па-першае, прапануецца малая колькасць тэлепраграм (у многіх раёнах не больш за тры), па-другое, кошт лічбавых прыставак даволі вялікі: айчынная прадукцыя каштуе амаль $100—120 у эквіваленце. Цяпер вядзецца пошук варыянтаў патанненне вытворчасці прыставак. Магчыма датацыя на іх выраб, што знізіць цану для спажыўца. Кітайскія прыстаўкі на рынку таннейшыя, але іх якасць вымушае жадаць лепшага.

— Уладзімір Васільевіч, а на якой стадыі знаходзіцца вырашэнне пытання аб продажы часткі пакета акцый ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа» патэнцыяльнаму інвестару — расійскаму выдавецкаму холдынгу «АСТ Масква»?

— Пазіцыя Міністэрства інфармацыі па гэтым пытанні вядомая. Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа — буйнейшае прадпрыемства рэспублікі, акцыянаванае ў свой час з мэтай прыцягнення інвестара. Гэта прадпрыемства забяспечвала кніжнай прадукцыяй усе заходнія рэгіёны Савецкага Саюза. Перабіраючы нядаўна дамашнюю бібліятэку, я наткнуўся на кнігу Мапасана «Мілы друг», якая была выдадзена на паліграфкамбінаце тыражом 5 млн. У такім аб'ёме тады выдаваліся практычна ўсе кнігі. Сёння ў Беларусі няма патрэбнасці ў такіх вытворчых магутнасцях. Лічыцца, ужо вельмі добра, калі Міністэрства інфармацыі заказвае адно з буйнейшых выдавецтваў «АСТ Масква». Як толькі яно адмовіцца ад паслуг нашага прадпрыемства — застануцца без работы 800 чалавек. Прапанова аб рэалізацыі часткі акцый ААТ ва ўстаноўленым парадку расійскаму інвестару знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Праўда, ужо доўга — 2,5 года.

Канцэрн «АСТ Масква» — патэнцыйны пакупнік, але магчыма з'яўленне і іншых. Забяспечыць паліграфкамбінат беларускімі заказамі нерэальна, робяцца спробы па пошуку іншых заказчыкаў. Задача нялёгкая, паколькі ў Расіі хапае сваіх прадпрыемстваў, якія мадэрнізуюцца лепш, чым беларускія. Выдавецтва «АСТ Масква» ў рэканструкцыю паліграфкамбіната імя Якуба Коласа на першым этапе мае намер укласці прыкладна 7,5 млн еўра.

— Ці ёсць прапановы з боку інвестараў па іншых беларускіх паліграфічных прадпрыемствах?

— Прыцягненне інвестыцый — агульнадзяржаўная задача. У паліграфіі практычна ўсе прадпрыемствы, якія маюць форму адкрытага акцыянернага таварыства, могуць быць у полі зроку пакупніка. ААТ «Чырвоная зорка», ААТ «Палесдрук», ААТ «Баранавіцкая друкарня», прадпрыемствы кнігагандлю — усе ўключаны ў дзяржаўны пералік па рэалізацыі акцый.

— Ці вычарпана праблема зносу газетных кіёскаў на прыпыначных пунктах у сталіцы?

— Такой праблемы няма. Газетныя кіёскі ёсць і будуць. З задавальненнем адзначаю, што важнасць задач, якія вырашаюцца гандлёвымі кропкамі «Саюздруку», разумеюць кіраўнікі мясцовых органаў улады. Больш таго, сетка пашыраецца, а ў гэтым годзе будзе ўкараняцца сістэма аўтаматызацыі ўліку продажаў. У «Магілёўсаюздруку» такі тэрмінал ужо дзейнічае. У стадыі навуковай распрацоўкі знаходзіцца таксама аўтаматызацыя ўліку продажаў не толькі газет, але і ўсяго асартыменту. Галіна дынамічна развіваецца.

— Міністэрства інфармацыі Беларусі неаднаразова агучвала сваю пазіцыю наконт неабходнасці змянення падыходаў да падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. Якія якасныя зменненні адбудуцца ў гэтай галіне са стварэннем Інстытута журналістыкі БДУ?

— Падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі журналісцкіх кадраў трэба ўдзяляць увагу не менш, чым тэхнічнаму ашчэнню галіны. У вучэбным корпусе Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адкрытым 12 лютага, створана зусім новая матэрыяльна-тэхнічная база падрыхтоўкі журналістаў, будуць дзейнічаць эксперыментальныя лабараторыі, майстар-класы, распрацаваны новыя праграмы. Студэнтам прадастаўлены сучасныя ўмовы навучання, а значыць, са сцен навучальнай установы будуць выходзіць высокапрафесійныя спецыялісты.

Раней, калі журналісцкіх кадраў у рэспубліцы не хапала, вялася падрыхтоўка спецыялістаў на базе філалагічных факультэтаў у вышэйшых навучальных установах рэгіёнаў. Гэта было вырашэнне праблемы на нейкі час, і якасна падрыхтаваных кадраў мы, на жаль, не атрымалі. Са стварэннем Інстытута журналістыкі на базе Белдзяржуніверсітэта, вядучай навучальнай установы Беларусі, школа якой прызнана не толькі ў нас, але і ў краінах СНД, прыём абітурыентаў па мэтавым наборы павялічыцца, будуць рыхтавацца кадры, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням.

Міністэрства інфармацыі Беларусі пастаянна прадоўжаць навучальныя семінары для кіраўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Бліжэйшы адбудзецца 20—21 сакавіка ў Паставах. Плануецца, што ў хуткім часе пачнецца падрыхтоўка журналістаў на базе вышэйшай адукацыі, якія спецыялізуюцца па напрамках: эканоміка, міжнародныя адносіны, паліталогія і г.д. Ідзе пастаянны пошук новых формаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў.

Жана КАТЛЯРОВА, БЕЛТА.

Кватэрнае пытанне

Было б жыллё дзяржаўнае...

Я адпрацаваў у сістэме ЖКГ больш за 10 гадоў. Жыву ў ведамаснай 2-пакаёвай кватэры, якую хачу прыватызаваць. Унёс ужо 10 працэнтаў яе кошту, астатнюю суму буду выплачваць на працягу 40 гадоў... Мае бацькі натарыяльна падарылі мне чэкі «Жыллё». Ці можна і іх выкарыстаць для пагашэння запазычанасці?

Н. Н.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» жыллёвая квота (імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё») можа быць залічана толькі пры бязвыплатнай прыватызацыі жылля, якое займаецца па дагавору найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду. Пры гэтым чэкі «Жыллё» не індэксуюцца, бо кошт жылога памяшкання, якое прыватызуецца, вызначаецца ў цэнах на 31 снежня 1991 года.

Што датычыцца прыватызацыі службовага жылля, то пунктам 8 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2007 г. № 128 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення і выкарыстання жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду» ўстаноўлена, што службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду перадаюцца ва ўласнасць на платнай аснове ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» з улікам устаноўленых гэтым указам асаблівасцяў. Так як дадзеным указам не прадугледжана бязвыплатная прыватызацыя службовых жылых памяшканняў, гэта значыць з выкарыстаннем жыллёвай квоты (імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё»), то яе перадача ва ўласнасць павінна адбывацца толькі на платнай аснове за грашовыя сродкі грамадзян. Пры гэтым кошт службовага жылога памяшкання, якое прыватызуецца, вызначаецца па адпаведнай методыцы ў цэнах, дзеючых на дзень падачы заявы аб прыватызацыі жылля. Грамадзяне маюць права аплату кошту гэтых жылых памяшканняў ажыццяўляць у растэрміноўку да 40 гадоў, пры ўмове ўнясення першапачатковага ўзносу ў памеры не менш як 10 працэнтаў кошту.

Віктар САВІЦКІ.

У НЕБЕ ЎСПЫХНУЛА — У ВЁСЦЫ ВЫБУХНУЛА

А палове восьмай вечара ў мінулую сераду вёска Сініцічы скалянулася ад аграмадзнай сілы выбуху. З разетак вырвалася полымя, з электралічыльнікаў выляталі дэталі, тэлевізары згарэлі ў імгненне, у адным з дамоў вылецелі шыбы, замоўклі тэлефоны. А хата Вячаслава Кісляка, у якой выбухнула, развалілася ўшчэнт. Аб гэтым «Звязда» паведаміла ва ўчарашнім нумары. Сказаць, што людзі спалохаліся, значыць нічога не сказаць. Яны падумалі, што вайна або канец свету. Але на вуліцы ўбачылі толькі адзін разбураны дом.

Як сказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік Камянецкага райаддзела МНС Уладзімір Іванюковіч, дом грамадзяніна Кісляка аднавіць нельга, пабудова разбурана поўнасцю. Гаспадара выратаваў цуд. У момант выбуху ён ляжаў на ложку каля сцяны, супрацьлеглай той, якую вынесла выбуховай хваляй. Бэлька перакрыцця, якая абрынулася, засела за паўметра над галавой чалавека. Што гэта было — шаравая маланка ці што іншае — будуць высвятляць спецыялісты з брэсцкіх і мінскіх навуковых арганізацый, якія прыбудуць на месца здарэння ў суботу. 12 сакавіка вогненны шар у небе ў раёне Камянца бачылі многія. Калегі начальніка райаддзела МНС вярталіся ў той дзень з Брэста, яшчэ за 60 кіламетраў да Камянца прыкладна ў 19.20 яны заўважылі ў небе ўспышку акурат недзе над сваім горадам, бачылі незвычайны вогненны выбух і жыхары райцэнтра. Сініцічы знаходзяцца прыкладна за 15 кіламетраў ад горада. Цяпер падача электрычнасці ў вёсцы адноўлена, жыхары паступова адыходзяць ад перажытага.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

15 сакавіка — Сусветны дзень абароны спажыўцоў

«СМАЧНЫЯ ШКОДНАСЦІ»

Структура харчавання беларусаў мае моцна выражаны вугляводны ўхіл

«Пакаленне нездаровага харчавання» — менавіта гэтай тэме прысвечаны сёлетні Сусветны дзень абароны спажыўцоў. Беларуская спажывецкая грамадскасць вырашыла пашырыць рамкі гэтай праблемы і правесці Дзень спажыўцоў пад дэвізам «Здаровае харчаванне — твой выбар, спажывец».

Агульнавядома, што колькасць і якасць спажытых прадуктаў харчавання вызначаюць здароўе і працягласць жыцця чалавека. На жаль, але сучасныя традыцыі ў галіне харчавання ўмацаванню нашага здароўя дакладна не спрыяюць. У спіс хвароб, якія непасрэдна ці ўскосна звязаны з нашым харчаваннем, уваходзяць ішэмічная хвароба сэрца, інсульт, дыябет, захворванні страўнікава-кішачнага тракта, злаякасныя новаўтварэнні (рак страўніка, тоўстай, прамой кішкі, прастаты, малочнай залозы), атлусценне і многія іншыя. Існуе таксама гіпотэза, што нават хвароба Альцгеймера таксама нейкім чынам звязана з лішняй вагой цела.

Беларускія медыкі даўно б'юць трывогу: структура харчавання беларусаў мае моцна выражаны вугляводны ўхіл. Дастаткова сказаць, што кожны сяроднестатыстычны беларус спажывае ў дзень да 500 грамаў бульбы, якая змяшчае сутачную дозу цукру. Акрамя таго на працягу дня мы п'ём з цукрам чай і каву, ласуемся варэннем, спажываем пірожныя і пячэнне, запіваем іх газіроўкай, якая таксама змяшчае «ўдарныя» дозы цукру. Рост колькасці дыябетычных хворых у Беларусі — гэта расплата за наша з вамі «салодкае жыццё». Сярод малочных прадуктаў, што спажываюць беларусы, пераважаюць тлустая смятана, масла і тлустае малако, а вось багатыя на лёгказасваяльны кальцый сыры, творог і карысныя ва ўсіх сэнсах кісламалочныя прадукты мы чамусьці ігнаруем.

На самай справе здаровае харчаванне — гэта сума трох складнікаў: эканамічныя магчымасці, асартымент якасных і бяспечных прадуктаў харчавання і адукаванасць насельніцтва ў пытаннях харчавання. На Захадзе, дзе здароўе мае найвышэйшую каштоўнасць, усе літаральна «звяр'яцелі» на «здаровай ежы»: у буйных супермаркетах пад «здаровыя» прадукты адводзяцца спецыяльныя аддзелы. У Германіі і Аўстрыі прыняты нацыянальныя праграмы па павелічэнні вытворчасці біяпрадуктаў. Функцыянальнае харчаванне або харчаванне з рэгулярным ужываннем прадуктаў, здольных аказваць на арганізм рэгулюючае ці аднаўленчае дзеянне, аб'яўлена там адным з прыярытэтных спосабаў паляпшэння якасці жыцця насельніцтва. Французы называюць біяпрадукты вельмі рамантычна — «смакам жыцця».

З нядаўняга часу «смак жыцця» змаглі паспытаць і беларусы: на беларускім рынку адзін за другім пачалі з'яўляцца прадукты функцыянальнага прызначэння. Прадпрыемствы па перапрацоўцы малака выпускаюць сёння цэлы спектр малочнакіслых прадуктаў, узбагачаных лактулозай, біфідабактэрыямі, ацыдафільнымі бактэрыямі, кальцыем, ёдам, комплексам з 12 вітамінаў. Прадпрыемствы па вытворчасці хлебабулачных вырабаў распрацавалі карысныя гатункі хлеба з зерневымі дабаўкамі, узбагачаныя жалезам, вітамінам С і фоліевай кіслатой, гатункі хлеба з прарошчаным зернем пшаніцы, клятчаткай і г.д. Прадпрыемствы безалкагольнай прамысловасці — напіткі, узбагачаныя пекцінам, вітамінамі С, РР, групы В і мікраэлементамі.

На думку намесніка генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірыны Кандратавай, індустрыя прадуктаў функцыянальнага прызначэння самая перспектыўная, паколькі яна ў найбольшай ступені адпавядае запытам спажыўцоў. На сёння прадукты функцыянальнага прызначэння займаюць на розных рынках ад 1 да 5 працэнтаў, але па прагнозах сусветных аналітыкаў праз 15 гадоў доля «здаровых прадуктаў» будзе складаць у агульных аб'ёмах продажу ўжо да 30 працэнтаў. Навукова-практычны цэнтр па харчаванні з'яўляецца ў нашай краіне флагманам у стварэнні «здаровых прадуктаў». Распрацоўкі прадуктаў функцыянальнага прызначэння вядуцца па розных накірунках: гэта прадукты, прызначаныя для дзіцячага харчавання, для цяжарных жанчын, для людзей немаладога ўзросту.

Ёсць яшчэ адзін накірунак, па якім збіраецца развівацца далей айчыннае «здаровае харчаванне» — гэта распрацоўка і ўкараненне на вытворчасці ашчадных тэхналогій і новых рэжымаў стэрылізацыі з мэтай максімальнага захавання ў канчатковым прадукце яго карысных уласцівасцяў. Агульнавядома, што вітаміны і мікраэлементы, нават той жа ёд, не вельмі «паважаюць» тэрмічную апрацоўку, а рафінаваныя прадукты ўвогуле не прыносяць карысці чалавеку. Як зрабіць прадукт карысным і адначасова не страціць звычны для пакупніка смак — задача, прама скажам, не з лёгкіх. Вытворцы жартуюць, што калі б яны ўзбагачалі хлеб усім, што ім прапануюць, то ён ужо дакладна страціў бы свой смак.

На Захадзе ўсё часцей набыткам галоснасці становяцца даследаванні, якія ставяць пад пытанне той ці іншы вельмі папулярны прадукт. Скажам, у ЗША сімвалы амерыканскага жыцця — «пепсі-кола» і кока-кола — былі аб'яўлены аднымі з галоўных ворагаў падрастаючага пакалення. Перыядычна ў цэнтры скандалаў аказваецца і добра вядомы «Макдональдс», які аматары фаст-фуду абвінавачваюць у сваім атлусценні. У перакладзе з англійскай мовы «фаст-фуд» азначае «хуткае харчаванне», таму да фаст-фуду з поўным правам можна аднесці не толькі гамбургеры, біг-макі, сандвічы, піцу, але і хот-догі, чабурэкі, сасіскі ў цесце, гарачыя беляшы, піражкі, смажні, што прадаюцца ў нас літаральна на кожным кроку. У буйных гарадах да фаст-фуду вымушаны звярнацца амаль усе іх жыхары, паколькі гэта не толькі самы танны, але і самы зручны спосаб падсілкавацца. Як правіла хуткае насычэнне дасягаецца за кошт рэкордналй колькасці спажытых за адзін раз калорый. Звычайна кліентам прапануецца спалучэнне цеста і мяса (булкі ці сасіскі ў разагрэтым стане). Трэба заўважыць, што дыетолагі ўвогуле не раяць спажываць гарачы хлеб. Плюс на гарачы бутэрброд выліваюцца кетчуп, гарчыца, маянэз, а гэта ўжо не проста калорыі, а тлушчы, якія дрэнна засвойваюцца арганізмам і дзякуючы якім залішнія калорыі пераўтвараюцца ў тлушчавыя адклады. Пры гэтым кока-кола ці піва, якімі запіваецца абед, толькі паскараюць працэс «абрастання» лішнім тлушчам.

У Вялікабрытаніі шкодныя прадукты, якія змяшчаюць вялікую колькасць тлушчаў, цукру, солі і шмат харчовых дабавак накшталт глутамату натрыю (узмацняльнік смаку Е 621) і фарбавальнікаў, называюць «смеццевай ежай». Такія прадукты надзвычай папулярныя і ў вытворцаў, і ў спажыўцоў. Бо іх вытворчасць не патрабуе асаблівых намаганняў. Яны лёгка гатуюцца і маюць працяглыя тэрміны захоўвання. У 2006 годзе ў Вялікабрытаніі разгарнулася кампанія па інфармаванню аб пагрозах, якія ўтрымліваюць «смачныя шкоднасці». Пік «вайны» прыйшоўся на 1 красавіка 2007 года, калі Агенцтва па харчовых стандартах апублікавала на афіцыйным сайце паведамленне аб забароне на тэлевізійную рэкламу шкодных прадуктаў у дзіцячых праграмах. А са студзеня 2008 года пачала дзейнічаць забарона на тэлевізійную рэкламу нездаровай ежы і падчас трансляцыі тэлепраграм для падлеткаў да 16 гадоў: размова ідзе аб рэкламе чыпсаў, арэхава-шакаладных батончыкаў, сухіх закусак і іншай ежы з высокім утрыманнем тлушчаў, цукру і солі. Прапановы абмежаваць рэкламу нездаровай ежы пастаянна гучаць у розных краінах свету. Тэлебачанне з'яўляецца для падрастаючага пакалення адной з асноўных крыніц інфармацыі. Напрыклад у Брытаніі дзеці глядзяць на працягу года каля 10 тысяч рэкламных роліка, і да 10 гадоў пазнаюць ужо да 400 брэндаў.

Між іншым, даследаванне, якое праводзілася групай псіхолагаў на працягу 18 месяцаў, устанавіла, што дзеці да 8 гадоў увогуле не разумеюць карыслівых намераў аўтараў рэкламных роліка. Яны не здольны вызначыць, што ў рэкламе з'яўляецца перабольшаннем, якое не стасуецца з рэальным жыццём. Якраз па прычыне высокай унушальнасці дзяцей адзіна правільным рашэннем, на думку псіхолагаў, была б поўная забарона ўсёй рэкламы, што «атакуе» дзіцячае насельніцтва.

У Беларусі пакуль пытанне так жорстка не ставіцца. Загадчык аддзела гігіены харчавання РНПЦ гігіены Васіль Цыганкоў, напрыклад, прытрымліваецца той думкі, што не толькі рэклама, але, у першую чаргу, бацькі фарміруюць у дзяцей шкодныя звычкі.

— Я лічу, што нельга адназначна сцвярджаць, што той ці іншы прадукт, шкодны. Калі ён шкодны, то чаму ў такім разе дапушчаны да продажу? На мой погляд, любы прадукт можа прынесці шкоду пры злоўжыванні, — падкрэсліў спецыяліст. — Так, напрыклад, адна з'едзеная ўпакоўка чыпсаў сур'ёзнай шкоды вам не прынясе. Калі, вядома ж, чыпсы не замяняюць вам рэгулярна паўнавартаснае харчаванне. А камусьці, напрыклад, можа нашкодзіць 25-працэнтная смятана, асабліва калі з'есці яе кілаграм. Усё вельмі індывідуальна. І нават калі аднесці ад школы кіёск са шкоднымі прадуктамі на адлегласць у паўкіламетра, то наўрад ці для дзяцей гэта будзе сур'ёзнай перашкодай. Мы спрабуем у сценах школ змагацца з рознымі варыянтамі фаст-фуду, мы забаранілі ў школах продаж чыпсаў, газіровак, жавальных гумак, але прывіваць дзецям культуру харчавання трэба таксама ў сям'і, і не замяняць кашу або суп булкай, з каўбасой ці сасіскай.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

POST factum

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ЛІТВЫ АШТРАФАВАНЫ НА 290 ЕЎРА

Кіраўнік урада Літвы Гедымінас Кіркілас аштрафаваны на 290 еўра за курэнне ў кавярні. Штраф прызначаны Дзяржаўнай службай па кантролі за алкаголем і тытунем.

Як высвятлілася, Г. Кіркілас парушыў закон у кампаніі свайго латышскага калегі Івара Годманіса ў адной з кавярні Клайпеды. Прэм'ер-міністр літоўскага ўрада закурыў трубку, папярэдне спытаўшы дазволу ў гаспадара кавярні, паведамляе мясцовае радыё.

Аднак курца «здалі» мясцовыя журналісты, якія не замарудзілі расказаць аб факце парушэння прэм'ерам дзеючай у Літве забароны на курэнне ў грамадскіх месцах. Варта адзначыць, што Г. Кіркілас, не спрачаючыся, паабяцаў заплаціць штраф. Дзяржаўная служба па кантролі не стала сур'ёзна караць кіраўніка свайго ўрада, накіраваўшы яму паведамленне аб мінімальным пакаранні.

З расійскіх палітыкаў з еўрапейскімі забаронамі на курэнне ў грамадскіх месцах адным з першых сутыкнуўся кіраўнік МЗС Сяргей Лаўроў. З'яўляючыся заўзятым курцом, ён паспрабаваў падыміць у адным дублінскім рэстаране. Парушэнне забароны каштавала яму штрафу ў 3 тысячы еўра. Зрэшты, кіраўнік замежнапалітычнага ведамства Расіі, які расказаў аб гэтай гісторыі журналістам, так і не паведаміў, ці заплаціў ён у выніку гэты штраф.

КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ФОТА БУЛЬБЫ

Аматары бульбы, якія пры гэтым захапляюцца фатаграфіяй, могуць узяць удзел у новым сусветным конкурсе, аб правядзенні якога абвясціла Арганізацыя па харчаванні і сельскай гаспадарцы пры ААН. Як перадае брытанскі тэлеканал SkyNews, пераможцам конкурсу стане аўтар лепшага здымка з малюнкам звычайнай бульбачкі.

Конкурс задуманы па прычыне наступіўшага Міжнароднага года бульбы. Тут няма ніякіх абмежаванняў: на прадстаўленых фота можа быць адлюстравана як сырая бульба, так і вараная, смажаная, бульба фры і нават пюрэ. Вітаюцца таксама здымкі, якія прадстаўляюць працэс культывавання гародніны, яе апрацоўкі, продажу і маркетынгу.

«Фатографы, прафесіяналы і аматары, якія будуць вывучаць бульбу, знойдуць пры гэтым для сябе шмат новага, цікавага матэрыялу», — сцвярджае член арганізацыі Нэбамбі Луталадыё.

Нягледзячы на тое, што аб'ект фатаграфавання здаецца смешным, несур'ёзным, мэта конкурсу мае даволі важнае значэнне — паказаць значнасць і карыснасць бульбы як прадукту жыхарам краін, якія развіваюцца, а таксама яе ключавы ўклад у развіццё сельскай гаспадаркі, эканомікі і сусветнае харчовае забеспячэнне. Як лічаць спецыялісты, па аб'ёме сусветнай харчовай вытворчасці бульба стаіць на чацвёртым месцы пасля рысу, пшаніцы і кукурузы.

Абвешчаны конкурс складаецца з некалькіх намінацый. У кожнай з іх будзе абрана трое пераможцаў, якія, акрамя грашовага прыза, атрымаюць у падарунак прафесійны фотаапарат.

ПЕСНІ ДЛЯ САБАК — ХІТЫ Ў НОВАЙ ЗЕЛАНДЫІ

У Новай Зеландыі стаў хітом дыск з песнямі, якія чуюць толькі сабакі.

Дыск пад назвай «Ціхая-ціхая ноч» быў запісаны новазеландскім Таварыствам абароны жывёл. Ён на некалькі тыдняў стаў адным з самых папулярных і прадаваемых у краіне. Даходы ад яго продажу ідуць на дабрачынныя мэты для абароны жывёл. Прадстаўнік таварыства прызнаўся, што спецыялісты не ведаюць, як запіс, зроблены на частотах, недаступных для вуха чалавека, гучыць для сабак. Паводле яго слоў, рэакцыя жывёл была самай рознай. «Адзін сабака нават напаў на прайгравальнік, калі гучала гэтая музыка. Іншыя, наадварот, кляліся і нічога не рабілі», — расказвае ён.

Цяпер новазеландскае таварыства збіраецца пачаць продаж дыска, які ўжо сабраў каля 30 тысяч доларaў, у ЗША і Аўстраліі.

ПОШТА ПЕРАСЫЛАЛА ПАШТОЎКУ 80 ГАДОЎ

Віншавальная паштоўка ў ЗША была дастаўлена свайму адрасату праз 79 гадоў. Паштоўку з адзіным словам «Віншую!» нейкай «міс Маргарэт Макдоналд» адправілі з Елоўстонскага нацыянальнага парка ў Бостан. Імя таго, хто яе адправіў, невядома.



Амерыканец, у чыю паштовую скрынку прыйшла паштоўка, датаваная чэрвенем 1929 года, быў нямала гэтым здзіўлены. Ён пацвердзіў, што калісьці па гэтым адрасе сапраўды жыла сям'яў Макдоналдаў, але пра яе даўно нічога не чуваць.

Прадстаўнікі пошты ЗША не змаглі растлумачыць, чаму ёй спатрэбілася так многа гадоў, каб даставіць паштоўку па адрасе.

Дарэчы, цяпер можна сказаць, што ўжо афіцыйна падлічана, колькі часу ідзе да атрымальніка пісьмо, пасланае звычайнай поштай. Прынамсі, такія даныя можна прымяніць да Польшчы, бо падлікі зрабіў адзін паляк, які зацікавіўся, з чым можна параўнаць хуткасць дастаўкі пошты ў яго краіне. Міхал Шчыбальскі, які працуе ў сферы інфармацыйных тэхналогій, атрымаў пісьмо 3 студзеня, а паслана яно было яму 20 снежня. Загарэўшыся цікаўнасцю, ён узяўся за калькулятар і высветліў, што з дастаўкай паслання хутчэй бы справіўся звычайны смоўж.

Згодна з падлікамі паляка, пісьмо ляцела да яго 294 гадзіны, а адлегласць паміж ім і адрасатам складае 11 кіламетраў. Улічыўшы ўсё гэта, пан Шчыбальскі разлічыў, што хуткасць пісьма была 0,037 км/г, што яго і ўразіла, бо вядома, што хуткасць перамяшчэння садовага смаўжа складае 0,048 кіламетра ў гадзіну.

КАРОТКІ СЭКС — ЖАНОЧАЕ ШЧАСЦЕ

Аўстралійскія навукоўцы ўстанавілі: ідэальны сэкс павінен доўжыцца не больш як 7 хвілін. Нішняя ж планка працягласці самага лепшага палавога акту, паводле меркавання даследчыкаў, — 3 хвіліны, паведамляе газета The Australian.

У якасці рэспандэнтаў выступілі жыхары ЗША і Канады. Сэксуальны кантакт, які доўжыцца 3—7 хвілін, яны назвалі «нармальным», усё, што менш, — «занадта кароткім», а сэкс працягласцю больш як 13 хвілін — «занадта доўгім». Аўстралійскі сэксолаг, каментуючы вынікі гэтага даследавання, адзначыў, што мужчыны аддаюць перавагу больш працягламу сэксу. А вось жанчыны, паводле яго слоў, наадварот, жадаюць, каб палавы акт скончыўся хутчэй.

Даследаванне, апублікаванае ў міжнародным «Часопісе сэксуальнай медыцыны», мела адну мэту — развеяць пашыраны міф аб тым, што здаровы сэкс павінен доўжыцца вельмі доўга. Аўтар даследавання Эрык Корці заявіў, што падобныя выказванні з'яўляюцца прычынай «расчаравання і незадаволенасці». «У фантазіях аб ідэальнай мужчынскай сэксуальнасці сцвярджаецца, што мужчыны здольныя займацца сэксам усю ноч напралёт», — кажа ён. — Вынік гэтага даследавання — стварэнне рэалістычнай мадэлі сэксуальнасці, якая дапаможа людзям з рознымі сэксуальнымі праблемамі і дысфункцыямі, а ў далейшай перспектыве, як мы спадзяёмся, яна дапаможа прадухіліць узнікненне гэтых праблем», — заявіў Корці.

СОН РОБІЦЬ БАГАТЫМ

Галандскі студэнт вынайшаў новы спосаб заробку: менш чым за месяц ён атрымаў амаль 10 тыс. доларaў, лежачы ў пасцелі. 22-гадовы Ідэ ван Дзютэкам з горада Цойтэрміра ўстанавіў у сваім пакоі вэб-камеру, якая транслюе на ўвесь Інтэрнэт, як ён валяецца ў ложку. За 21 працоўны дзень на Дзютэкама прыйшлі праглядзець 491 703 чалавекі.

Так ён праводзіць час ужо тры тыдні, зрэдку перарываючыся толькі для таго, каб прыняць душ і прыгатаваць якую-небудзь ежу. Побач з відэа запушчаны міні-чат, у якім можна абгаварыць дзеянні Дзютэкама. Больш на рэсурсе www.slapendrijk.nl нама нічога.

Вольнае месца студэнт пусціў пад рэкламу. Ён прадае яго ўладальнікам Інтэрнэт-казіно, турыстычным фірмам, крамам лічбавай тэхнікі. Месца на сцяне за ложкам, якую відаць у кадры, малады галандзец таксама прадаў — цяпер там вісіць расцяжка з рэкламай аднаго сайта азартных гульняў. За размешчаныя рэкламныя аб'явы ён ужо атрымаў каля $10 тыс. Кожны зароблены цэнт адлюстроўваецца на он-лайн-лічыльніку, усталяваным на сайце. Акрамя таго, Дзютэкам прапаноўвае маркетолагам магчымасць за асобную суму стаць іх кампаніям спонсарамі яго ноўтбука або ложка.

«Сон — гэтае маё хобі і адзіная рэч, якую я добра ўмею рабіць, — тлумачыць наведвальнікам сайта студэнт. — Усе мяне пытаюць, чым я наогул у жыцці збіраюся займацца, а мне на самай справе хочацца толькі спаць. Так што я застануся ў ложку, пакуль не разбагацею».

ГОРАД САМАЗАБОЙЦАЎ

За 14 месяцаў у валійскім мястэчку павесілася амаль два дзесяткі маладых людзей

У Вялікабрытаніі ў невялікім валійскім горадзе Брыджэнд (Bridgend) 19 лютага было знойдзена цела 16-гадовай дзяўчыны, якая павесілася на дрэве за паўмілі ад свайго дома. За 14 месяцаў гэта ўжо 17-е самагубства жыхара гэтага горада. Усяго ў Брыджэндзе, які ўжо назвалі «горадам самазабойцаў», жыве 40 тысяч чалавек.

Першым у студзені 2007 года на закінутым складзе павесіўся 18-гадовы Дэйл Крол. Потым добраахвотна пайшлі з жыцця некаторыя яго сябры і аднакласнікі. Акрамя таго, адзначаліся няўдалыя спробы самагубстваў сярод сяброў ахвяраў. Затым рушыла новая хваля самагубстваў маладых жыхароў горада. Узрост загінулых вагаецца паміж 15 і 27 гадамі.

Першапачаткова ў следчых з'явіліся падазрэнні, што «клуб самазабойцаў» утварыўся ў Інтэрнэце на базе сацыяльнай сеткі Bebo, бо шматлікія загінулыя былі зарэгістраваныя там. Аднак пазней паліцыя абвясціла, што якой-небудзь «культавай, крымінальнай або Інтэрнэт-сувязі» паміж ахвярамі няма. На апошняй прэс-канферэ

«БУДПРАЕКТ» СТВАРАЕ БУДЫНКІ, У ЯКІХ ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

ЗАТ «Будпраект» у Маладзечне — гэта праектная арганізацыя, якая не проста выжыла ў складаныя часы, калі шмат падобных закрывалася, захавала спецыялістаў, веды, заняла сваю нішу ў эканоміцы краіны, лічыцца адной з самых надзейных і паспяхова развіваецца. Яна валодае больш важным і рэдкім. Галоўнае тут — паважлівыя і нават сардэчныя адносіны да людзей, для якіх праектуюцца будынкі.

Ёсць меркаванне, што прыгажосць, якую мы бачым вакол сябе, — толькі адлюстраванне нябачнага нябеснага саду. Філосафы кажуць, што калі чалавек нешта стварае, то імкнецца наблізіцца да ідэалу, пра які здагадваецца, назіраючы за гармоніяй прыроды. Так на зямлі з'яўляюцца творы мастацтва і кавалачкі зробленага рукамі раю: прыгожыя дамы, вуліцы і гарады. І як з'яўленне кожнага чалавека на гэтай зямлі — вялікая таямніца, так, напэўна, і кожны дом, дарога, храм таямніча, невытлумачальна ўзнікаюць спачатку ў выглядзе ідэі. А потым адбываецца самае дзіўнае: людзі, звычайныя, простыя, гэтую ідэю, фантом, прыстасоўваюць да нашага зямнога жыцця. Гэтыя людзі, якія здольныя ўмясціць у сабе адначасова мастака і інжынера, паэта і матэматыка, казачніка і практыка, называюцца архітэктарамі і праекціроўшчыкамі. Зразумець сакрэт іх работы няпроста. Можна толькі адчуць атмасферу стварэння, у якой яны працуюць. Ну і, што самае цудоўнае, дакрануцца рукамі да таго, што ў выніку атрымаецца. Самі яны лічаць, што галоўнае — каб сярод таго, што створана па іх малюнках і разліках, было шчаслива жыць.

Вясковыя домікі ў Валожынскім раёне.

Гісторыя закрытага акцыянернага таварыства «Будпраект» налічвае сорак гадоў. З таго моманту, калі ў 1968 годзе ў Маладзечне была арганізавана праектна-канструктарская майстэрня Мінскага аблсельбуда. Прадпрыемства неаднаразова мяняла сваё падпарадкаванне. Яно ўваходзіла то ў рэспубліканкі інстытут, то ў абласны. Перабудовачныя часы для будаўнічай галіны ўвогуле, для праекціроўшчыкаў у асаблівасці, аказаліся надзвычай цяжкімі. У 1993 годзе Праектна-пошукавы інстытут па сельскім будаўніцтве «Мінсксельбудпраект» вырашыў закрыць сваю майстэрню ў Маладзечне, бо не ў стане быў яе ўтрымліваць.

— На той час мы якраз завяршылі будаўніцтва 7-павярховага адміністрацыйнага корпуса, — узгадвае **дырэктар ЗАТ «Будпраект» Вольга ВЯЛІЧКА**. — Я працавала тады галоўным інжынерам праектаў. Напэўна, гэты новенькі будынак, які так цяжка нам дастаўся (мы будавалі яго за свае сродкі), і не дазволіў «скласці лапкі».

Каб выжыць, яны вырашылі збіць з малака смятану. «Скасавалі шлюб» з Мінскбудпраектам, выкупілі акцыі і сталі самі набіраць заказы. Якіх не было... Падчас буму ўтварэння прыватных прадпрыемстваў вялізная колькасць праектаў рабілася «на паліцу». Не было з каго спытаць аплату: заказчыкі «не дажывалі» да завяршэння работы праекціроўшчыкаў. Не было аб'ектаў, не было грошай, арганізацыі разлічваліся вэксалямі, заробкі былі па... 5 долараў. Жылі за кошт арэнды памяшканняў. Было такое, што ацяпленне адключалі за няўплату. За шэсць гадоў змянілася пяць дырэктараў, моладзь амаль уся сышла, на выхадзе з крызісу ў калектыве засталося 40 чалавек — самыя стойкія. Цяпер гэтыя людзі — аснова прадпрыемства, дзякуючы ім былі захаваны вопыт і веды, без якіх ні галіна, ні краіна не падняліся б так хутка.

Сёння ЗАТ «Будпраект» зарэкамендавала сябе на будаўнічым рынку краіны як надзейная арганізацыя. Тут праектуецца Нацыянальны парк «Нарачанскі», карпусы санаторыяў «Прыазёрны», «Сосны»... На працягу 20 гадоў «Будпраект» супрацоўнічае з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны: мае дачыненне да ўсіх аб'ектаў, якія падпарадкоўваюцца абласному камітэту. Чэрвеньскі дом-інтэрнат для дзяцей з адхіленнямі ў псіхафізічным развіцці быў запраектаваны тут з «нуля»: тры жылыя карпусы, актавая зала, басейн, адміністрацыйны будынак, медблок. На месцы былых канюшняў атрымаўся вялікі, прыгожы і зручны комплекс. Усе будынкі яго злучаныя галерэямі, каб у непагадзь малым нішто не перашкаджала трапіць у любое памяшканне. Гэта рэспубліканскі аб'ект, пабудаваны па праграме «Дзеці Беларусі». Па той жа праграме ў Маладзечне быў запраектаваны і сучасны медблок Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнага апарата. Тут быў зроблены праект Свірскага дома-інтэрната, праект рэканструкцыі Мікалаеўшчынскага дома-інтэрната, які нядаўна ўрачыста адкрываў губернатар вобласці.

ЗАТ «Будпраект» робіць аб'екты і для Міністэрства аховы здароўя: паліклініку на вуліцы Платонава ў Мінску, дзіцячую бальніцу ў Маладзечне, рэканструкцыю хірургічных комплексаў у Смаргоні і Валожыне.

Гэта праектная арганізацыя адна з першых пачала працаваць па Указу Прэзідэнта № 98 «Аб дадатковых мерах па развіцці жыллёвага будаўніцтва на сяле». Яна абслугоўвае чатыры раёны: Мядзельскі, Валожынскі, Вілейскі і Маладзечанскі. Лагойскі і Дзяржынскі таксама імкнуцца супрацоўнічаць з праекціроўшчыкамі з Маладзечна. Апошнія два гады ў сяміпавярховым будынку на вуліцы Галіцкага ў Маладзечне праектуюцца малочнатаварныя фермы і жывёлагадоўчыя комплексы. Пастаяннымі заказчыкамі «Будпраекта» з'яўляюцца Упраўленні капітальным будаўніцтвам, жыллёвыя кааператывы.

Дырэктар ЗАТ «Будпраект» Вольга ВЯЛІЧКА.

Арганізацыя мае ліцэнзію на распрацоўку праектнай дакументацыі для будаўніцтва жылля, грамадскіх, вытворчых, сельскагаспадарчых будынкаў, аб'ектаў транспартнага прызначэння і гідратэхнічных збудаванняў, а таксама газаправодаў, інжынерных сетак, дарог і вуліц.

— Цяпер супрацоўнічаем з расійскай фірмай «Август-Бел» — праектуем буйны завод па вытворчасці сродкаў аховы раслін у Пухавічскім раёне, — расказвае дырэктар. — Архітэктурны праект вельмі цікавы — у рэспубліцы такі робіцца ўпершыню, ён ужо знаходзіцца на экспертызе.

Галоўная якасць, якой павінна валодаць праектная арганізацыя, каб зарэкамендаваць сябе на рынку, — гэта абавязковасць, лічыць Вольга Вялічка. Гэта значыць, завяршэнне падрыхтоўкі праектнай дакументацыі ў агавораныя тэрміны. Не менш важна — якасць.

— Мы нясём адказнасць за ўсе свае праекты, — тлумачыць дырэктар. — У нашым архіве захаваны дакументы на ўсё, што мы рабілі на працягу 40 гадоў. Па любым будынку можна падняць дакументацыю і паглядзець, як і што там было закладзена, усе разлікі, геалогію... Гэта дапамагае ў рэканструкцыях, расследаванні надзвычайных здарэнняў. Сведчыць, што нам можна давяраць.

Сёння моладзь зноў з ахвотай уладкоўваецца ў праектныя арганізацыі. Асноўны пастаўшчык кадраў «Будпраекта» — Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Гэта — архітэктары, канструктары, супрацоўнікі санітарна-тэхнічнага аддзела, аддзела ацяплення, вентыляцыі і газазабеспячэння. Усе спецыялісты — з вышэйшай адукацыяй. Тэхнолагі і геадэзісты прыходзяць з Беларускага агратэхнічнага ўніверсітэта і Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.

— Моладзь сёння прыходзіць таленавітая, добра падрыхтаваная і мэтанакіраваная, — кажа Вольга Вялічка. — Яна можа працаваць. У нас атрымаўся разрыў у пакаленнях. Няма сярэдняга звяна, яно пайшло ў 90-х на «вольны хлеб». Сёння ў арганізацыі працуе «старая гвардыя»— тыя, каму каля 50, і ўчарашнія выпускнікі. Наш заўтрашні дзень залежыць ад таго, наколькі моладзь спрацуецца з вопытнымі спецыялістамі, наколькі ўдасца гэты разрыў у пакаленнях кампенсаваць за 4—5 гадоў, што засталіся старэйшаму пакаленню да пенсіі. Добра, што ёсць каму ўсё перадаць. Мы працуем інтэнсіўна і плённа. Сённяшняя моладзь ведае камп'ютар. Без гэтага мы таксама б далёка не пайшлі.

Моладзь ва ўсе часы ідзе туды, дзе добрыя заробкі, умовы працы і ёсць перспектыва. Сярэдні заробак у ААТ «Будпраект» — 1 млн 600 тыс. рублёў, і сёння колькасць ахвотнікаў уладкавацца сюды перавышае колькасць вакансій. Па-ранейшаму не хапае толькі канструктараў — пасля ВНУ іх забіраюць будоўлі.

— Мы забяспечваем маладых спецыялістаў інтэрнатам альбо аплачваем арэнду кватэры, пакуль яны не пабудуюцца, — расказвае Вольга Вялічка. — Прапануем добры сацыяльны пакет. Раз у месяц усе нашы супрацоўнікі маюць адзін свабодны ад працы дзень.

Аплачваем аздараўленне дзяцей, санаторныя пуцёўкі. Акрамя таго, кожны аддзел мае пакойсталовую, і на кожным паверсе ў нас ёсць душавыя кабіны. Яны бываюць неабходныя пасля выездаў на аб'екты, і асаблівай папулярнасцю карыстаюцца летам, калі дома адключаюць гарачую ваду.

ААТ «Будпраект» — прыватнае прадпрыемства. Форма ўласнасці тут — калектыўная. На пачатку 90-х супрацоўнікі выкупілі ўсе акцыі. Сёння арганізацыяй валодае 44 акцыянеры. Гэта, бадай, адзінае, што адрозніваe яе ад дзяржаўнага праектнага інстытута.

— Ну яшчэ — падаткаў мы плацім болей, — патлумачыла кіраўнік, — бо працуем рэнтабельна, маем прыбытак. Дазваляем сабе рамонт зрабіць, паступова адмаўляемся ад здачы памяшканняў у арэнду. Гэта не значыць, што працаваць стала прасцей. Наадварот. Вялікі калектыў, 150 чалавек, значная колькасць праектаў — гэта патрабуе напружанай работы. У нас добрае аснашчэнне. Сем аўтамабіляў для выездаў на аб'екты. Кожны супрацоўнік мае сучасны камп'ютар, праграмнае забеспячэнне. Нядаўна купілі адну з апошніх мадэляў інжынернай разможальнай машыны. Усё гэта — з прыбытку. Аднак мы разумеем, што трэба рабіць і тыя праекты, якія прыбытак не прынясуць, але маюць сацыяльную значнасць. Напрыклад, сельскае жыллё. Нехта павінен рабіць і яго. Мы ў асноўным выконваем дзяржаўны заказ. Ні ад чаго не адмахваемся. Асабіста я лічу, што з дзяржструктурамі працаваць лягчэй, чым з прыватнікам.

Вольга Вялічка прыйшла ў «Будпраект» на пасаду архітэктара 20 гадоў таму. Праз два гады яна ўзначаліла аддзел. Потым працавала галоўным інжынерам праектаў, галоўным архітэктарам, і ў 1999 годзе заняла пасаду дырэктара. За два гады да гэтага Вольга Рыгораўна, яшчэ будучы галоўным інжынерам праектаў, сустрэлася з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у Ракуцёўшчыне, дзе яе майстэрня праектавала першыя «прэзідэнцкія» домікі. У яе архіве захоўваецца фотаздымак, на якім Аляксандр Лукашэнка малюе вясковую вуліцу: як ён яе ўяўляе...

За мінулы год ААТ «Будпраект» зрабіла праектаў на суму 6 млрд беларускіх рублёў. Гэта каля 580 аб'ектаў.

Сярод самых цікавых — басейн у Вілейцы. Ён быў запраектаваны 18 гадоў таму, яго тады практычна пабудавалі і... кінулі. Басейн давялося рэанімаваць, як кажуць праекціроўшчыкі, «з ліста». Яны амаль што «пасяліліся» ў напаўразбураным даўгабудзе, каб дакладна вывучыць стан усіх канструкцый, разлічыць, што і як трэба змяніць, перарабіць, што пакінуць, а што пабудаваць наноў. Сёння басейн — гонар горада і навакольля. І, безумоўна, праекціроўшчыкаў.

Іх работа пачынаецца з выслухоўвання пажаданняў заказчыка і выезду спецыялістаў для абследавання на месца. На жаль, не заўсёды магчыма выканаць усе просьбы таго, хто плаціць грошы. Але адна з адметнасцяў ААТ «Будпраект» у тым, што да кожнага заказу тут падыходзяць творча і з душой. Так, як зрабілі б для сябе альбо для сваіх уласных дзяцей. Трэба паслухаць, з якой цеплынёй тут расказваюць пра дзетак з Івянецкага дома-інтэрната, для якіх праектавалі медблок, пра тое, якія гэтыя малыя таленавітыя, разумныя, удзельнікі міжнародных спаборніцтваў і алімпіяд. Склалася ўражанне, што тут адгукаюцца перш за ўсё сэрцам. І ўжо як адлюстраванне гэтага водгуку з'яўляюцца спачатку на маніторы камп'ютара, а потым на паперы дамы, утульныя кватэры, вуліцы, на якіх хочацца жыць.

Дарэчы, ліцэнзію на абследаванне канструкцый, будынкаў і інжынерных сетак у некаторых абласцях маюць адзінкавыя арганізацыі. На Міншчыне такіх дзве, адна з іх — «Будпраект».

Яшчэ адна характэрная рыса. Любой арганізацыі сёння, каб выжыць, трэба ўмець зарабіць грошы. У «Будпраекце», відавочна, сабраліся людзі, якія сапраўды ўмеюць працаваць. Яны, калі трэба, застаюцца на працоўных месцах у выхадныя і святы, затрымліваюцца да ночы. Былі выпадкі — рабілі праекты начамі. Такая асаблівасць любой творчай працы. Спалучаць натхненне і рамяство, і ўмець не шкадаваць сябе. Але вось што яшчэ важна. Грошы тут не на першым месцы. На першым — людзі. Не заказчыкі. А тыя, для каго будзе пабудаваны дом, бальніца, санаторый, басейн... Калі заказчык падводзіць, аказваецца нядобрасумленным, дзеля гэтых людзей — карыстальнікаў — у «Будпраекце» зробяць усё самым найлепшым чынам. Больш, чым за гэта заплачана грошай. Напэўна, калі б нам, пры ўваходзе ў новую рынкавую эканоміку ўдалося захаваць вось такія чалавечныя адносіны да справы, мы б сапраўды пабудавалі ўнікальнае грамадства.



Начальнік архітэктурнага аддзела Ніна КУЖЭЛКА.

Заправачная станцыя ў Вілейцы.

Будынак гаргазу ў Вілейцы.

Басейн у Вілейцы.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Намеснік начальніка аддзела абследаванняў Віктар ПЛАВІНСКІ і інжынер Алег АЎЧАРЭНКА абмяркоўваюць чарговыя заданні.

2. У канструктарскім аддзеле. Гэты творчы калектыў працуе пад кіраўніцтвам Людмілы БАРОДЗІЧ.

3. У мінулым годзе пачалася працоўная біяграфія маладых архітэктараў Марыі ВАЛАВІКОВАЙ і Аляксандра БЛАЗНЯКА — выпускнікоў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

4. У архіве. Тут захоўваецца ўся дакументацыя, распрацаваная ў калектыве і маецца зручны доступ да матэрыялаў.

5. «У працы мы карыстаемся самым сучасным абсталяваннем», — сказаў інжынер геадэзічнага аддзела Ігар КАПУЦКІ, знаёмячы з прыборам для пошуку трэшчын у глыбіні бетону і ўстаноўкай геадэзічнай здымкі праз сістэму спадарожнікаў Зямлі.

6. Тэхнік Вольга АЛІШКЕВІЧ прадэманстравала нам момант працы над рабочым чарцяжом з дапамогай друкавальнай тэхнікі.

Ліцэнзія № 02250/010948 Міністэрства архітэктуры будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ад 10.10.2005 г. УНП 600078283

Матэрыял падрыхтавалі Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Любоў СЫРАЕЖКА ўзначальвае калектыў аддзела водазабеспячэння і каналізацыі.

Будынак музея ў Маладзечне.

Начальнік аддзела Лілія СТАШКЕВІЧ прадставіла адну з навінак — інжынерную машыну, набытую для распрацоўшчыкаў.

Вядучы інжынер Галіна МАРТЫНОЎСКАЯ.

Извещение о проведении 27 марта 2008 года

Минский городской центр недвижимости

71-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет*) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

№ лота	Адрес, тип помещения, целевое назначение	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
	КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02		
1	ул. Голодеда, 75, помещение на 1-м этаже (под непроизводственное – офис)	41,94	710
2	ул. Жилуновича, 16, подвал, общий вход с жильцами, защитное сооружение (под склад)	38,34	650
3	ул. Корицкого, 6-4а, подвал, защитное сооружение (под непроизводственное – офис)	15,76	270
4	ул. Корицкого, 8-3а, защитное сооружение (под непроизводственное – офис)	10,37	180
5	ул. Корицкого, 8-4а, защитное сооружение (под непроизводственное – офис)	16,62	280
6	пр. Партизанский, 58, корп. 1 (под непроизводственное – офис, склад)	24,86	420
7	пр. Партизанский, 69, подвал (под непроизводственное – офис, склад)	127,2	2130
	КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03		
8	ул. Кирова, 11, подвальное помещение, вход отдельный через подвал, имеется естественное освещение, требуется ремонт с восстановлением водоснабжения и электроэнергии (под непроизводственное – офис)	19,95	350
9	ул. К. Маркса, 11, цоколь, вход совместно с другими арендаторами, совместный санузел (под непроизводственное – офис)	31,33	1500
10	пр. Независимости, 12, помещение на 1 этаже – 342,9 кв.м, помещение в подвале 137,6 кв. м. Отдельный вход, имеются все коммунальные услуги. Требуется ремонт с установкой внутренних дверных полотен. Помещение здравоохранения, ранее использовалось под стоматологическую поликлинику. Перепрофилирование помещения с переоборудованием и реконструкцией электросетей с увеличением электрической нагрузки произвести за счет победителя аукциона (под промтоварный магазин)	480,5	50000
	КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76		
11	ул. Кижеватова, 78, подвальное помещение в жилом доме (под непроизводственное – офис, смешанные цели)	24,75	420
12	ул. Левкова, 3, корп. 1, помещение на 1 этаже жилого дома (под магазин непродовольственной группы товаров)	572,00	10000
	КУП «ЖРЭО Партизанского района» тел. 294-01-11		
13	ул. Багратиона, 70, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис)	28,67	480
14	ул. З. Бядули, 8, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС)	94,13	1580
15	ул. Долгобродская, 11, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС)	179,9	3100
16	ул. О. Кошевого, 1, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС)	73,47	1230
17	пер. Козлова, 4, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС)	54,06	910
18	ул. Первомайская, 15, часть проходного подъезда (под торговлю цветами)	17,6	3500
	УП «ЖРЭО Первомайского района» тел. 285-72-92		
19	ул. Седых, 56, подвальное помещение (под непроизводственное – офис)	97,3	1630
20	ул. Козлова, 33, помещение на 1 этаже на площадях опорного пункта РУВД Первомайского района (под непроизводственное – офис)	53,08	900
	УП «ЖРЭО Советского района» тел. 292-74-31		
21	Логойский тракт, 1, корп. 1, помещение на 1 этаже (под офис, непроизводственное, смешанное использование)	137,8	2500
	КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46		
22	ул. Горецкого, 43, помещение на 1 этаже отдельно стоящего здания с двумя изолированными выходами (под магазин продовольственной группы товаров)	163,54	25000
	КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска» тел. 253-03-26		
23	ул. Притыцкого, 40, комната, общий вход с бытовым помещением ЖЭС (под непроизводственное – офис)	43,93	750
	КУП «Минсктранс», филиал «Минский автовокзал» тел. 219-36-59		
24	ул. Ванеева, 34, место на 1 этаже (под банкомат)	1,5	300
	КУП «Минсктранс», Филиал ОЦ «Волма» тел. 8017 14-521-40		
25	Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 1 (площадь под игровой автомат «Кран-машина»)	2,0	400
26	Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 2 (площадь под игровой автомат «Кран-машина»)	2,0	400
27	Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 2 (площадь автомат по продаже чипсов, шоколадок и т.д.)	2,0	400
	Охранно-эксплуатационное коммунальное унитарное предприятие «Гаражи, автостоянки и парковки» тел. 252-06-14		
28	ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 45 (помещение под торговлю непродовольственными товарами)	45,9	2300
	Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома тел. 220-51-34, 219-00-78		
29	ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 524 (помещение под боулинг, бильярд – 3101,1 кв.м, бар на 45 посадочных мест – 289,35 кв.м)	3390,45	57 000
30	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 9 (под торговлю непродовольственными товарами)	18,8	1000
31	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 10 (под торговлю непродовольственными товарами)	18,8	1000
32	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 16 (под торговлю непродовольственными товарами)	17,7	1000
33	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 18 (под торговлю непродовольственными товарами)	33,0	2000
34	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 20 (под торговлю непродовольственными товарами)	30,0	2000
35	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 23 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	17,7	1000
	УП «Партизанское» тел. 200-57-70		
36	пр. газеты «Звязда», 31, часть торгового зала в магазине (под детский развлекательный аппарат «Кран-машина»)	2,56	500
37	ул. Белецкого, 28, часть торгового зала в магазине (под детский развлекательный аппарат «Кран-машина»)	2,7	500
	Управление бытового обслуживания населения тел. 200-99-90		
38	ул. Ломоносова,3, 4 смежных помещения на 2 этаже здания (под непроизводственное – офис, производственные цели)	197,35	3300
	КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66		
39	ул. Руссиянова, 11, помещение на 1 этаже (под мастерскую по ремонту радиотелевизионной аппаратуры)	75,9	1300
40	пр. Пушкина, 8, два помещения, в т.ч. одно без естественного освещения (под непроизводственное – офис)	51,7	900
	КУП «Городские бани» тел. 222-79-90		
41	ул. Космонавтов, 56, место в холле на 1 этаже бани (под установку морозильных ларей для хранения замороженных веников). Режим работы по согласованию с администрацией бани	1,5	300
42	ул. Сухаревская, 33, место в холле на 1 этаже бани (под установку морозильных ларей для хранения замороженных веников). Режим работы по согласованию с администрацией бани	1,4	300
43	ул. Московская, 7а, место в холле на 1 этаже бани (под установку морозильных ларей для хранения замороженных веников). Режим работы по согласованию с администрацией бани	1,5	300
	ТПКУП «Белизна» тел. 267-89-44		
44	ул. Кнорина, 55, помещение на 2 этаже (под непроизводственное – офис)	21,15	400
45	ул. Кнорина, 55, помещение на 1 этаже (под производственные цели, склад)	36,35	610
	КУП «Минский мясокомбинат» тел. 296-12-52		
46	ул. Солтыса, 187, помещения в здании ФОКа: помещение площадью 1520,1 кв. м – под производственные цели не связанные с вредным производством, помещение площадью 28,63 кв. м – под непроизводственное – офис	1548,73	26000
	ОАО «МАПИД» тел. 201-23-95		
47	ул. Пономаренко, 35, помещение на 1 этаже в столовой, имеется отдельный вход, без телефона (под склад пищевой продукции)	218,02	3650
	Минский профессионально-технический колледж сферы обслуживания тел. 272-76-98		
48	ул. Семашко, 7, подвальное помещение с отдельным входом (под производственные цели или склад)	256,65	4300
	Жилищно – эксплуатационный участок КУП «УДМС и Б» тел. 200-26-10		
49	ул. Короля, 9, помещение № 114 на 1 этаже здания (под непроизводственное – офис)	37,5	2000
	КУП «Минская овощная фабрика» тел. 244-36-82		
50	Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, кирпичное здание, требующее ремонта, без воды, телефона, электроэнергии (под производственные цели)	138,0	2400
51	Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, открытая площадка (под склад, возможно разделение на части)	100,0	1700
52	Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, открытая площадка (под склад)	500,0	8400
53	Минский р-н, д. Глебковичи, здание магазина (под магазин)	64,0	1100
	КУП «Городские парки Минскзеленстроя» тел. 280-04-49		
54	пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка под аттракцион «Комната смеха»**	50	2500
55	пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка под аттракцион «Караоке»**	8,0	1200
56	пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка под аттракцион по раскрашиванию гипсовой скульптурки красками**	25,0	2500
57	пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка для реализации услуг взвешивания, измерения пульса, роста, силы рук **	2,0	400
58	пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка для реализации детской игрушки **	4,0	800
59	ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка под аттракцион по раскрашиванию гипсовой скульптурки красками**	25,0	2500
60	ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка для реализации услуг взвешивания, измерения пульса, роста, силы рук **	2,0	400
61	ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка для реализации детской игрушки **	4,0	800
62	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка для реализации услуг взвешивания, измерения пульса, роста, силы рук **	1,0	200
63	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей **	1,0	200
64	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка для реализации услуг по фотографированию **	1,0	200
65	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка № 1 для реализации детской игрушки**	4,0	800
66	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка № 2 для реализации детской игрушки**	4,0	800
67	ул. Ташкентская, парк культуры и отдыха им. 900-летия Минска, площадка для реализации услуг по прокату электромобилей**	15,0	1500
	КУП «Минский мясокомбинат» тел. 296-12-52		
68	ул. Солтыса, 187, помещения в административном корпусе (под непроизводственное – офис)	37,5	700

** В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

***Требуется согласование ассортимента реализуемого товара и услуг с органами санитарно-эпидемиологического контроля и торговыми отделами администраций Первомайского, Партизанского и Заводского районов г. Минска соответственно. Продолжительность сезона с 15.04.2008 по 15.10.2008 (может быть увеличена по желанию арендатора). Внешний вид объекта согласовывается с УП «Городские парки Минскзеленстроя» и соответствующими службами администраций Первомайского, Партизанского и Заводского районов г. Минска.*

Организатор аукциона (продавец) – КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам. Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости», представляет нотариально заверенную копию свидетельства о регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя. Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона. Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

Аукцион состоится 27 марта 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 26 марта 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227- 40-22, 227- 48- 36. Интернет: www.mgcn.by.

Целевое назначение помещений определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- *«непроизводственное целевое использование»* — использование помещений для размещения руководителей, органов управления и контроля юридических лиц и их структурных подразделений, а также специалистов по снабжению и сбыту, финансово-экономических служб, бухгалтерий;
- *«смешанное целевое использование»* — использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- *«производственное целевое использование»* — использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

Порядок определения размеров арендной платы при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

УНП 190398583

ГОД ЖАЛОБЫ — ГОД АБМЕЖАВАННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)

На жаль, у этнаграфічнай літаратуры занатавана зусім мала звестак аб тым, чым адрозніваліся жалобныя сталы па самагубцах ад звычайных памінальных сталоў. Але памінкі ўсё роўна ладзілі, толькі без адпаведнай хрысціянскай атрыбутыкі.

Па-другое, не зусім зразумела, што цягне або прымушае людзей фатаграфаваць памерлага ў труне, ды яшчэ самазабойцу? Якую памяць закліканы ўвекавечыць такі фотаздымак, якую энергетыку ён можа ўтрымліваць у сабе? Мяркуем, што не трэба нікога пераконваць у тым, што нябожчык-вампір на фота можа факусіраваць толькі негатыўна-разбуральную энергетыку. Тады паўстае яшчэ адно пытанне: калі ў мінулыя часы вяскоўцы баяліся нечаканага кантакту з душой самагубцы, пранізваючы яе асінавым калом, то якія наступствы для сям'і можа мець знаходжанне дома (у зоне жывых) выявы таго, хто парушыў хрысціянскі і агульнаабшчынны запавет і доўгі час будзе шукаць сабе паратунку і на «тым» свеце?

Таму адказ на пытанне можа быць толькі адзін, прычым па форме даволі жорсткі: **чым хутчэй вы пазбавіцеся такіх фотаздымкаў (спаліце іх), тым хутчэй у вашай хаце наладзіцца парадак, у членаў сям'і — здароўе, а ў вашых душах — спакой.**

А цяпер тое, што тычыцца новабудоўлі і рэчаў, якімі некалі карысталіся памерлыя людзі.

Давайце ўзгадаем адно абавязковае рытуальнае дзеянне, якое выконваецца ў хаце адразу ж пасля смерці чалавека: мы тут жа спяшаемся спыніць ход агульнасямейнага насценнага гадзінніка (вядомая вялікая колькасць сведчанняў таго, што персанальны, наручны гадзіннік памерлага спыняецца сам). Навошта гэта робіцца? Адказ можа быць толькі адзін: з той хвіліны, як не стала чалавека, сям'я памерлага выключаецца з агульнавяскоўвага абшчыннага святочнага календара і пераходзіць зусім на іншы вектар вымярэння часу — пахавальна-памінальны цыкл, які таксама, як і звычайны гадавы колазварот падзей, будзе доўжыцца адзін год, але і ён будзе мець пэўную сваю структуру: 0-3-9-40-1 год. Роўна праз год сям'я вернецца да вясковага ладу і будзе ўключана ў святочны колазварот — гадзіннік у хаце таксама пойдзе звыклым ходам.

Узгаданы намі ўніверсальны рытм традыцыйнай народнай і хрысціянскай культурных традыцый дакладна вызначае і нашы паводзіны, і асаблівасці нашага стаўлення да ўсяго таго, што было яшчэ зусім нядаўна звязана з жыццём нябожчыка. Падчас шматлікіх экспедыцый нам даводзілася чуць наступнае тлумачэнне: прадстаўнікі першага і другога калена сваяцтва прытрымліваюцца розных абмежаванняў роўна год, а вось сваякі трэцяга і чацвёртага пакалення — 40 дзён, таму што якраз на саракавы дзень душа сканалага трапляе на суд перад творцам свету, на якім і вырашаецца яе далейшы лёс. Менавіта таму якраз саракавы дзень і з'яўляецца першай прынцыповай мяжой, якая ўплывае на паводзіны родных і блізкіх людзей.

Звычаёвым правам беларусаў прадугледжана, што рэчы памерлага трэба спаліць на трэці дзень, адразу ж пасля пахавання, а вось праз сорак дзён можна карыстацца ўсім тым, да чаго дакраналася рука памерлага. Можна карыстацца посудам, мэбляй, ложкам, адзеннем.

Разам з тым на пахавальна-памінальным вектары заключным этапам з'яўляюцца «ўгодкі», якія таксама накладваюць на нашы паводзіны пэўныя абмежаванні. **На працягу года пасля смерці чалавека нельга распачынаць ніякую новабудоўлю, а таксама рабіць які-небудзь рамонт у хаце.**

Асабліва шмат эмоцый у нашых сучаснікаў выклікае правіла, якое забараняе ў год жалобы спраўляць вяселле. Зусім нядаўна сутыкнулі-ся з нечаканай сітуацыяй. Прысутнічалі на вяселлі, дзе нявеста была цяжарнай, а сама сямейная ўрачыстасць адбывалася на 30-ы дзень пасля смерці яе бабулі. Таму старых людзей на вяселлі практычна не было — яны паехалі на памінальны стол (па каталіцкай традыцыі), а бацькі пад напорам дачкі не адмянілі вяселле. Пры гэтым паводзіны ўнучкі не выпадалі з стрыманасцю і адценнем жалю — яна ішла насустрач свайму жыццю і жыццю свайго будучага дзіцяці радасная і шчаслівая! Наўрад ці яна думала ў гэты час пра тое, якое духоўнае бласлаўленне атрымае ад сваёй бабулі.

Нашы студэнты часам з пэўным выклікам парыруюць: «А хто прыдумаў гэтыя абмежаванні? Кожны робіць так, як яму хочацца».

І ўсё ж у якасці лёсавызначальных пытанняў можна паставіць зусім іншыя: «А чаму смерць блізкага чалавека здарылася якраз у гэты час? Магчыма, гэта вельмі важны знак — папярэджанне. Падумайце, аб чым ён сведчыць?»

Адносна таго, што кожны мае права выбіраць і сам прымаць рашэнне, пярэчыць не станем. Некалі вяселле было агульнародавай падзеяй. Увесь род быў уключаны ў працэс падрыхтоўкі да свята. Але разам з тым быць вяселлю ці не быць, вырашала сям'я. Што мы маем на сёння?

Наш род рассыпаўся, добрая палавіна сем'яў на самай справе такімі не з'яўляюцца. Вось мы і дажыліся да таго, што дзеці ўсё вырашаюць самі, бацькоў толькі ставяць перад фактам: ад вас, маўляў, толькі грошы на правядзенне гулянкі. Чаму ж тады такая ступень волі не ўмацоўвае сям'ю? Таму няхай заўсёды побач з вамі будзе мудры дарадца, які параіць, падкажа, дапаможа, каб як мага радзей вы гаварылі: «Калі б жа ведаў!»

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.
Кантактны тэлефон: 292 21 03.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА 27 МАРТА 2008 ГОДА

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости» проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды сроком на 5 лет* не завершенных строительством офисных помещений в составе бизнес-центра (2-я очередь строительства) в «Центре коммерческих связей с гостиничным комплексом» по пр. Победителей в г. Минске после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица»

№ лота	Тип помещения	Целевое назначение помещения	Общая площадь, кв.м	Начальная цена, тыс. руб.
	1 этаж			
1	Помещение № 101 (3 комнаты, санузел, коридор)	Офис	145,245	2500
2	Помещение № 103 (3 комнаты, санузел, коридор)	Офис	145,56	2500
	2 этаж			
3	Помещение № 201 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	147,33	2500
4	Помещение № 202 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,23	2200
5	Помещение № 203 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	146,13	2500
6	Помещение № 204 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,395	2200
7	Помещение № 205	Офис	74,745	1300
8	Помещение № 207	Офис	76,965	1300
9	Помещение № 209	Офис	77,37	1300
10	Помещение № 210	Офис	64,485	1200
11	Помещение № 211	Подсобное помещение	31,92	600
12	Помещение № 212	Офис	67,875	1200
	3 этаж			
13	Помещение № 301 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	147,33	2500
14	Помещение № 302 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,33	2200
15	Помещение № 303 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	146,13	2500
16	Помещение № 304 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,56	2200
17	Помещение № 305	Офис	75,045	1300
18	Помещение № 307	Офис	75,165	1300
19	Помещение № 309	Офис	77,505	1300
20	Помещение № 312	Офис	64,485	1200
21	Помещение № 314	Офис	66,42	1200
	4 этаж			
22	Помещение № 401 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	147,33	2500
23	Помещение № 402 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,23	2200
24	Помещение № 403 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	146,13	2500
25	Помещение № 404 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,545	2200
26	Помещение № 405	Офис	75,045	1300
27	Помещение № 407	Офис	75,165	1300
28	Помещение № 408	Офис	64,485	1200
29	Помещение № 409	Офис	77,505	1300
30	Помещение № 410	Офис	66,42	1200
31	Помещение № 411	Подсобное помещение	31,92	600
	5 этаж			
34	Помещение № 503 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	146,565	2500
35	Помещение № 504 (2 комнаты, санузел, коридор)	Офис	127,545	2200
36	Помещение № 505	Офис	75,225	1300
37	Помещение № 507	Офис	75,3	1300
38	Помещение № 508	Офис	62,895	1100
39	Помещение № 509	Офис	77,73	1300
40	Помещение № 510	Офис	62,61	1100
	Дополнительные помещения			
41	Помещение № 214, 2 этаж	Офис	50,22	900
42	Помещение № 216, 2 этаж	Подсобное помещение	13,275	300
43	Помещение № 316, 3 этаж	Офис	50,355	900
44	Помещение № 318, 3 этаж	Подсобное помещение	13,47	300
45	Помещение № 412, 4 этаж	Офис	50,355	900
46	Помещение № 414, 4 этаж	Подсобное помещение	13,47	300
47	Помещение № 512, 5 этаж	Офис	48,63	900
48	Помещение № 514, 5 этаж	Подсобное помещение	13,47	300

** В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 % от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок их подачи определен условиями проведения аукциона. Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Арендуемая площадь помещений будет корректироваться с учетом мест общего пользования перед подписанием договора аренды. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица». **Аукцион состоится 27 марта 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39. Документы на участие в аукционе принимаются по 26 марта до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Контактный телефон: (017) 227-40-22. Интернет: www.mgcn.by.**

УНП 190398583

УХІЛІСТА ЗАТРЫМАЛІ З 1,5 КГ МАРЫХУАНЫ

Буйная партыя наркотыкаў канфіскавана супрацоўнікамі аддзела нараваў і супрацьдзеяння гандлю людзьмі ў 28-гадовага гамяльчаніна, які працуе рабочым аднаго з таварыстваў з дадатковай адказнасцю. Між іншым, раней гэты дзялок ужо меў непрыемнасці з законам: быў судзімы за ўхіленне ад прызыву на вайсковую службу. На гэты раз яго злавілі за руку з 1,5 кілаграма марыхуаны, агульны кошт якой на «чорным рынку», складае каля 18 тысяч долараў ЗША.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

КАНФІСКАВАНА ПАРТЫЯ АМФЕТАМІНУ

Буйную партыю псіхатропнага рэчыва — 17,6 грама амфетаміну — канфіскавалі супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Віцебскай вобласці. Адна доза гэтага рэчыва на «чорным рынку» прадаецца за 30 долараў. Як расказаў «Звяздзе» начальнік аддзела Яўген Сушынскі, гэтую партыю даставіў у Віцебск 26-гадовы беспрацоўны. Растлумачыў, што прывёз амфетамін са Смаленскай вобласці, дзе набыў яго за 600 долараў. «Тавар» быў падзелены на 48 пакетаў (у кожным па 4 дозы). Акрамя кур'ера затрыманы і два яго маладыя «калегі», якія захоўвалі і рэалізоўвалі амфетамін. Сярод іх — 19-гадовая дзяўчына. Збываць наркотык планавалі пастаянным кліентам і на дыскатэках, у іншых месцах адпачынку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАО «АВТОКОМБИНАТ № 3»

извещает акционеров Общества

о продаже акций двумя акционерами 2465 простых акций Общества по цене 4200 рублей за одну акцию. Заявления от желающих приобрести акции принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ванеева, 29.

Тел. для справок 2470571. УНН 100089037

Страховые полисы ЗАСО «Белнефтестрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серия АД №№ 0529259, 7730450, квитанцию о приеме наличных денежных средств форма 1-СУ серия ГС № 9270602, карта международного автотранспортного страхования серия BY/03 № 1278787, страховые полисы ОАО «Ресо-Гарантия» по ОСГОВТС на территории РФ серия ААА № 0241111049, страховые полисы ЗАСО «ТАСК» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серия АЖ № 2276196, карта международного автотранспортного страхования серия BY/02 №1576743, квитанции о приеме наличных денежных средств форма 1-СУ серия ГС №№ 9190623, 9190628, серия КВ № 4043647, страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серия АЖ №№ 2536791-2536793, квитанции о приеме наличных денежных средств форма 1-СУ серия ГС №№ 9323828-9323830, **считать не действительными.**

Віншуем любую матулю **Таццяну Міхайлаўну СУШЧЭНЮ** з в. Пласток Любанскага раёна з 65-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, даўгалецця, шчасця і радасці ў жыцці.

Дзеці, унукі.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (1 сакавіка)

Па гарызанталі: Дэкларацыя. Строп. Сказ. Рама. Ікра. Год. Ворс. Ачко. Рым. Нанет. Крамола. Бос. Каса. Арап. Каня. Марабу. Ландо. Клубок. Парк. Даміно. Рука. Ата. Старац. Саха. Чардаш. Гума. Краб. Ракетка. **Па вертыкалі:** Красавік. Валан. Арган. Нар. «Янка». Роба. Ткач. Крыло. Мода. Дыск. Маска. Сорга. Тара. Рампа. Дуб. Кірза. Храм. Мяч. Шар. Пра. Укос. Фонд. Кабура. Ганчар. Бур. Сарока. Град. Трап. «Кацярына».

Дзве даты

15 сакавіка

1908 год — выйшаў першы зборнік паэзіі Янкі Купалы «Жалейка». Змест яго склалі лірычныя вершы і паэма «Адплата кахання», напісаныя ў 1905—1907 гг. Цэласная кніга лірыкі, найперш дум і перажыванняў, якія выказаны ад імя селяніна. Імкнучыся сцвердзіць сябе паэтам народных мас, выразнікам іх дум і пачуццяў, аўтар у шэрагу вершаў нібы даваў тлумачэнне, хто такі паэт Янка Купала, якія ў яго думы, перажыванні, песні, каму ён іх нясе, ахвяруе. У «Жалейцы» ўпершыню апублікаваны верш «А хто там ідзе?», які заняў асаблівае месца ў творчасці Купалы.

1917 год — расійскі імператар Мікалай II адмовіўся ад прастола, Часовым камітэтам дэпутатаў Дзяржаўнай Думы са згоды лідараў Петрасавета ў Расіі на перыяд да склікання Устаноўчага сходу сфарміраваны Часовы ўрад.

Цытата дня:

«Ёсць многа выпадкаў у жыцці, калі праўда і чысціня дасягаюць мэты лепш і хутчэй, чым усялякая хітрасць».

Жан дэ Лабруер (1645—1696), французскі пісьменнік.

СТЫЛЬ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Модны базар

У клубным жыцці сталіцы з прыходам вясны назіраецца пэўнае ажыўленне. Так, у сакавіку «НебаЖители Project» і кампанія «Velcom» прадстаўляюць заўсёднікам модных тусовак праект «The V Element». Гэта серыя вечарынак, якія маюць прадэманстраваць дасягненні сучаснай субкультуры — 4 розныя стыхіі. Думаеце, на ўвазе маюцца зямля, вада, агонь, паветра? Нічога падобнага! Паколькі гаворка ідзе пра сучаснага чалавека, то пад стыхіямі арганізатары разумеюць усё тое, што яго акружае ў жыцці: моднае адзенне, аўтамабілі, вандроўкі, аксесуары і ўпрыгажэнні. Карацей, гламур, стыль і пафас вялікага горада.

Першай з серый модных вечарынак стане «Episode I. Fashion». Адбудзецца падзея 21 сакавіка ў клубе Bronx, у фармаце моднага паказу. Прычым калекцыю прадставіць не які-небудзь шырока вядомы ў вузкіх колах майстар, а сапраўдная «зорка» — адна з самых вядомых расійскіх дызайнераў і заканадаўцаў моды Маша Цыгаль. Дарэчы, паказ адбудзецца з удзелам самой Машы, а гэта выпадак амаль унікальны — звычайна на паказы па-за межамі Масквы дызайнер не выязджае, а Мінск дык і ўвогуле наведае ўпершыню. Якую менавіта калекцыю яна прывязе — не ведаюць пакуль што нават арганізатары вечарынкі, паведамляюць толькі, што паказ будзе «напалову беларускі»: касцюмы — маскоўскія, мадэлі — нашы.

Што яшчэ чакае гасцей вечарынкі? Усе атрыбуты пафасных мерапрыемстваў: чырвоная дывановая дарожка і лімузіны, эпатажныя ўборы і дарагія сігары, а таксама ўспышкі камер «папарацы». Тым больш, «паляваць» ім будзе на каго — на паказ запрошаны зоркі шоў-бізнэсу, папулярныя акцёры і тэлевядучыя, бізнэсмены, ды-джэі і г.д.

Даведка

Імя Машы Цыгаль з'явілася на модным небасхіле ў 1995 годзе. Пачынала дызайнер са стварэння авангардных калекцый — касцюмаў з... грампласцінак і аргшкла. За гэтыя эксперыменты ў свой час Цыгаль атрымала прыз з рук самога Пака Рабана. Значна пазней скіравала свае інтарэсы ў калекцыі прэта-партэ, і тут разгарнулася на ўсю моц — першай з расійскіх мадэльераў вывела на подыум поп-зорку, якіх апранула вялікае мноства — ад «Бі-2» да Дзімы Білана і нават да Уітні Х'юстан. Гэтаксама Маша Цыгаль з поспехам спрабавала сябе ў распрацоўцы дэкору яхтаў, дызайну бляшанкі для Coca-Cola, касцюмаў для спектакляў «Сірано» і «Апошні Дон Жуан», стварэнні дзіцяча-дарослай калекцыі «Аліса ў краіне цудаў», распрацоўцы накірункаў «спартыўная готыка» і «спартыўны гламур» і г.д. Яе «фірменныя» колеры — блакітны і ружовы, персанальная фішка — выкарыстанне на паказах музыкі ды-джэяў, а што тычыцца папулярнасці, то эксперты моды сцвярджаюць: адзенне ад Цыгаль у буціках прадаецца не горш, чым «Dolche&Gabbana».

Ліна МАЛІНІНА.

Фота з сайта www.mashatsigal.com.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.23	18.14	11.51
Віцебск —	6.14	18.03	11.49
Магілёў —	6.14	18.04	11.50
Гомель —	6.10	18.01	11.51
Гродна —	6.39	18.29	11.50
Брэст —	6.39	18.30	11.51

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агафона, Арсенія, Багдана, Фёдара, Фядота*

К. *Клеменса, Людвіка*

НАДВОР'Е на заўтра



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:

— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні

— малая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА	+8..+10°С	**КІЕЎ**	+5..+7°С
ВІЛЬНЮС	+3..+5°С	**МАСКВА**	+2..+4°С
РЫГА	+2..+4°С	**С.-ПЕЦЯРБУРГ**	+2..+4°С

Усміхнёмся!

Пачатак аперацыі. Анестэзіёлаг нахіляецца над пацыентам, каб прыкласці наркозную маску.

Пацыент, адчуваючы жудасны пах перагару:

— Доктар, вы ж п'яны!

Анестэзіёлаг, ласкава пляскаючы хворага па шчацэ:

— Я п'яны? Міло-ок! Ты хірурга не бачыў!

☺

6 законаў жыцця:

1. Ты не можаш дакрануцца языком да ўсіх сваіх зубоў.

2. Усе дурні пасля чытання вышэйсказанага спрабуюць гэта на справе.

3. Першы закон — хлусня.

4. Цяпер ты ўсміхаешся, таму што ты дурань.

5. Хутка ты перашлеш гэта іншаму дурню.

6. На тваім твары дагэтуль усмешка.

☺

Жабрак стукаецца ў хату.

— Мадам, я ўжо тры дні не бачыў мяса.

— Сеня, пакажы яму катлету.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Стральцам час сустрэцца з сябрамі, а Львам — выпраўляць памылкі

ВАЕН. Пастарайцеся рэальна ацэньваць свае магчымасці і не засмучацца па дробязях. У выпадку няўдачы проста выпраўце памылкі, якія зрабілі, — і вы дасягнеце мэты. Давайце менш абяцанняў, бо выканаць іх будзе цяжка. Субота — законны дзень адпачынку. А ўжо ў нядзелю праяўце разумную асцярожнасць у зносінах з часам.

ЦЯЛЕЦ. Адным з самых удалых і плённых дзён можа стаць панядзелак: усё будзе атрымлівацца, рэалізуюцца прафесійныя задумы. Атмасфера на рабоце будзе камфортнай і добразычлівай. Падумайце пра дадатковы заробак — гэта будзе ўдала і своечасова. Тыдзень насычаны кантактамі і новымі знаёмствамі.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце здзясніць амаль немагчымае, але варта крыху задумацца, ці трэба гэта рабіць... А вынік роздуму вядомы — упартасці вам не займаць, і вы ўзваліце на сябе гэта хоць бы са спартыўнай цікавасці. Каб тыдзень меў пазітыўныя вынікі, усе важныя справы неабходна запланаваць на панядзелак і другую палову тыдня.

РАК. Зрабіце над сабой намаганне і прымусьце добра адпачыць. Самаадданае служэнне блізкім і каханым людзям, зразумела, справа высакародная, але і ў ёй неабходна рабіць перапынкі. Не варта зацыкліваца на пытаннях матэрыяльных, лепш падумаць пра душу. Некаторыя прадстаўнікі вашага знака ўжо на гэтым тыдні зоймуцца маштабным пераўтварэннем у сваёй справе.

ЛЕЎ. Тыдзень дасць час на асэнсаванне і выпраўленне памылак і пралікаў, якія былі зроблены ў нядаўнім мінулым. Прызнайцеся сабе, што некаторыя вашы рашэнні былі вельмі экстравагантнымі і не заўсёды прадуманымі. Прыслухайцеся і пачуйце патрабаванні кіраўніцтва — і тады справы пойдуць на лад. Пастарайцеся ўпісвацца ў рамкі часу, выключайце спазненні. У суботу магчымыя непаразуменні паміж вамі і блізкімі — іх будзе цяжка выправіць мірным шляхам.

ДЗЕВА. Не варта фарсіраваць падзеі. Проста не звяртайце на іх увагі — тады цяжкасці расступяцца перад вамі самі. З'явіцца магчымасць павандраваць і ўзбагаціць сябе новымі ўражаннямі. У панядзелак вы здольныя апынуцца зусім блізка да жаданага і нават яго атрымаць, калі не будзеце разменьвацца на дробязі. У сераду перашкодай на шляху да поспеху могуць стаць партнёры ці канкурэнты.

ШАЛІ. Вас чакаюць рознабаковыя падзеі, якія могуць дапамагчы ў прасоўванні па кар'ернай лесвіцы. Будзьце больш уважлівымі, калі размяркоўваеце сілы і час: яны спатрэбяцца не толькі на рабоце, але і дома. У панядзелак цалкам верагодныя непаразуменні і канфлікты, бо вашы інтарэсы могуць разыходзіцца з інтарэсамі партнёраў.

СКАРПІЁН. Цяпер у рабоце неабходны творчы падыход, таму пастарайцеся раскрыць і праявіць свае крэатыўныя здольнасці. Пачынаючы з чацвярга настае добры перыяд для работы з незавершанымі справамі. Аўторак — спрыяльны дзень, калі будуць узнагароджаны настойлівасць і працавітасць. У пятніцу могуць узнікнуць абставіны, якія зменяць вашы планы. У нядзелю родныя напомняць пра сябе.

СТРАЛЕЦ. Не саромейцеся карысных сувязяў, калі такія маюцца: у вашых справах будзе зусім не лішнім высокае заступніцтва. Не разлічвайце толькі на асабістыя сілы, звяртайцеся да аўтарытэтных людзей па падтрымку. Час спрыяльны для сустрэчы з сябрамі, пачатку новых спраў, планавання будучыні. Вы здольныя прадчуваць падзеі, якія адбудуцца. Могуць сніцца прарочыя сны, трапляцца знакі і сімвалы. У другой палове тыдня ссунуцца з месца справы, якімі даўно хацелася заняцца, але ўсё не да таго было.

КАЗЯРОГ. Задачы будуць звязаны з дакладнасцю, таму думкі павінны быць стройнымі, як калоны ў храме. Вам пад сілу вырашыць свае праблемы самастойна. Пачаць тут можна з таго, каб не стваральнічаць лішніх праблем іншым, — адразу стане лягчэй жыць. Не прыбядняйцеся: ваша энергетыка віруе, прычым ва ўсіх накірунках. Пара ажыццяўляць мару — у вас усё атрымаецца.

ВАДАЛЕЙ. Будзеце схільныя марыць. Усё б нічога, але думкі будуць не самай практычнай уласцівасці. Некаторыя наогул вельмі дзіўныя — а на гэтым тыдні тое, аб чым шмат думаць, з вялікай верагоднасцю можа і адбыцца. Так што вам не пашкодзіць некаторая асцярожнасць, бо не факт, што вынік вам спадабаецца. У канцы тыдня магчымы прыгоды, якія, на шчасце, не тояць у сабе ніякай небяспекі.

РЫБЫ. Падрыхтуйцеся прымаць прапановы — будзеце атрымліваць іх у нарастаючым тэмпе. У выраш эннi дзелавых пытанняў больш разлічвайце на інтуіцыю — як і дзіўна, логіка наўрад ці прывядзе вас да жаданых вынікаў. У аўторак будуць удалымі дзелавыя паездкі і перамовы. У чацвер не варта здзяйсняць безадказных учынкаў, нават такіх, якія падаюцца зусім нязначнымі.

Кроплі крыві ўсё пацвердзілі?

Пра незаконнае паляванне на тэрыторыі Талачынскага раёна ў Аршанскую міжрайінспекцыю аховы жывёльнага і раслiннага свету паведамілі па тэлефоне «гарачай лініі».

Падчас праверкі ў лясным масіве былі знойдзены сляды людзей, сабак і рэшткі лася, пра што паведамілі ў дзяжурную часць Талачынскага РАУС. Сумесная рэйдавая група па слядах прыбыла ў вёску Багданаўка, дзе ў домаўладанні грамадзяніна былі знойдзены кроплі крыві на сценах, нож, дробныя кавалачкі мяса і інш. Узоры былі апячатаны. Узбуджана крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Сас

У блакітным полі залаты паўмесяц рогамі дагары, над рогамі залатыя зоркі, з паўмесяца наканечнікам дагары залатая страла апераная.

Гербам САС карысталіся:

Аляшкевіч, Арлоўскі, Баярскі, Беразоўскі, Банькоўскі, Брылеўскі, Бушынскі, Бянеўскі, Бярнацкі, Валасецкі, Валачоўскі, Валянскі, Васількоўскі, Васінскі, Ваўкавіцкі, Віслоцкі, Вітвіцкі, Віткоўскі, Галынскі, Гарадзецкі, Грабніцкі, Дабржанскі/Дабранскі, Далінскі, Данейка, Даніловіч, Дзядзюля, Длугапольскі/Даўгапольскі, Дунаеўскі, Завадскі, Завіша, Зімніцкі, Зубрыцкі, Зялінскі, Іжыцкі, Ільніцкі, Кабылінскі, Кабылянскі, Казлоўскі, Камарніцкі, Камароўскі, Камінскі, Карвоўскі, Карказовіч, Кладніцкі, Ключынскі, Красніцкі, Красоўскі, Крашчынскі, Крушальніцкі, Крыніцкі, Кульчыцкі, Куніцкі, Левандоўскі, Ліцінскі, Ляцкі, Ляшчынскі, Маліноўскі, Манчак, Мікульскі, Навакоўскі, Навасельскі, Падвысоцкі, Паўлікоўскі, Попель, Попін, Пагарэльскі, Рудніцкі, Рыхліцкі, Самковіч, Сасуліч, Свістун, Станіслаўскі, Стральбіцкі, Струтынскі, Сялецкі, Сямігаловскі, Такарскі, Тарлеўскі, Тарнаўскі, Трахімоўскі, Харэвіч, Хлапіцкі, Цярлецкі, Цяшкоўскі, Чайкоўскі, Шпакоўскі, Яворскі, Янішчэўскі, Ясінскі.

Секер

У чырвоным полі срэбная рагаціна перакрыжаваная, наканечнікам дагары, на срэбнай папярэчыне абапертая.

Гербам СЕКЕР карысталіся:

Воўк, Занковіч, Зянковіч, Кімбар, Ціхінскі.

Слепаворан

У блакітным полі срэбная падкова гакамі ўніз, на ёй залаты крыж кавалерскі, на крыжы чорны крук з узнятымі крыламі, направа абернуты, у дзюбе залаты пярсцёнак.

Гербам СЛЕПАВОРАН карысталіся:

Алізаровіч, Алока, Альшэўскі, Бабоўскі, Багенскі, Багінскі, Багуслаўскі, Багуцкі, Банькоўскі, Баранецкі, Браткоўскі, Брушэўскі, Брэсцкі, Буйна, Буйніцкі, Бухавецкі, Бучынскі, Быстры, Ваўжэцкі, Вольскі, Враблеўскі/Ураблеўскі, Врублеўскі/Урублеўскі, Выжыкоўскі, Вышкоўскі, Вярбіцкі, Вярцінскі, Гансеўскі, Гансяроўскі, Гарадынскі, Гарбоўскі, Глінка, Глінскі, Глухоўскі, Горскі, Градзецкі, Гуткоўскі, Гутоўскі, Дабоўскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Дваракоўскі, Драздоўскі, Дружынскі, Жміеўскі, Жук, Завадскі, Залескі, Заторскі, Зімнах, Зклязеіцкі, Кабылінскі, Казлоўскі, Калячынскі, Каменскі, Камінскі, Камоцкі, Карыбскі, Касацкі, Клапатоўскі, Клімашэўскі, Корвін, Корвін-Краеўскі, Корвін-Кулеша, Корвін-Кучынскі, Краковскі, Красінскі, Краскоўскі, Крашоўскі, Крукоўскі, Крывіцкі, Кукоўскі, Кулеша, Куляшэвіч, Кучынскі, Лапацінскі, Лапускі, Лунеўскі, Маліноўскі, Маркевіч, Масціцкі, Мацерна, Мілеўскі, Мілкоўскі, Мірашэўскі, Навакоўскі, Навасельскі, Падзерне, Падэрня, Паплаўскі, Пастарнакавіч, Паўлоўскі, Пенскі, Піятроўскі, Плуцінскі, Пугаўка, Пухальскі, Пятроўскі, Пятніцкі, Рагоўскі, Райкевіч, Ратынскі, Рачынскі, Рыбалтоўскі, Рыбчынскі, Рымінскі, Сабалеўскі, Савіцкі, Сакалоўскі, Сеўрук, Скібнеўскі, Славінскі, Старжынскі, Сухадольскі, Сямігродзкі, Тапчэўскі, Тараевіч, Трамбіцкі/Трубіцкі, Траціскі, Трускоўскі, Тыбароўскі, Тэлянец, Фаленскі, Фіялкоўскі, Фларыяновіч, Франкоўскі, Францкевіч, Чайкоўскі, Чакалоўскі, Чакатоўскі, Шабуневіч, Шапятоўскі, Шчуцкі, Шыманавіч, Шыманоўскі, Шыманскі, Шымборскі, Юшкевіч, Язерскі, Яноўскі, Ястрабецкі.

Стары Конь

У чырвоным полі на зялёнай мураве срэбны конь з залатымі капытамі і ў чорнай папрузе крочыць направа.

Гербам СТАРЫ КОНЬ карысталіся:

Буцвілоўскі, Градзецкі, Завадскі, Кацюцэвіч, Маеўскі, Май, Мядзвецкі, Станскі, Чартарыскі.

Стрэмя

У чырвоным полі залатое стрэмя.

Гербам СТРЭМЯ карысталіся :

Бадзента/Бадзята, Бжоска, Бржастоўскі/Берастоўскі, Бужынскі, Бучынскі, Вайніч, Войніч, Высоцкі, Грыва, Загароўскі, Каня, Клячкоўскі, Куроўскі, Пержхала/Перхала, Пячкоўскі, Рагоза, Рудніцкі, Саматыя, Страмецкі, Семпліковіч, Стычынскі, Трацяк.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Калі замучыў кашаль

У нашым сырым клімаце захворванні органаў дыхання — звычайная справа. Часцей яны пачынаюцца з наступленнем халадоў ці пры вясновым безладзі, калі арганізм аслаблены пасля зімы. Гэта добра знаёмыя нам ВРЗ, традыцыйныя бранхіты, зацяжныя трахеіты, ангіны і запаленні лёгкіх, якія суправаджаюцца моцным кашлем.

Што ж такое кашаль і чаму ён узнікае? Кашаль — натуральная рэфлекторная рэакцыя арганізма на любое раздражненне і запаленне дыхальных шляхоў. Дзякуючы кашлю бронхі расшыраюцца і ачышчаюцца. Яго значэнне можа быць жыццёва важным, таму лячэнне павінна быць накіравана на тое, каб кашаль дапамагаў вызваліцца ад макроты, а не проста на яго заглушэнне. У залежнасці ад наяўнасці макроты кашаль бывае двух відаў: вільготны і сухі. Кашаль з выдзяленнем макроты можа быць пры бранхіце, запаленні лёгкіх. Сухі кашаль узнікае пры захворваннях верхніх дыхальных шляхоў і лёгкіх.

ДАПАМОГА ПРЫ СУХІМ КАШЛІ

Пры некаторых прастудных захворваннях тэмпература павышаецца вельмі хутка, стан пагаршае і сухі, «гаўкліві» кашаль. У гэтым выпадку будзе карысны фітазбор, у склад якога ўваходзіць **алтэя**. Яна валодае заспакаяльным, адхаркавальным, спазмалітычным дзеяннем.

Калі кашаль надрыўны, прыступападобны і, як правіла, сухі, то размова, хутчэй за ўсё, ідзе аб ларынгіце. Вельмі характэрны і важны сімптом ларынгіту — ахрыпласць, асіпласць голасу ці яго поўная адсутнасць. Кашаль, характэрны для трахеіту, падобны да кашлю пры ларынгіце. Аднак пры гэтым не бывае змянення голасу, у час кашлю ўзнікае боль за грудзінай, якая распаўсюджваецца ў міжлапатачную вобласць.

◆ *Вазьміце пароўну: лісце падбелу, плады анісу, карані алтэі і лакрычніку. Усё перамяшайце. 2 ст. лыжкі сумесі заліце 0,5 л кіпеню, настойвайце 15 хвілін на вадзяной лазні, працадзіце, прымайце па паўшклянкі 3 разы на дзень.*

У хатніх умовах гэты напой можна прыгатаваць і так: заліце тую ж сумесь халодай вадой, давядзіце да кіпення, але не кіпяціце, настойвайце да ахаладжэння і, крыху падагравaючы, піце па паўшклянкі 3 разы на дзень пры кашлі як адхаркавальны сродак. Прымайце тыдзень, затым зрабіце перапынак. Пры неабходнасці курс можна паўтарыць.

◆ *Карані алтэі, лакрычніку і дзівасілу змяшайце. 2 ст. лыжкі сумесі заліце 0,5 л кіпеню, настойвайце на вадзяной лазні 30 хвілін, астудзіце, працадзіце, піце на працягу дня дробнымі дозамі кожныя 2—3 гадзіны пры кашлі і цяжкасці ў грудзях. Прымайце тыдзень, затым 10 дзён перапынак.*

ШТО ПРЫМЯНЯЦЬ ПРЫ БРАНХІЦЕ

Пры ломкасці крывяносных сасудаў, пры атэрасклерозе, астматычным кашлі, якія звычайна суправаджаюць бранхіты, добра дапамагаюць зборы, у склад якіх уваходзяць **сасновыя пупышкі.** Адвар з пупышак валодае адхаркавальным, процімікробным, дэзінфіцыруючым дзеяннем.

З драўніны сасны атрымліваюць шкіпінар, які прымяняецца як сродак, што раздражняе скуру пры прастудных захворваннях у выглядзе націранняў.

◆ *Вазьміце 1 ч. пупышак сасны, 2 ч. кораня алтэі, 2 ч. кораня лакрычніку, 1 ч. лісця шалфею, 1 ч. пладоў анісу. Усё перамяшайце, 1 ст. лыжку сумесі заліце 2 шклянкамі кіпеню, настойце на вадзяной лазні 15 хвілін, астудзіце, працадзіце, прымайце па 2 ст. лыжкі кожныя 2—3 гадзіны пры кашлі (але не больш чым 10 дзён запар).*

-2484-

ПОСНЫ СТОЛ

Салата з буракоў і хрэну

500 г буракоў, 1/2 шк. воцату, 2 корані хрэну, 1 лаўровы ліст, 5—6 гарошын перцу.

Адвараныя буракі парэжце тонкімі лустачкамі. Закіпяціце ваду з воцатам, дадайце прыправы, соль, цукар на смак. Надзярыце на буйной тарцы хрэн.

Буракі пакладзіце слаямі ў керамічную ці шкляную пасудзіну, перасыпаючы кожны слой хрэнам. Заліце марынадам, пастаўце ў халоднае месца. Салата будзе гатовая праз 1—2 дні.

Галубцы

1 качан капусты, 300 г рысу, 300 г морквы, 4 цыбуліны, 3 ст. лыжкі алею, 500 г памідораў ці 2—3 ст. лыжкі таматнай пасты.

Капусту разбярыце на лісце, апарце кіпенем. Рыс адварыце, нашаткуйце моркву, цыбулю дробна нарэжце. Усё змяшайце, пасаліце, паперчыце. Закруціце капуснае лісце з фаршам канверцікам, абсмажце на алеі. Складзіце ў каструлю, дадайце 1/2 шк. вады. Наверх пакладзіце нарэзаныя памідоры, дадайце алей. На невялікім агні давядзіце да гатоўнасці.

ХАТНЯЯ МАЙСТЭРНЯ

Пераносная скрыня для расады

Хутка пачнуцца палявыя работы ў агароднікаў, а пакуль яшчэ ёсць час, прапануем пашыць пераносную скрыню для расады.

Вам спатрэбяцца: драўляная ці фанерная скрыня; радно; дэкаратыўныя цвікі; стужка-«ліпучка»; гузік; малаток; нажніцы.

Выкрайце сумку-чахол для скрыні. Даўжыня, шырыня і вышыня сумкі пазначаны на схеме літарамі a, b, c, 10 см дадатку — гэта 8 см на адвароты плюс 2 см на свабоднае нацягванне чахла. Сшыйце чахол. Паўкруглы «вугал» пераўтварыце ў кішэню для інструментаў. Прышыйце гузік і зрабіце для яго прарэшак — тады інструменты не будуць выпадаць з кішэні (**мал. 1**).

Разрэжце тканіну на палоскі і сшыйце два дзяржанні. Прышыйце іх дя сумкі (**мал. 2**).

Выкрайце прамавугольнік з тканіны, складзіце яго і сшыйце, каб атрымаўся «чахол» на дзяржанні. Прышыйце стужку-«ліпучку» (**мал. 3**).

Устаўце ў гатовую сумку скрыню. Замацуйце тканіну па перыметры дэкаратыўнымі цвікамі (**мал. 4**).



-2485-

Зніклі без весці

ГОРАНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ МИНСКОГО РАЙОНА (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводят открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Кадастровый номер	Начальная цена
1	Минский район, д. Новоселье	0,1508 га	623681315601000280	20 000 000 руб
2	Минский район, д. Новоселье	0,1502 га	623681315601000281	20 000 000 руб.
3	Минский район, д. Новоселье	0,1495 га	623681315601000282	20 000 000 руб.
4	Минский район, д. Новоселье	0,1500 га	623681315601000283	20 000 000 руб.

Залог в размере 5 % от начальной цены земельного участка и специальный сбор за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляются на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г.Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учёта недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Инженерные сети электро-, газо-, водоснабжения расположены в пределах 900 метров от земельных участков. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 15.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Чкалова, 5, ком.321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.04.2008г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 1407. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12